# Павел Місько

# Эрпіды на планеце Зямля

*(Аповесць)*

## 1

Ці было калі-небудзь з вамі такое? Захочацца чагосьці моцна-моцна, аж не выцерпець, а яно і збываецца. Як у казцы! Ды не проста збываецца, а наробіцца ўсяго ў сто разоў больш за самыя смелыя пажаданні.

Такое здарылася з Ванем Гардзеем. Гардзей — яго прозвішча, хоць і гучыць як імя ці мянушка якога ганарліўца. А Ванеў дзед завецца Гардзей Гардзей — дзе імя, дзе прозвішча? Паспрабуй разбярыся. Вяскоўцы таму і завуць дзеда Двайны Гардзей.

Дык вось... Устаў сёння Двайны Гардзей на досвітку, выйшаў на двор паглядзець на ўсход. Ці ружавеецца там? Ці добрая будзе пагода? Прыкідваў, як лепш адзецца ў лес — збіраўся ісці ў грыбы. А пагода абяцалася добрая, ніводзін лісток не шалахцеў. І ціха яшчэ было, толькі дзесьці гула машына ды кукарэкаў бесталковы Галабродзькаў певень. Крычаў не ў пару, бо ўсе пеўні даўно ўжо адспявалі па трэцім разе.

Дык вось, любуецца дзед Гардзей усходам і раптам бачыць, як з ружовасці выяснілася імклівая палоска, чыркнула-бліснула па цёмным паўночным баку неба, выбухнула агнём над Партызанскім лесам і патухла. І гук пачуўся, нібы хто страсянуў у паветры цупкаю палатнінаю, а потым яшчэ і гром бабахнуў, толькі рэха пайшло — «Ах, ах, ах!»

Зайшоў дзед у хату і аб'явіў:

— Метэарыт на лес упаў.

— Ну-у?! — усхапіўся з пасцелі Лёня, большы Ванеў брат. А ўжо ад яго крыку і Ваня прачнуўся:

— Калі-і?! Не можа быць!

— Можа. Толькі што... — спакойна сказаў дзед. — Ідзі, Аляксей Гардзеевіч, я падмяню, — звярнуўся ён да сына, забраў з яго рук апалонік і пачаў сам наліваць на скавараду блінец. Гэта ў сям'і Гардзеяў як рытуал: цеста на блінцы размешвала маці, некалькі штук выпякала для сябе і бегла на ферму. Яна даяркаю працуе ў калгасе, клопату ў яе шмат. Блінную эстафету прымае бацька, пячэ заадно і сала на скавардзе, бо са смятанаю не любіць. Хуценька снедае і кіруе на калгасны двор. Там стаіць яго трактар, чакае работа. Да каструлі з цестам прыступае дзед, ён пячэ для сябе і для Лёні — старшакласнікі ходзяць у школу на першую змену. Калі Ваня затрымаецца ў пасцелі — яму ісці ў другую змену, — то потым пячэ блінцы сам сабе. Усе любяць, каб былі яны свежанькія і гарачыя.

— Дзеду, дай чэснае слова! Ты не выдумаў пра метэарыт? — затузаў Ваня дзеда за руку.

— Ну вось яшчэ... Не верыш — правер. Можа, нават балід, а не метэарыт, бухнула ў тым баку моцна. — Дзед быў не які-небудзь старасвецкі, а сучасны начытаны дзед.

— Мы ўсім класам прачэшам лес, толькі дай больш дакладныя каардынаты, — тузаў яго Лёня з другога боку. Любіў ён замежныя словы.

— Калі агонь бліснуў, то мог і лес загарэцца. Заскочу ў праўленне, лесніку пазваню, хай праверыць, — сказаў бацька і ступіў за парог.

— Нябесныя з'явы — штукі падманлівыя, — сказаў дзед. — Думаеш, далёка ўсё было, а яно блізка; думаеш, блізка, а яно — у космасе. Адно магу сказаць: якраз на поўначы была тая ўспышка.

Ваня памыўся пахапкам, сеў за стол разам з Лёнем. Не падабалася яму, што ўсе гэтак зацікавіліся тым метэарытам. Еў як не сваім ротам, бо галава ўжо была забіта думкамі. «Няўжо, і праўда, метэарыт?! Няўжо і ў нас такое дзіва здарылася? От бы мне знайсці яго, прывалачы ў школу!» Забыў Ваня начыста, што ўчора недарабіў урокаў: трэба яшчэ дарашаць слупок прыкладаў па матэматыцы, давучыць верш. «Метэарытам назвы даюць... Як наш назавуць? «Клінцаўскае дзіва?» Вёску ж нашу Клінцы завуць... А калі я знайду яго? «Метэарыт Івана Гардзея?» Хаця б Лёня адразу не завярнуў у лес... Не, яму часу не будзе, на ўрокі спозніцца. А от дзед — можа. Нібыта ў грыбы пойдзе, а сам туды — шморг! Ён жа лепш ведае, дзе ўпаў, нам знарок не гаворыць...»

Ужо і Лёня схапіў сумку з кнігамі і сшыткамі, знік за дзвярыма, ужо і дзед мітусліва забегаў па хаце, выбіраючы, у што лепш абуцца-адзецца, каб і цёпла было, і ходка. Спяшаўся дзед, усё даваў апошнія ўказанні Ваню. А той не чуў, пра што гаварыў дзед, у яго ў галаве адно было — метэарыт.

— Добра, добра... — адказаў неўпапад на дзедавы распараджэнні.

Гэтае «Добра, добра...» ён яшчэ не раз паўтараў, ідучы назіркам за дзедам. Вельмі не набліжаўся, каб дзед не пазнаў, хто за ім шыбуе. Але і не адставаў, каб не згубіць з вачэй. Дзед не азіраўся, толькі Жучок некалькі разоў спыняўся і глядзеў у бок Вані. І, мабыць, не пазнаваў, бо не пёр да яго, віляючы хвастом. А мо сабака парашыў, што сёння з дзедам будзе цікавей?

Цяжару партфеля з кнігамі і сшыткамі Ваня спачатку не адчуваў. Не чуў ад хвалявання і зямлі пад нагамі. «Спяць яшчэ лайдакі... — думаў пра сябрукоў. — Хай спяць, хэ-хэ... Няхай пухнуць ад сну, хо-хо! — цешыўся ён. — І Пеця Галабродзька спіць, хі-хі, цмокае спрасонку губамі. Во будзе кусаць локці, калі ўбачыць, што я прывалаку ў школу!»

Дарога вяла з Клінцоў на паўночны захад, у Бярозаўку. Там школа, там цэнтр калгаса. Ісці крыху больш за кіламетр, і каб не бярозавы пералесак, што прымыкаў да Партызанскага лесу і перабягаў дарогу, то былі б відаць і школа, і нават дамы калгаснікаў. Каля пералеску ад гравійкі адбягае ўправа лясная дарога і вядзе ў Партызанскі лес. Дзед павярнуў на яе, постаць яго замільгала сярод бяроз і кустоў і знікла. Дзед — былы партызанскі разведчык. «Схаваўся недзе за кустом і цікуе за мной... — падумаў Ваня і прыпусціўся бягом. Але скора засопся, перайшоў на хаду. — Трэба адстаць, хай ідзе сабе, хай хаваецца. А то вечарам нагаворыць маме, што я не ў дванаццаць у школу выбраўся, а зранку... Не парабіўшы ўрокаў! Яшчэ партфель гэты... І нашто я ўзяў яго! Скажу заўтра Алегу Максімавічу, што балела галава... ці жывот. А сёння зусім у школу не пайду. Шкада, што Жучка дзед забраў. Ён бы і мне спатрэбіўся...»

Сонца свеціць ззаду, і ўвесь дол у пералеску спярэшчаны светлымі і цёмнымі палосамі і плямамі. На траве раса як боб, і Ваневы чаравікі адразу набрынялі і раскіслі ад вільгаці. У іх чвякала і пішчала, нагам зрабілася холадна. Але хутка Ваня прывык і перастаў звяртаць на гэта ўвагу. Вочы звыкла шнырылі туды-сюды, зазіралі пад елачкі і кусты арэшніку. Выпараў некалькі бабак і падасінавікаў, адзін баравік і спахапіўся: «Я ж не ў грыбы прыйшоў! А што з гэтымі рабіць?» Начапіў іх на вострыя сучкі — высахнуць, то ваверкі падбяруць.

І зноў захадзіў управа-ўлева — то пад дарогу, што загібала ў Партызанскі лес, то пад гравійку, што вяла ў Бярозаўку, то зноў назад. Дзеда нідзе не было відаць, мабыць, адразу падаўся ў глыб Партызанскага лесу.

Праз нейкі час Ваня адчуў: яму не хочацца адхіляцца ні ўправа, ні ўлева! Хочацца ісці проста на поўнач, нібы хто падказваў гэты напрамак ці даў у рукі невідочную нацягнутую нітку: трымайся за яе, ідзі хутчэй! І ён слухаўся гэтага невыразнага загаду, хоць ужо не цяміў, куды бяжыць, дзе спыніцца. Яму нават не хацелася аббягаць кусты, а хацелася дзерціся праз іх, як мядзведзь праз маліннік. Цяжару партфеля зноў не чуў. «Што са мною?! Хто мяне цягне?!» Ён гатовы ўжо быў без сілы ўпасці на мох, але ўбачыў каля елачкі шэры камень-валун правільнай формы. Ён нагадваў дыню, толькі вялікую. Прысеў на камень, кінуў партфель убок, выцер пот з ілба. «Дзе гэта я апынуўся? Добра, што сонца свеціць, а то можна было б і заблудзіцца».

Ваня пагладзіў валун і адчуў, што камень цёплы, нібы яго ўвесь дзень пякло сонца. І ён быў не жорсткі і шурпаты, а нібы аплаўлены. Ніякага моху на ім і звання не было.

Раптам здалося, што камень пад ім зварухнуўся. «Фу, набегаўся, ажно ў бакі водзіць...» — паляпаў па камені супакойліва. І зноў здзівіўся: камень азваўся нейкім гудам, быццам у ім былі пустоты. Зноў калыхнуўся камень пад ім — моцна, нібы хацеў падбрыкнуць, як жарабя. Ваня спуджана ўсхапіўся, памацаў сябе за штаны, агледзеў камень з усіх бакоў. Ужо добра было відаць, што ён дробненька паварушваецца, нібы выбірае месца, каб зручней легчы ці ўстаць. «Жывы?!» — захаладзела пад грудзьмі ад страху.

Пачуўся лёгкі трэск і рыпенне, быццам хто паволі адчыняў нязмазаныя дзверы — кр-ры-і-і... Уздоўж каменя з'явілася цёмная зубчатая трэшчына, зазмяілася, аббегла камень наўкруг і пачала шырыцца. Палавінкі каменя пакалыхваліся, нібы яечная шкарлупінка, з якое хацела выбрацца кураня...

«Змей Гарыныч!.. Яго яйка!» — Ваня адступаў задам, дранцвеючы ад жаху і не зводзячы з расколатага яйка вачэй. Гатовы быў даць лататы ў любы момант.

Палавінкі разваліліся ў бакі зусім, паміж імі паўстала нейкая серабрыстая істота на тоненькіх пласцінчатых ножках. Істота нагадвала чалавека. Тулава яго было крыху выцягнутае знізу ўгору і нібы сабранае з кліночкаў. Каб у гэты час тут быў Лёня-васьмікласнік, то назваў бы гэтую фігуру няправільнай шасцівугольнай прызмай. Зверху да гэтай прызмы-тулава быў прыстаўлены рогам кубік — нібы галава. І былі ў гэтай галаве дзве лямпачкі-вочы і трэцяя, большая, як нос. І вочы і нос не тырчалі, а былі прытоплены ўсярэдзіну.

Ніякіх агрэсіўных дзеянняў чалавечак і не думаў учыняць, і Ваня больш не адступаў. А чалавечак патроху ажываў: з галавы папаўзлі ўгору і крыху ў бакі рожкі-антэны, вельмі падобныя на вусы

майскага жука. Левае вока ў чалавечка заміргала жоўтым святлом, а правае — зялёным, потым і нос заірдзеўся — чырвона і зырка. Ад тулава выпрасталася танюсенькая, нібы зробленая з металічных лучынак, ручка — спачатку левая, потым правая. Ручкі падняліся ўгору, пачуўся нават крэкт, нібы чалавечак пацягнуўся спрасонку.

— Хаў ду ю ду! Гутэн таг! — раптам загаварыў чалавечак на розных замежных мовах.

Голас быў нямоцны і з нейкім металічным дрынчаннем. Словы чалавечак вымаўляў асобна адно ад другога, без усялякай інтанацыі. Адразу скажаш, што не чалавек гаворыць, а машына.

У разяўленым Ваневым роце высах ад хвалявання язык. Хацелася скаўтнуць сліну, але сліны не было, языком варухнуць не мог. Не разумеў яшчэ Ваня ніякіх замежных моў, у малодшых класах іх не вывучаюць. І ён нічога не сказаў, толькі паціснуў плячыма.

Чалавечкавы рукі дацягнуліся да галавы. Круць, круць — нібыта крыху пакруцілі яе. Лямпачкі на твары пераміргнуліся жоўтым, зялёным і чырвоным і патухлі.

У гэты момант Ваня пачуў трэск ззаду. Зірк туды — і скалануўся знячэўку. Міма прамільгнула чорнае калматае стварэнне і кінулася да жалезнага чалавечка. «Гаў! Гаў!» — паспрабавала схапіць таго за бок. Але зубы скрыгатнулі, каўзануліся, і тады Жучок (а гэта быў ён!) схапіў чалавечка за нагу: «Рр-р-р!» — і завішчаў, залямантаваў: «Ай-яй-яй!» Мо зубы паламаў?

— Пайшоў вон! — знайшоўся ў Вані голас.

— Пасёў вунь... Пасёў вунь... — паўтарыў чалавечак. І загаварыў выразна, нават без дрынчання: — Інфармацыю зразумеў... Прывітанне вам, жыхар Зямлі! — Па-нашаму загаварыў!

— Здароў, калі не хлусіш... — разгублена адказаў Ваня — акурат як любіў гаварыць дзед Гардзей. І спахапіўся, сказаў ужо больш ветліва: — Добры дзень вам! Дык вы... гэта... адту-у-уль? — паказаў пальцам угору. — Вы, значыць, не метэарыт?!

— Адтуль, з калязямной арбіты. Там наш карабель застаўся... А што гэта за звер сціскаў маю нагу зубамі? І што ён сказаў?

— Хэ, ды гэта Жучок наш, сабака. І сабакі не гавораць, а толькі брэшуць, — першы раз нясмела пасміхнуўся Ваня.

— У кожнага звера, птушкі — свая мова. Нават у раслін. Мой брацік Эрпід-два разумее іх, можа расшыфраваць. А я разумею іх толькі крыху, я наладжаны на другую праграму — вывучэнне людзей.

— Дык ты што — Эрпід-адзін? — зусім пасмялеў Ваня.

— Так. Гэтая назва скарочаная... Як гэта... Абрэвіятура! А поўнасцю — Электронны робат-паліглот ізаляванага дзеяння.

— Глот, глытаць — зразумела...

— Інфармацыю ўспрыняў няправільна. Паліглот — не на вашай мове. А значыць тое, што я ведаю ўсе мовы зямлян.

— Усе-ўсе?! Дудкі, такога не можа быць!

— Інфармацыю не зразумеў. Дудкі — музычныя інструменты. У спалучэнні са словамі «такога не можа быць» даюць няправільную інфармацыю. Адбой.

— Я хацеў сказаць, што ты хлусіш... Ну, сам даеш мне няправільную інфармацыю, — перайшоў на мову робата Ваня.

— Я не магу даць звыш таго, што ўтрымліваецца ў маёй электроннай памяці. А што ёсць — ісціна.

— А наш Лёня казаў, што ў Афрыцы і ў Індыі яшчэ і цяпер знаходзяць у джунглях такія плямёны, якія гавораць на зусім не зразумелых мовах.

— Пытанне: хто ёсць Лёня?

— Брат мой, у восьмым класе вучыцца. — Ваня супакойліва пагладзіў Жучка, бо той зноў хацеў наляцець на Эрпіда. Мо не ўпадабаў, як чалавечак вымаўляе імя Лёні?

— Інфармацыю зразумеў. Уяві свайго брата... Уявіў?

— Ага-а...

— Так... Так... Бачу і я яго. Але ж ён большы за цябе!

— Бо ён у восьмым класе, а я ў трэцім. А дарослыя людзі яшчэ большыя.

— Дык ты яшчэ дзіця? А я думаў, людзі такія, як ты.

— Ну-у... не зусім дзіця. Дзеці во такія... — Ваня пашоргаў рабром далоні ў сябе пад шыяй, а потым каля пупка. — А нараджаюцца вось такія... — развёў рукі на паўметра.

— А як тваё імя?

— Ваня.

— Расшыфруй скарачэнне.

— Ну... Іван, Іван Аляксеевіч Гардзей.

— У нас імя даюць не так. Адно кароткае і адно доўгае. Вось як маё — Эрпід, а расшыфроўваецца...
— Ты гаварыў ужо: Электронны робат-паліглот ізаляванага дзеяння.
— Усё гатова. Сеанс закончаны.
— Што гатова? Які сеанс?
— Я скончыў перадаваць твайму брату Лёню ўвесь слоўнікавы запас, які ёсць у маёй электроннай памяці. На ўсіх зямных мовах.
— За дзве хвіліны?! Бедны Лёня! Ён жа звар'яцець можа. У яго цяпер такая каша ў галаве!
— Не звар'яцее. У цэнтры памяці ў яго яшчэ засталіся незагружаныя семдзесят два мільярды чатырыста сорак чатыры мільёны шэсцьсот трыццаць тры тысячы дзвесце семдзесят дзве клеткі-нейроны. Рэзерв.
— Не веру! Нічому не веру! — горача ўсклікнуў Ваня, нават рукі ўскінуў угору. — Мы тут, а Лёня ў школе, як жа ты...
— Пытанне зразумеў. Я прасіў Ваню ўявіць у галаве брата Лёню. Ты ўявіў. Я зняў электраэнцэфалаграму твайго мозга і ўбачыў брата Лёню, вылічыў яго электрамагнітнае поле і праз гэтае поле ўздзейнічаў на мозг Лёні.
— Н-не разумею...
— На вашай мове навукі называюцца фізіка, хімія, вышэйшая матэматыка і яшчэ многа ўсякіх. Нічога такога ты яшчэ не вывучаў. Я цябе зараз падвучу, і ты ўсё зразумееш...
— Пачакай! Не рабі гэтага. А то ў мяне такі вэрхал будзе ў галаве! А мне яшчэ верш сёння вучыць трэба.
— Уяві сабе той верш. Зверху ўніз...
Ваня ўявіў старонку кнігі. Павёў у думках вачыма па радках.
— Ты ўжо ведаеш гэты прымітыўны тэкст на памяць.
— Ой... праўда! Магу хоць зараз расказаць.
— Не трэба. Я веру.
— Слухай, ну што ты за разведчык, калі ў цябе ні вачэй, ні вушэй няма, хадзіць нават добра не можаш? Адны лямпачкі бліскаюць...
— Пытанне зразумеў. Гэта бачыш? — Пласцінчатая ручка Эрпіда зварухнулася, кранула тое месца на тулаве, дзе быў пупок-акуляр, вельмі падобны на аб'ектыў фотаапарата. — Я цябе запісаў у дзесяці розных вымярэннях.
— Ужо?! А як гэта... Ты ж нічога не рабіў, толькі са мною размаўляў! — Ваня ўжо стаміўся здзіўляцца.
— Я магу размаўляць і рабіць некалькі спраў адначасова.
— А ў якіх... дзесяці вымярэннях?
— Прааналізаваў твой вонкавы выгляд — раз, адзенне — два, унутраную будову цела — тры, будову клетак, з якіх складаюцца органы, — чатыры, хімічны састаў цела — пяць, запісаў біятокі, электрамагнітныя палі, вызначыў даўжыню радыёхваль, якія выпраменьвае твой мозг, запісаў усё, што ўтрымлівае твая памяць, вызначыў узровень тваёй мысліцельна-аналізатарскай здольнасці... Я ўлавіў тваю думку. Хочаш папытаць: «А які я?»
— Аг-га... — разгубіўся зусім Ваня. Выходзіць, што пры гэтым Эрпідзе і падумаць нічога такога нельга — думкі чытае!
— Адказваю. Пытанне тваё недакладнае, таму адказ можа быць доўгі і шматзначны. Трэба вучыцца мысліць дакладна. Магу толькі сказаць, што на нашым караблі ўсе мае запісы здымуць, расшыфруюць.
— Дык што... дурань я ў параўнанні з табою?
— Не дурань, але выкарыстоўваеш свае разумовыя здольнасці толькі на адну тысячную долю. Калі ж хочаш ведаць хімічны састаў свайго цела, то загляні ў гэты акуляр...
Ваня асцярожна ступіў колькі крокаў да Эрпіда. Той усё яшчэ стаяў-вагаўся сярод палавінак шкарлупіны-панцыра. Ваня ўзяў адну палавінку і здзівіўся, што яна не вельмі цяжкая і ўся ў дробных дзірачках на зломе. Шпурнуў яе пад куст у адзін бок, узяў другую і кінуў за куст у другі бок. Апусціўся на калена каля жывата Эрпіда і прыпаў вокам да акуляра. Каб не кульнуць Эрпіда, прытрымліваў яго рукамі за бакі і чуў далонямі, што бакі цёплыя і штосьці бурчыць-журчыць у робата ў жываце, нібы ён наеўся морквы ці яблык.
Спачатку Ваня нічога не ўбачыў — цемра. Потым з'явілася зеленаватая падсвечаная палоска, папаўзла злева направа. На ёй пачалі выстройвацца ў даўжэзны рад нейкія агністыя значкі, лічбы, літары, формулы.
— Зразумеў? — спытаў Эрпід. Здалося, што голас яго, дасюль бясстрасны і хрыплаваты, прагучаў насмешліва і нават кпліва.

— Ну і ну... Ніколі не думаў, што ў маім жываце не мікробы, а ўсякія лічбы і формулы скачуць.

— Цяпер ты апрацоўвай і ўсвойвай атрыманую інфармацыю, а ў мяне пачынаецца сеанс сувязі з караблём. Уся энергія пойдзе на гэтую сувязь, таму я ад цябе адключаюся. Памаўчы і ты таксама, паэканом энергію.

Эрпід замігаў лямпачкамі. Здалося, што пачуліся сігналы «біп-біп-біп», вельмі падобныя на тыя, што некалі падаваў з неба першы савецкі спадарожнік Зямлі.

Ваня стомлена апусціўся на мох, прыгарнуў да сябе Жучка...

**3**

Пакуль у Эрпіда-адзін ідзе сеанс сувязі з караблём-спадарожнікам, зазірнём, што робіцца ў восьмым класе Бярозаўскай школы.

Яшчэ перад урокамі, як толькі Лёня аб'явіў пра метэарыт, пачаўся неверагодны шум. Хто верыў, а хто і не, але знайшліся яшчэ двое вучняў, якія пацвердзілі. Праўда, не самі яны бачылі, як падаў, а іх бацька ці маці. Многім адразу захацелася бегчы шукаць той метэарыт. Нехта крыкнуў, што самім шукаць нельга, ці мала што можа здарыцца, а трэба напісаць у Акадэмію навук у Маскву, няхай прышлюць сваіх людзей.

На першым уроку быў дыктант па роднай мове. Але ўсе былі такія ўзбуджаныя і няўважлівыя, так былі забіты метэарытам галовы, што нарабілі безліч памылак. Але самае дзіўнае адбылося на ўроку гісторыі. Настаўніца Святлана Андрэеўна выклікала Лёню да дошкі, на якой вісела карта, і папрасіла расказаць пра Барадзінскую бітву, пра барацьбу супраць французскіх захопнікаў у 1812 годзе. Лёня выйшаў і ўжо рот разявіў, каб пачаць гаварыць. І раптам абхапіў рукамі галаву, нібы яна ў яго моцна-моцна забалела, шырока расплюшчыў вочы. Твар яго то чырванеў і пакрываўся кроплямі поту, то бялеў і аж зелянеў. І хоць Лёневы вочы глядзелі на клас, ён нічога і нікога не бачыў, нічога не чуў.

— Што з табою, Гардзей? Ты захварэў? — некалькі разоў спытала Святлана Андрэеўна. Але нічога Лёня не адказаў, і настаўніца сказала: — Сядай, адпачні. Я цябе выклічу ў наступны раз.

І на гэтыя словы нічога не адказаў Лёня, з месца не сышоў.

Святлана Андрэеўна паказала крайнім ад акон вучням, каб шырэй паадчынялі фортачкі. Сама бачком, палахліва прайшла міма Лёні да дзвярэй, расчыніла іх у калідор. Хацела зрабіць скразняк, пусціць у клас больш кіслароду.

І вось Лёня паволі адняў рукі ад галавы, апусціў іх па швах. Адзін бок галавы ў яго быў сівы, амаль белы. За хвіліну пасівеў чалавек!

Потым Лёня прамармытаў абыякавым голасам: «Пытанне зразумеў». І пачаў адказваць урок на добрай французскай мове, і голас яго ўсё мацнеў і мацнеў, нібы чалавек набіраўся натхнення, нават замахаў рукамі. Святлана Андрэеўна спачатку разгубілася ад нечаканасці і незвычайнасці. Але добра, што некалі ў інстытуце вывучала французскую мову. Улавіла, што Лёня адказвае талкова, змястоўна, і паволі апусцілася на сваё месца каля стала. Утаропілася на яго здзіўленымі вачыма і ўжо больш не адвяла позірку да самага канца. Потым сказала: «Мерсі... Б'ен...», падзякавала, значыць, і папрасіла яго сесці на месца. Адзнакі ў журнал ніякай не паставіла, а прыціснула і журнал, і свае паперы да грудзей, пайшла, хістаючыся, да выхаду.

І толькі тады клас ахнуў, загаманіў. Усе кінуліся да Лёні. Хто пытаў, як гэта яму ўдалося вывучыць самому французскую мову, калі ў іх у класе праходзяць англійскую. Хто ад захаплення моцна ляпаў яму па плячы, нібы хацеў зламаць ключыцу. Дзяўчынкі збегалі да ўмывальніка, намачылі свае насоўкі і пачалі прыкладваць халодныя кампрэсы на Лёневы лоб, шчокі, цемя. Аднак ён ужо крыху ачомаўся ад усяго, што на яго звалілася, і стаў бараніцца: «Адчапіцеся!» Лёня быў яшчэ разгублены і вялы. І раптам на пытанні хлопцаў пачаў адказваць... па-японску! Ніхто, вядома, яго не разумеў, думалі, што ён проста крыўляецца, перакручвае абы-як словы. Толькі адна дзяўчынка, самая ўражлівая, жаласліваківала галавою, гучна снякалася ў насоўку — плакала.

Рыпнулі, шырока расчыніліся дзверы. У клас зайшоў дырэктар школы, потым выкладчыца англійскай мовы Марыя Данілаўна. За імі праціснуліся разам Святлана Андрэеўна і прыбіральшчыца цётка Магда. Марыя Данілаўна і Лёня адразу пачалі гаварыць на англійскай мове так хутка, што ў класе іх ніхто не разумеў. А потым і ў Марыі Данілаўны папаўзлі бровы на лоб, бо Лёня перайшоў на афрыканскую мову суахілі, потым на мову паўднёвых кхмераў з Кампучыі — дзесьці ў Паўднёва-Ўсходняй Азіі тая далёкая Кампучыя.

Пакуль Лёня так гаварыў, не слухаючы, што пытаюць у яго дырэктар і настаўніцы, цётка Магда супакойліва гладзіла Лёнева плячо і гаротліва ківала галавою: «Беднае дзіця... Во да чаго навука даводзіць... Гэта ж трэба так нагружаць дзяцей!»

Дырэктар асцярожна ўзяў Лёню пад адну руку, цётка Магда пад другую, і павялі з класа. Святлана Андрэеўна і Марыя Данілаўна пайшлі за імі следам, наставіўшы перад сабою рукі. Мо баяліся, каб Лёню не зрабілася зусім кепска і ён не кульнуўся назад.

**4**

Жучок нецярпліва павіскваў, перабіраў пярэднімі лапамі, Ваня пагладжваў яго, туліў да сябе: «Ціха... Супакойся!» Паглядваў на Эрпіда: ці скора ён перастане вадзіць у бакі антэнамі і загаворыць?

І раптам той загаварыў, але ціха, нібы сам сабе:

— На вашай мове гэта называецца бяда...

— Пра што ты?

— Эрпід-два не выйшаў на сувязь у вызначаны час. На мае сігналы таксама не адказвае.

— То, можа, дзе дуба даў.

— Інфармацыю не зразумеў. Дуб — дрэва. Як можа Эрпід-два даць дуба, калі ў яго няма нічога падобнага? І каму ён мог даць гэты дуб?

— Я хацеў сказаць, мо разбіўся пры пасадцы ці сапсавалася што.

— Не разбіўся. З карабля сачылі за ім, і першы сігнал ад яго дайшоў добра — прызямліўся ўдала. А потым нейкае незразумелае мармытанне, а не радыёсігналы, і ўсклік: «Наглядаю многа-многа дамоў, а не дрэў. Многа людзей». А гэта ж я павінен быў прызямліцца ў горадзе, а ён у лесе. Усё выйшла наадварот, заданне можам не выканаць — не на тое запраграміраваны.

— Праўда што... Каша заварылася.

— Інфармацыю не зразумеў. У каго заварылася каша, дзе, з якіх круп?

— Гэта я хацеў сказаць: чорт ведае чаго нарабілася.

— Інфармацыя ўведзена няправільна. Чорт нічога не можа ведаць. Па тлумачальнаму слоўніку, гэта міфічная, казачная істота. Выдуманая.

— Вой, з табою гаварыць немагчыма. У мяне скора шарыкі за ролікі заскочаць ад такое гаворкі.

— Інфармацыя ўведзена няправільна. Шарыкі і ролікі, на вашай мове, — дэталі машын і механізмаў. У чалавека такога няма, ёсць клеткі. Яны бываюць рознай формы, рознага прызначэння. У кожнай свая будова мембран, сваё электрычнае поле.

— Гэтага мы яшчэ не праходзілі. Але даю табе слова: са мною не прападзеш. Я памагу табе выканаць заданне.

— Я цябе перадаў ужо ва ўсіх дзесяці вымярэннях. Але аднаго цябе мала. Патрабуюць яшчэ як мінімум двух дарослых — мужчыну і жанчыну.

— Хадзем да мяне дадому. Я пазнаёмлю цябе з мамаю і татам. А можа, і дзеда перадасі? Гардзей Гардзей, Двайны Гардзей... Ён любога за пояс заткне.

— Дзед — волат, велікан? Нашто яму затыкаць каго за пояс? Гэта гульня такая?

— Не велікан ён, а звычайны чалавек. Але ва ўсім свеце такога больш няма. У яго і ордэны, і медалі ёсць, ён партызанам быў, разведчыкам.

— Кандыдатура падыходзіць, можна і дзеда.

— Дык чаго мы ловім варон? Я цябе зараз... на плячо... вось так... — Ваня схапіў Эрпіда за бакі, хацеў прыпаднясці і закінуць сабе на плячо. Але Эрпід быў такі цяжкі, што нават з месца не зварухнуўся. — Ог-го! Мо сто кіло...

— Дзевяноста дзевяць кіло і дзевяцьсот дзевяноста грамаў. Але я хачу сказаць, што мы варон не ловім і не будзем лавіць. Жывёльны і раслінны свет, глебу будзе даследаваць Эрпід-два. Мне даручана падтрымліваць з ім сувязь.

Эрпід замоўк, заміргаў жоўтаю і зялёнаю лямпачкамі, заварушыў вусамі. Ваня пачакаў крыху, потым паківаў галавою: «З гэтым Эрпідам жывот можна падарваць ад смеху». Пайшоў за елачку, куды кінуў адну палавінку панцыра. Пачаў разглядаць яе больш уважліва. Не гладкая яна была знутры, а нібы ад грэцкага арэха. Былі там і бугрынкі, і выемачкі, і перагародкі.

Наскуб зялёнага моху, прыкрыў, прыхаваў яе (пра другую палавінку зусім забыў). Потым гэтае ж самае зрабіў з партфелем. Задраў угору галаву, каб запомніць якія-небудзь своеасаблівыя прыкметы. І нічога такога не знайшоў. Тады нарваў доўгіх пляцёнак дзеразы, апавіў ёю бліжэйшую бярозу. Прыйдзе сюды пазней, адшукае панцыр, занясе ў школьны музей. Нават уявіў, як паложыць яго ў самым цэнтры пакоя на падстаўку, а на падстаўцы будзе таблічка з надпісам: «Касмічны аб'ект. Знойдзены Іванам Гардзеем каля вёскі Клінцы».

Вярнуўся да Эрпіда.

— Ну што, знайшоўся брацік?

— Знайшоўся. Я ўлавіў яго аварыйны сігнал, запеленгаваў каардынаты. Мой вывад: да карабля на арбіце яго сігнал не даходзіць таму, што ён не можа скіраваць антэну ў патрэбны бок.

— Што ж там у яго за ліха-бяда? Трэба ісці на выручку. А ты не можаш сказаць, колькі да яго кіламетраў?

— Трыццаць дзевяць кіламетраў і чатырыста пятнаццаць метраў. Курс — паўночны ўсход.

— Паўночны ўсход... Паўночны ўсход... — закруціўся Ваня, прыкідваючы. — Дык у тым жа баку Менск! А да яго пяцьдзесят чатыры кіламетры. Мы ўчора ездзілі туды ў перасоўны звярынец, дык шафёр казаў, што спідометр накруціў пяцьдзесят чатыры.

— Я назваў адлегласць правільна да сантыметра. Па курсу.

— Разумнік! А хто ж па курсу ходзіць ці ездзіць? Тут ведаеш якія лясы? Пар-ты-зан-скі-я!

— Інфармацыю не зразумеў.

— Я цябе з дзедам пазнаёмлю. Ён табе такога нарасказвае, чаго нідзе больш не пачуеш. Ты быў яшчэ дзе-небудзь, на другой планеце?

— Брацік Ваня... Я сканструяваны і зроблены спецыяльна для вывучэння Зямлі.

— А хоць бы і быў! Ні на якой іншай планеце такога не пачуеш. А як ваша планета называецца? На ёй таксама людзі ці хто?

— Я запраграміраваны для ўспрыняцця інфармацыі. Звестак пра нашу планету ў мяне запісана мала. Загадана траціць энергію толькі для вывучэння Зямлі і ўвесь час падлічваць, колькі яшчэ засталося энергіі. Трэба, каб хапіла на зваротны шлях.

— А мо ты не касмічны разведчык, а які заакіянскі шпіён?

— Пытанне не зразумеў. Адзначаю нізкія разумовыя здольнасці Вані.

— Не крыўдуй... Дык ты ўсё-такі паляціш назад на карабель? — Ваню раптам да слёз стала шкада расставацца з Эрпідам. — Ты ж казаў, што перадаў мяне на карабель. Ну дык і хопіць, а сам заставайся. Мы цябе вучням і настаўнікам пакажам, вучоным.

— Не магу. Па-першае, усяго, што я назбіраю, не хопіць энергіі перадаць. Па-другое, загад ёсць загад. Іван Аляксеевіч Гардзей, ты казаў, што ўчора быў у горадзе Менску...

— Не толькі я. Увесь клас, у звярынец ездзілі.

— Зразумеў, раблю вывады: збіў з курсу мяне ты. Я павінен быў прызямліцца ў горадзе і сустрэцца з табою там. А ты апынуўся тут, і мяне павярнула сюды.

— А чаму... са мною? Хіба мала ў горадзе людзей? Ці ўвогуле — на ўсёй зямлі.

— Электронна-вылічальныя машыны на борце карабля прапаноўвалі мільёны варыянтаў запісаў электрамагнітных палёў людзей. Я выбраў запіс электрамагнітнага поля твайго мозга.

— Кгы-км... — пракашляўся Ваня. Нібы маслам па сэрцы правёў Эрпід. «І чым я спадабаўся яму?» — падумаў.

— Пасля прызямлення я навёў цябе на сябе, — бясстрасным голасам апавядаў Эрпід. — Ты ішоў на мае пазыўныя.

— Яшчэ што выдумай! Ніякіх сігналаў я не чуў.

— І не мог чуць. Ты адчуваў іх. А цяпер пайшлі шукаць Эрпіда-два.

Чалавечак захістаўся. Знізу ў яго адкінуліся створкі, і выпусціліся, нібы колы з самалёта, невялікія, на пядзі паўтары, гусеніцы, расставіліся ў бакі шырэй за тулава.

— Х-хэ... — пагардліва хмыкнуў Ваня. — Тут на іх многа не наездзіш. Гэта табе не горад, не асфальт. На нашым робаце-лунаходзе не гусеніцы, а колы былі.

— Уперад! — упарта прахрыпеў Эрпід і зрушыў з месца ў паўночна-ўсходнім напрамку.

Жучок адразу натапырыў хіб, загырчаў і хацеў зноў наскочыць на яго. «Супакойся!» — даў Ваня яму пстрычку ў нос. Сабака пакрыўджана крутнуў галавою, фыркнуў і вырваўся з рук, знік у кустах.

Эрпід праехаў усяго метр ці паўтара і заблытаўся ў кусце.

— Ну, што я казаў? Давай задні ход і кіруй за мною... Даследчык, называецца! Без маёй дапамогі ты тут і двух крокаў не зробіш.

— Зраблю... — хрыпеў Эрпід, едучы за Ванем. — Мы адхіляемся ад курсу! Мы рухаемся ў процілеглы бок! — ныў ён.

— Дзед казаў: «Нацянькі пагубляеш дзянькі». — Ваня адграбаў з дарогі Эрпіда шышкі і каменьчыкі, адхіляў кусты, прытоптваў траву. — Хныкаеш, як маленькі... Я не магу цябе ўзяць на ручкі, ты не дзіця. Нам на гравійку трэба хутчэй — лавіць машыну. Эх, дасць мне заўтра пытлю Алег Максімавіч!

— Інфармацыю не зразумеў. На Зямлі што — і машын ловяць, як варон?

— Ды не, гэта так гаворыцца. Як вы там вывучалі зямныя мовы, што не можаце разумець такіх простых выразаў?

— Лавілі думкі людзей, расшыфроўвалі... Па слоўніку, які склала электронна-вылічальная машына, пыталь, пытляванка — гатунак мукі. З мукі выпякаюць хлеб і розныя іншыя вырабы. За што добры чалавек Алег Максімавіч дае вам муку?
— Якую муку?! Я хацеў сказаць — бярозавай кашы дасць... Ой, зноў ты не зразумееш. Ну, палаяць можа, бацькам паскардзіцца, а то і кол паставіць, калі не вывучу ўрока.
— Бярозавая каша... Кол паставіць... Першае — зразумеў, другое — растлумач.
— Ну, адзінку, двойку. Гэта ў нас адзнакі такія. Выклікае настаўнік адказваць урок і ставіць адзнакі. Хто якія заслужыў. А бывае, і несправядліва ставіць, незаслужана. І от, скажы ты, — па вачах пазнае, хто вывучыў, а хто не. Адразу і выводзіць на чыстую ваду.
— Інфармацыю не зразумеў. На чыстую ваду, на чыстую ваду...
— Гора мне з табою. Тры пуды солі трэба з'есці, каб пачаць разумець адзін аднаго.
— Інфармацыю не зразумеў. Соль якіх металаў маецца на ўвазе? Для чаго яе есці тры пуды, ці сорак восем кілаграмаў? Гэта што — лякарства? Яно прыбаўляе розуму?
— Ох, і занудa ты... — уздыхнуў Ваня. — Во, сцежку бачыш? Шуруй па ёй да дарогі, каб аж пыл курэў!
— Інфармацыю не зразумеў. Шуруюць вугаль у топцы, каб лепш гарэў. А пыл — найдрабнейшыя цвёрдыя часцінкі, якія ўзняліся з паверхні Зямлі або аселі на Зямлю ці прадметы. Курэць — слаба гарэць, тлець, вылучаючы многа дыму. Нашто нам падпальваць пыл? І ці будзе ён гарэць? Калі ён складаецца з неарганічных часцінак, то...
— Перастань, філосаф, у мяне цярпенне не жалезнае, — зазлаваў раптам Ваня. — Даганяй! — пабег па сцежцы ўперадзе Эрпіда. Хутка давялося прыпусціцца з усёй сілы, бо Эрпід развіў вялікую хуткасць.
Каля самага выхаду сцежкі на дарогу Эрпід спыніўся, міргнуў чырвоным носам-лямпачкаю.
— Ну, чаго ты? Давай сюды! — нецярпліва паманіў яго Ваня.
— Раблю вывад: ты незадаволены мною. Я хачу зрабіць табе прыемнае: адключыць таго нядобрага чалавека.
— Каго-о?!
— Таго, хто ставіць вам калы і выводзіць на чыстую ваду, дае пытлю і корміць бярозаваю кашаю — Алега Максімавіча. Уяві яго сабе...
— Уявіў, ну і што?
Эрпід не адказваў хвіліну.
— Усё. Гэты чалавек больш не будзе ставіць калы. — Эрпід асцярожна закруціўся, нібы выбіраў, як лепш з'ехаць на дарогу.
— Ты яго... ён памёр?! — Ваню зрабілася кепска.
— Я яго адключыў.
— ??!
Эрпід прачытаў страх на Ваневым твары.
— Не бойся. Алег Максімавіч ёсць, але яго няма.
— Як гэта? Што ты нарабіў, вар'ят?! — закрычаў Ваня абурана. — Які ж ён нядобры?!
Эрпід не паспеў нічога растлумачыць. Абодва згледзелі, як з лесу выскачыў на дарогу і памчаў да іх на ўсю моц Жучок. У зубах ён штосьці трымаў. І чым бліжэй падбягаў сабака, тым больш бялеў твар у Вані. Ён, здаецца, пазнаваў, што нёс Жучок.
У Клінцах хрыпла, нібы яго рэжуць, закрычаў Галабродзькаў певень...

## 5

Алег Максімавіч падыходзіў ужо да школы, як адчуў, што з яго галавою робіцца штосьці неверагоднае. Яна стала як не свая, у ёй загуло і зазвінела. Алег Максімавіч ураз забыў, чаго ён прыйшоў да школы і што гэта за будынак. Пакіраваў не на ганак, не ў дзверы, а міма.
Школа стаяла не пры самай вуліцы Бярозаўкі, а наводшыбе, за фізкультурнымі пляцоўкамі, паміж якімі да ганка вяла абсаджаная каштанамі і кустамі алея. Да школы ззаду, нібы ножкі літары «П», былі прыбудаваны дзве залы: злева — спартыўная, справа — актавая зала са сцэнай. За школаю справа цягнулася футбольнае поле, злева — сад і агарод. І Алег Максімавіч маршыраваў вакол будынка, прадзіраючыся скрозь кусты, топчучы пышныя астры на клумбах. За кожны рог і выступ школы ён паварочваў па ўсіх правілах ваеннай навукі, нават камандаваў сам сабе: «Нале...во-о! Раз, два!» Даходзіў да чарговага павароту, прыстаўляў нагу. «Раз-два! — і рэзка круціў убок. — З левай!» Правая рука рабіла рашучыя ўзмахі. Левая не махала, левая трымала цяжкі партфель з вучнёўскімі сшыткамі.
У расчыненыя вокны першага і другога паверхаў навысоўвалася многа галоў хлопчыкаў і дзяўчынак

— з малодшых класаў і старшакласнікаў. Усе сачылі за настаўнікам здзіўленымі позіркамі. А тыя, што падыходзілі на заняткі ў другую змену, ажно спыняліся ад такога дзіва або асцярожна ішлі следам: што ён вытварае?

Празвінеў званок, трэба пачынаць урок, а Алег Максімавіч усё маршыруе вакол школы. На трэцім вітку ён крочыў ужо без партфеля — пакінуў дзесьці ў кустах. Махаў заўзята абедзвюма рукамі, а потым перастаў махаць, ашчаперыў аберуч галаву, як Лёня Гардзей. Крокі настаўніка сталі блытаныя, ён ажно стагнаў. Рукі то расціскаў, то зноў хапаўся за галаву, потым пачаў вадзіць далонямі над патыліцай, над цемем, нібы хацеў прыхаваць іх ад пякучых промняў сонца. Калі праходзіў каля металічнай, з труб, мачты, на якой піянеры ўздымаюць сцяг перад урачыстаю лінейкаю, спыніўся. Паглядзеў на мачту, паглядзеў... Ухапіўся за яе аберуч... Потым адну руку задраў да патыліцы, а другою яшчэ мацней схапіўся за мачту. І, мабыць, яму палягчэла, бо ён крута развярнуўся, бягом ускочыў на ганак школы, нібы ад кагосьці ўцякаў, ірвануў адны дзверы, другія... А тут цётка Магда працірае швабраю з анучаю вестыбюль.

Спатыкнуўся на цётчына вядро, перакуліў, на падлозе расцяклася вялізная лужына бруднай вады. Стаў як укопаны, утаропіўся вачыма ў гэтае вядро, у лужыну.

— Прабачце, калі ласка, — папрасіла прабачэння цётка Магда.

— Вы мне даруйце... — прамармытаў Алег Максімавіч.

І раптам схапіў гэтае вядро, перавярнуў дагары дном. Яшчэ не ўсе брудныя кроплі сцяклі, а ён ужо надзеў вядро сабе на галаву.

— А-ах! — выпусціла швабру з рук цётка Магда. Потым падняла, адступіла на крокі два і ўжо са страхам шпурнула швабру і анучу, прыпусцілася да лесвіцы, што вяла на другі паверх. Мо ў настаўніцкую хацела, мо да дырэктара.

А тут ужо і сам дырэктар спускаецца, за ім некалькі настаўнікаў і вучняў-васьмікласнікаў. Вучні вядуць пад рукі Лёню Гардзея, а той увесь час вырываецца і крычыць: «Пусці-іце, ёлупы! Куды вы мяне?! Яшчэ ўрокі не кончыліся!» І яшчэ нешта крычаў на замежных мовах, але хлопцы трымалі моцна, вялі да выхаду. І дырэктар, і настаўнікі, і вучні спяшаліся, бо бачылі праз акно другога паверха, што каля школы спынілася «хуткая дапамога», што па алейцы крочаць да школы дактарка з сумкаю ў руках і два здаравенныя дзядзькі — усе ў белых халатах.

— Во!.. І ён... І яго бярыце!.. І Алег Максімавіч не ў сваім розуме! — паспешліва гаварыла цётка Магда. Яна спачатку ўсплёсквала рукамі, а потым прыціснула іх да грудзей, каб не трэсліся ад страху.

Алег Максімавіч стаяў ужо каля акна. Адною рукою падтрымліваў на галаве вядро, каб можна было з-пад яго бачыць, а другою моцна ўчапіўся за трубу паравога ацяплення — «зазямліўся», нібы зрабіў сам сабе громаадвод. Твар у яго ўжо не быў пакутліва скрыўлены, на ім была ўсмешка ад палёгкі і задавальнення.

Дырэктар працягнуў да яго трымцячыя рукі:

— Галубчык, Алег Максімавіч... Што з вамі?!

Нічога не адказаў настаўнік. Усмешка знікла з твару, вочы зноў сталі невідушчыя. Ён нібы прыслухоўваўся, што робіцца ў галаве.

(Гэта быў якраз той момант, калі Ваня лаяў Эрпіда: «Што ты нарабіў, вар'ят?! Які ж ён нядобры?!», і Эрпід вырашыў уздзейнічаць на Алега Максімавіча інакш.)

У вестыбюль зайшлі людзі ў белым — дактарка і два санітары.

— Што ў вас здарылася? Хто захварэў? — адразу спытала дактарка.

Адказаць хацелася ўсім, таму адразу ўзняўся гармідар.

— Ды вось гэты хлопец, да яго выклікалі, — паказаў дырэктар на Лёню. — Але пакуль вы ехалі, яшчэ і настаўнік захварэў. Проста эпідэмія нейкая!

— Эпідэ-эмія?! — у дактаркі сеў голас, і яна прасіпела: — Хворых зараз жа ў машыну! Ізаляваць! Дзе ў вас тут тэлефон? Трэба выклікаць санэпідстанцыю для дэзінфекцыі.

— Там! Там! На другім паверсе! — паказаў дырэктар угору, на лесвіцу. — Але ж у нас не чума і не халера. З галовамі толькі пачало штосьці рабіцца.

— Тым горш! — паспешліва тупацела па прыступках дактарка.

Санітары тым часам адбіралі ў Алега Максімавіча вядро, аддзіралі настаўніка ад батарэі.

— Пойдзем з намі, таварышок! Усё будзе добра, вас падлечаць! І дадому хутка пусцяць! — прыгаворвалі яны і цягнулі Алега Максімавіча да выхаду.

— Я не хворы! Я не вар'ят! — упінаўся настаўнік. — Цётка Магда, я вінаваты перад вамі... Вы даруйце мне!

— Нічога, нічога, міленькі... Я ўсё прыбяру! — супакойліва настаўляла рукі прыбіральшчыца. — Наша работа такая — прыбіраць.

— Я вінаваты перад вамі! — казаў сваё Алег Максімавіч. — Я ўнучку вашу дарэмна пакрыўдзіў. Можна было і чацвёрку паставіць, а я паставіў тройку з плюсам! Я вінаваты, даруйце, больш так не буду рабіць! — Буйныя слёзы каціліся па твары настаўніка. — І ты, Лёня... Чуеш? Перадасі Ваню... Здольны ён хлопчык, надзвычай здольны. Але ўседлівасці малавата! Круціўся ён на ўроку, а я заўвагу яму ў дзённік запісаў. А можна было паўшчуваць, і ўсё! Даруйце, людзі!

Алег Максімавіч закрыў твар насоўкаю і зарыдаў, як дзіця.

**6**

— На, цю, на! — выставіў Ваня да Жучка руку. Але нічога не даў, а забраў у яго з зубоў шапку.

Так, гэта была звычайная старая кепка, шапка Двайнога Гардзея. Яе Ваня пазнаў бы з тысячы іншых. У яе ёсць ззаду прапалінка, нібы хто гарошынаю прастрэліў. Дзед заўсёды надзявае яе ў лес.

Ваня пакруціў шапку і сяк і так. Трывога ўсё больш забірала яго: як магло здарыцца, што дзед згубіў шапку? Ён жа не малы хлопчык, які можа загуляцца і забыць пра ўсё. Не можа быць і такога, каб выкінуў яе і хадзіў з непакрытаю галавою па лесе. Каб хацеў такое зрабіць, то даўно выкінуў бы. Ёсць жа дома і кепка новая і капялюш. Капялюш, праўда, надзявае ён рэдка, як і пінжак, цяжкі ад ордэнаў і медалёў. Найбольш тады, калі адбываецца сустрэча ветэранаў-партызан ці аднапалчан.

Што здарылася з дзедам? Мо яму зрабілася кепска, падвяло сэрца і ён знарок паслаў Жучка з шапкаю? Больш за семдзесят гадоў Двайному Гардзею — не жартачкі. Але ж дзед ніколі не скардзіўся на сэрца.

Эрпід моўчкі сачыў за Ванем, потым нібы чмыхнуў ці пракашляўся. Ваня нават не паверыў сваім вушам, паглядзеў на робата. Той бліскаў зялёнаю лямпачкаю, нібы падміргваў.

— Іван Аляксеевіч Гардзей, мы не рухаемся ўжо чатыры хвіліны і семнаццаць секунд.

— Дзед прапаў! З дзедам нешта здарылася!

— Ён не прапаў. Дзед шпарка рухаецца, у яго свой курс. Можна сказаць па-вашаму — бяжыць. І плача.

— Куды бяжыць?!

— Да свае запаветнае мары. Я прасвятліў яго памяць.

— Зноў ты ўмяшаўся, натварыў чорт ведае чаго. Без майго дазволу!

— Чорт не можа ведаць. Ведаю я.

— Запішы сабе на лбе! Зарубі на носе! Наматай на вус: без майго дазволу нічога на Зямлі не рабі! Ты не разумееш нашага жыцця, а ўмешваешся!

— Запішы на лбе... Інфармацыю не зразумеў. Па маіх звестках, людзі на лбе не пішуць, і я не буду. Бо не ведаю, для чаго гэта. Не буду рабіць зарубку на носе — няма ў мяне носа. У многіх афрыканскіх плямёнах робяць зарубкі на носе, на шчоках. Насы пратыкаюць, прасоўваюць упрыгожванні... Ты не сказаў таксама, што матаць на вус. Ніткі? Няма ў мяне нітак, і ў цябе няма, акрамя тых, што ў тканіне. Мае вусы — антэны. Калі ты хочаш узмацніць адчувальнасць маіх антэн, то трэба не ніткі матаць, а дрот. Як бачыш, інфармацыя твая няправільная, а таму бескарысная, нават шкодная.

— Разгаварыўся вельмі! Энергію эканоміць трэба!

— Я яшчэ не ўсё сказаў. На нашай планеце нічыйго дазволу не пытаюць, каб рабіць добрае адзін аднаму. Проста ўлоўліваем тое, што больш непакоіць чалавека, і памагаем.

— Аг-га, значыць, і ў вас людзі?!

— Людзі не людзі, а істоты вельмі разумныя.

— А чаго дзед плача?

— Хочацца, вось і плача. Ён ужо не бяжыць, а стаіць. І плача. І яму робіцца лягчэй ад плачу.

— Плача — значыць, бяда нейкая. Трэба бегчы на дапамогу! — Ваня закруціўся на месцы, як нядаўна Эрпід. Не ведаў, што рабіць: кінуцца спачатку да дзеда, выручаць з невядомай бяды? Ці хутчэй дабірацца да гравійкі, лавіць машыну? Эрпіда-два таксама трэба выручаць, гэта ўжо справа не мясцовага, а міжпланетнага значэння. Калі бегчы спачатку ўсё-такі да дзеда, то куды падзець Эрпіда-адзін? Па лесе прабірацца з ім адна пакута, а без робата дзеда не знойдзеш. Во задачкі, рашы паспрабуй!

У лесе раптам пачуліся галасы дзяцей, Ваня пазнаў нават дзяркаты і хрыплы, як у іхняга пеўня, голас Пеці Галабродзькі. Радуюцца, дурні: Алег Максімавіч захварэў, заняткі сарваліся.

— Атас! — закрычаў моцным шэптам Ваня.

— Інфармацыю не зразумеў. Слова з якое мовы, на якую мову мне пераналаджвацца?

— Хавацца, кажу, трэба! Пеця Галабродзька ідзе! Сюды лезь, у елкі! — Ваня першы ўшыўся паміж елачак і заціх.

— Хачу пазнаёміцца з Пецем Галабродзькам: можа, і яго перадам на карабель? — Эрпід пад'ехаў блізенька да Вані, а той кульнуў яго на бок, падкаціў пад лапкі.

— Ты што?! Ды ты ведаеш, які ён? На караблі падумаюць, што ўсе людзі такія. У яго клёпкі ў галаве не хапае!

— Інфармацыю не зразумеў. Клёпкі бываюць у бочках, цабэрках. У галаве чалавека, як паказваюць вымярэнні, клёпак няма. Сцверджанне тваё абсурднае: не можа чалавеку не хапаць таго, чаго ў яго ўвогуле не бывае і не патрэбна яму.

— Ды ведаеш ты... Ды каб ты яму трапіўся, а не мне, то ён цябе ўміг на запчасткі распатрашыў бы!

— Паспрабую прааналізаваць. Пеця таксама робіць электронных робатаў-паліглотаў ізаляванага дзеяння? І ў яго не хапае нейкай дэталі?

— Ціха ты! — таўхануў Ваня робата ў бок. — Блізка яны! І нічога ён не робіць, толькі гатовае разбірае. У іх і бацька такі: дзе што ні знойдзе, усё дадому валачэ — «на запчасткі». «Масквіч» у іх, машына.

— Інфармацыю зразумеў. Маўчу.

— Маўчы і слухай: вучні таксама пра метэарыт гавораць. Уся школа ўжо ведае!

Галасы гучалі ўсё бліжэй. Хлапчукі хадзілі кругамі. Зусім блізка каля выратавальных елачак прайшоў Пеця Галабродзька. Чуваць было, як ён гаварыў свайму сябруку:

— За метэарыт, кажуць, многа грошай даюць. От каб мне знайсці яго!

— І што ты рабіў бы з грашыма? Каб далі мне, я для ўсяго класа марожанага накупляў бы! — чуўся другі голас, не Пецеў.

— Ты што — дурны? Увесь клас частаваць! Я дык купіў бы ўсяго тры порцыі: адну табе, дзве мне. Астатнія грошы на запчасткі пусціў бы.

Галасы хлапчукоў аддаліліся ў бок Партызанскага лесу.

— Ну, чуў, які ён? — спытаў Ваня.

Здалося, што Эрпід у адказ хіхікнуў.

— Ты чаго? Прызнавайся, штосьці з Пецем ужо вытварыў?

— Нічога асаблівага. Я проста памагу яму ажыццявіць запаветную мару.

— Паляжалі — і хопіць. А цяпер давай... оп-па! На гуські-ножкі... Не пайду да дзеда, давай бягом на гравійку! Да Менска ж больш за пяцьдзесят кіламетраў.

## 7

«Гэты ці не гэты?»

Дзед Гардзей спыніўся, цяжка, зняможліва дыхаючы. Цярнуў з ілба рукавом пот, выграб пальцамі з валасоў, падаставаў з-за каўняра шыпулькі-ігліцу. Паволі паварочваўся, аглядаў кожнае дрэва, асабліва сосны і бярозы: «Гэты востраў ці не?» Колькі астравоў, меншых і большых, сярод гэтага балота, дасюль ніхто не злічыў. Сярод іх і той ёсць, на якім яны, пяцёра партызан, хаваліся ў час блакады. Іх спачатку семнаццаць было, калі заселі яны прыкрываць адыход свайго атрада. А немцы напіралі, усё тужэй сцягваючы кальцо. Адзін за адным гінулі таварышы, урэшце іх засталося сямёра, у тым ліку двое цяжка параненых. Апала ноч, і яны, паклаўшы на самаробныя насілкі параненых, адступілі ў балота. Задача была выканана, яны пратрымаліся да змяркання. Неслі насілкі, пагружаючыся ў ваду то па пояс, то па грудзі. Каб параненыя не захлынуліся ў вадзе, часам даводзілася класці ручкі-жэрдкі насілак сабе на плечы...

Хоць немцы кідалі ўпопускі міны, вырашылі перабыць на востраве да світання. Сілы больш не было ніякай, пападалі пластом і доўга ляжалі-стагналі, аддыхваючыся...

Гэтую ноч тыя двое цяжкапараненых не пражылі. Вобмацкам выкапалі нажамі і кіямі магілу — адну на двух, неглыбокую: падступала вада...

Памятае Гардзей, як рабіў на бліжэйшай тонкай бярозцы зарубкі-меткі. Потым прыгнуў яшчэ і сасонку, перавіў яе ствол са ствалом бярозкі.

То не маглі ж яны самі раскруціцца! І павінны былі выжыць, як выжыў і ён у той калатнечы.

Не мог дзед Гардзей забыць той начны востраў, тыя два дрэўцы, абвітыя адно вакол другога. Дзесяткі гадоў прайшло з таго часу, дзесяткі разоў лазіў па астравах, а тых злучаных дрэўцаў знайсці не мог. Дзе яны падзеліся?

Многае, праўда, змянілася з таго часу, ладны лес вымахаў на месцы партызанскіх зямлянак, акопаў. І тых балотных нетраў няма ўжо. Па краях балота пралеглі канавы, яны і сцягнулі лішнюю твань. Цяпер на любы востраў можна дабрацца ў звычайных гумавых ботах. Сотні бяроз Гардзей перамацаў, перагледзеў, шукаў свае меткі. Але хіба знойдзеш, калі бярозы ўжо такія, што ледзь ахопіш рукамі? Кара знізу ўчарнела, парэпалася барознамі-разорамі, пакрылася зялёным мохам. Мо вось гэтая бяроза? А мо тая? Мо сасна ссохла, згніла, а тая, пазначаная бяроза, выпрасталася і адна сягнула ўвысь?

А трэба ж знайсці астанкі тых партызан, перанесці да помніка на брацкай магіле, што ў цэнтры

Бярозаўкі, каля сельсавета.

«Я адзін яшчэ жывы з тых пяці партызан... Я адзін ведаю пра тую безымянную магілу... Як жа знайсці яе? Як?»

Усе гады пячэ памяць пра загінуўшых, не дае спакою ні ўдзень ні ўночы. Пячэ віна перад імі.

«Дарагія мае! Даруйце! Але я не вінаваты, паверце... Адзінока вам там ляжаць, крыўдна, я разумею... Але я жывы яшчэ, і я вас знайду! Знайду!»

Горна дзеду Гардзею, слёзна. Шчыміць ад жалю сэрца...

І вось, калі ён вырашыў яшчэ раз абысці гэты востраў, перамацаць кожнае дрэва, штосьці раптам нібы цюкнула ў галаву. Быццам заслона якая раптам рассунулася, скончылася зацямненне. Не на гэтым востраве трэба шукаць, дзе ён топчацца зараз, а на самым крайнім, усходнім. Яны ж на першым востраве тады пападалі без сілы, не брылі далей у цемры. А прабіраліся ў паўночна-заходнім напрамку...

Дзед забыў пра кош з грыбамі (а баравічкі ж былі, баравічкі!). Пашыбаваў напрасткі да таго вострава, блытаючыся ў кустах буячніку і багуну. Гучна чвякала пад нагамі гразь...

Вось ён, той усходні востраў... Быў Гардзей на ім пасля вайны, і не раз. Шмат разоў аглядаў дрэвы і ніякіх сваіх прыкмет не выявіў. Чаго ж яго зноў сюды павяло-пацягло? А сэрца, як дурное, бабухае ў грудзях: «Тут-тут!.. Тут-тут!»

Захацелася спыніцца дзеду не каля бярозы ці сасны, а каля дзвюх купін. Нібы штосьці падказала: «Шукай тут!» І ён пачаў церабіць, расхіляць на купінах брусвічнік і чарнічнік. Знайшліся рэшткі гнілых пеньчукоў: адзін, мабыць, быў бярозавы, бо валяліся кавалкі бяросты. Другі быў сасновы, бо яшчэ тырчаў поўны смалы асяродачак-корчык. «Капай тут!» — зноў нібы хто падказаў яму. І ён пачаў рэзаць нажом дзёран, выграбаць рукамі зямлю — як тады, у далёкім сорак трэцім годзе...

Доўга капаў-гроб, здалося — цэлую вечнасць. І на метр яшчэ не выграб яму, а ўбачыў тое, што шукаў. «Тут!»

Сілы пакінулі Гардзея. Не ўстаючы з калень, ён зноў заплакаў — горна, але і з палёгкай.

А трэба ж падымацца. Трэба ісці клікаць на дапамогу людзей...

## 8

Міма іх, выючы і бліскаючы мігаўкаю, прамчалася машына «хуткай дапамогі». Ваня паспеў згледзець у акне Алега Максімавіча і Лёню. Настаўнік хмура пазіраў перад сабою, моршчыўся. А Лёня, убачыўшы Ваню, адчайна замахаў рукамі ў бок Клінцоў, якія машына будзе мінаць, і назад, у бок Бярозаўкі. Потым «хуткую дапамогу» завалакло воблака пылу.

— Што ты натварыў, прызнавайся?! — закрычаў Ваня на Эрпіда. Той ужо стаяў побач з ім на ўзбочыне гравійкі і злёгку паварушваў вусамі-антэнамі. — І Лёню, і настаўніка ў бальніцу павезлі!

— Ну і што? Хай з'ездзяць. Не трэба так хвалявацца, траціць столькі энергіі. Твае электрычныя палі рэзка ўзраслі.

«Пайшоў ты... Жалязяка чортава! Навязаўся на маю галаву...» — хацеў вылаяцца Ваня. Але Эрпід улавіў яго думкі і спакойна сказаў:

— Мысленне ў цябе зараз недакладнае. У галаве сумбур, пануюць эмоцыі. Трэба супакоіцца.

— Сумбур... Эмоцыі... — сказаў Ваня яшчэ даволі гучна, але пачаў адчуваць, што паступова супакойваецца. — Я жывы чалавек, а не куча жалеза, як ты.

— Інфармацыя пра мяне недакладная. У маім метале жалеза амаль няма. Я складаная электронная машына.

— Завёў шарманку... Калі ты машына, то і заставайся машынаю. І нечага соваць нос туды, куды цябе не просяць.

І зусім ужо вяла варухнулася ў Ваневай галаве: «А мо кінуць гэтага Эрпіда, збегаць дадому, сказаць пра Лёню? І пра дзеда...»

— Завёў шарманку... Соваць нос, куды не просяць... — мармытаў сам сабе Эрпід, нібы хацеў лепш запомніць.

Натужліва прараўла міма сямітонка з поўным кузавам бульбы. У кабіне акрамя шафёра сядзелі яшчэ двое людзей, і Ваня не падымаў руку. А хоць бы і была машына свабодная, то галасаваць не варта: яна везла бульбу на чыгуначную станцыю.

Потым прайшлі яшчэ два грузавікі з бульбаю, і Эрпід не ўтрываў:

— Чаму Ваня не ловіць машыну?

— Таму, што канчаецца на «у». Нам у Менск трэба, а не ў райцэнтр, на станцыю. Там бульбу ў вагоны перагружаюць і вязуць у вялікія гарады... Ведаеш, колькі тысяч тон трэба бульбы, капусты, агуркоў, памідораў, каб пракарміць мільённы горад? А яшчэ ж і на зіму трэба запасы зрабіць... І ўвогуле, ты хоць

ведаеш, што людзям трэба есці, каб жыць? Многа ўсякіх прадуктаў трэба з раслін, і мяса-малочных, і рыбы? Каб іх здабыць, трэба круглы год працаваць — во як! — чыркнуў Ваня пальцам па горле.

— У вас неразумная трата часу. Замест таго каб развіваць свае разумовыя здольнасці, вы змагаецеся за існаванне.

— А ў вас хіба не так?

— Не так. У нас энергію людзі... Лічы, што і ў нас людзі... Энергію нашы людзі засвойваюць непасрэдна ад сонца, ад яго праменняў.

— А ноччу як?

— У нас няма ночы. Адно сонца заходзіць, другое ўсходзіць.

— Два сонцы?! Сі-і-іла... У нас таксама, Лёня казаў, расліны засвойваюць энергію сонца і ўсякія прадукты, рэчывы робяць, запасаюць. Фатасінтэз называецца, ці што... Мы гэтага яшчэ не праходзілі... Ха-ха, дык у вас што — людзі зялёненькія, з лісцікамі? Ходзяць, галінкамі памахваюць?

— Калі маладыя, то крыху зеленаватыя. А каторыя дарослыя, спелыя, тыя не такія зялёныя.

— Ой, умора... Дык што, вашы зялёнчыкі ніколі не спяць, не адпачываюць?

— У вас два паўшар'і ў мозгу, і ў зялёнчыкаў два. Толькі намнога большыя, усё роўна як двайны мозг.

— Мазгі-спарышы, ці як?

— Хай сабе і спарышы. Таму і галовы ў зялёнчыкаў раздаліся ўшыркі, не такія круглыя, як вашы. Адзін мозг працуе, другі адпачывае, потым наадварот. Сонцы ў нас не аднолькавыя, і кожны мозг прыстасоўвае арганізм да свайго сонца. А ў час перазменкі працуюць адразу абодва мазгі. Тады і нараджаюцца ўсялякія вялікія навуковыя адкрыцці і робяцца вынаходствы.

Міма пыліла яшчэ адна машына, з капустаю. Ваня і галасаваў ёй, і на Эрпіда паказваў, але яна не спынілася.

Спынілася толькі наступная, з морквай. Акрамя шафёра ў кабіне нікога не было, і Ваня ўзрадаваўся: пашанцавала.

Малады вясёлы шафёр скокнуў на дол, абышоў машыну спераду.

— Куды вам трэба? — спытаў і прысеў на кукішкі, зрабіў з пальцаў «казу рагатую» і паказытаў Эрпіду жывот: — Букі, букі, букі!

Здарылася неверагоднае. Эрпід увагнуўся, нават ручкамі прыкрыў тое месца, дзе быў пупок, і зарагатаў, як дзіця.

Шафёр ад нечаканасці сеў у пыл. Ваня таксама разгубіўся, але хутка ўзяў сябе ў рукі.

— У Менск мы. Вельмі тэрмінова, не можам аўтобуса чакаць!

— Жывы экспанат?! Злёт юных тэхнікаў, ці што? Глядзі, ён мне лямпачкамі падміргвае! — Шафёр паволі ўстаў, абабіў пыл са штаноў.

— Дзядзечка, познімся мы! Выручайце! — як не маліў Ваня, але нічога больш не тлумачыў.

— Да райцэнтра — магу. У краму моркаўку вязу. Хочаш пахрумстаць? — Хлопец захапіў з кузава дзве вялікія морквіны, падаў Ваню.

— Шчаслівай дарогі! — раптам сказаў Эрпід.

Шафёр ужо ішоў садзіцца за руль і зноў павярнуўся да іх.

— Гэта ён сказаў?! — Хлопец зрабіў губамі «уф-ху-у...», пахітаў галавою. — І трэба ж такога выдумаць! Ай-я-яй, ну і галавастыя дзеці пайшлі. Чый жа ты будзеш?

Ваня сказаў.

— Ведаю, ведаю Аляксея Гардзеевіча... Прывітанне бацькам геніяльных дзяцей!

Машына раўнула, рыўком зрушыла з месца.

«Хэ, а што б ты сказаў, каб ведаў усё?» — падумаў Ваня.

— Мне ён спадабаўся, я запісаў яго, — сказаў Эрпід.

— Не спіш у шапку. Малайчына... Давай руку.

Эрпід працягнуў яму руку і сказаў:

— Інфармацыю не зразумеў. Чаму ў шапку? Зялёнчыкі не спяць, то чаму павінен спаць іх Эрпід?

Ваня не тлумачыў, а — скроб, скроб, скроб — пачысціў аб востры кант яго рукі моркаўку, з апетытам захрумстаў.

— Замару чарвячка. А то кішкі марш іграюць.

— Інфармацыю не зразумеў. Якога чарвяка і якім прэпаратам будзеш марыць? І кішкі не музычныя інструменты, яны не могуць іграць.

— Жэрці хочацца, зразумеў?

— Зразумеў у адпаведнасці з закладзенай у мяне праграмай. Хаця сам есці хацець не магу.

— А вашы зялёнчыкі бываюць дзецьмі?

— Бываюць. А потым растуць у адпаведнасці з праграмай. Кожнаму пры нараджэнні даецца прыбор-дазатар, які рэгулюе прыём сонечнай энергіі, а значыць, і рост. Растуць зялёнчыкі да вызначанага стандарту. Вырошчваецца і невялікая колькасць веліканаў для асабліва цяжкіх работ.

— Замест пад'ёмных кранаў?!

— Можаш і так лічыць. Вырошчваюць і ліліпуцікаў, і міні-зялёнчыкаў. Гледзячы для якое мэты, якое работы. Экіпаж касмічнага карабля, што на арбіце, складаецца з ліліпуцікаў.

— Ну і дадумаліся! А калі я, напрыклад, не захачу быць міні-зялёнчыкам, а нармальным? Ці веліканам? А будучы веліканам, узбунтуюся і...

— Такога ў нас не можа быць. Усе хаценні, усе думкі кантралююцца. Зялёнчыкі хочуць толькі тое, што патрэбна для ўсіх, для нашай цывілізацыі.

— Эх-ха, сумна ж у вас там. Мухі дохнуць ад суму.

— Няма ў нас мух. Ніякіх насякомых няма, ніякіх жывёл, птушак, рыб. А расліны ёсць, толькі не зялёныя, а фіялетавыя. Нізенькія такія... І вада ёсць.

— Я сваю зямлю ні на што не прамяняю. І ні за што на свеце! Няўжо вам не хочацца мець хоць бы птушак? Салаўя паслухаць, жаваранка, шпака, зязюлю? Ку-ку, ку-ку...

— Задача нашай экспедыцыі — вывучыць такую магчымасць. Можа, калі-небудзь мы пазычым у зямлян трохі чаго.

— Пазычайце, мне не шкада. Толькі ці ведаеце, што ў нас яшчэ і ўсякія мікробы, бактэрыі, вірусы ёсць? Яны такія малыя, што не ўбачыш без мікраскопа. Сярод іх такія гады ёсць, такія паразіты! З-за іх многа хвароб усякіх, людзі паміраюць.

— Паразітаў нам не трэба. Іх мы не будзем браць.

— А яны самі ўжо набраліся. Ведаеш, колькі на табе ўжо ўсякіх бактэрый, мікробаў? Мільярды!

— Пра гэта ведаем. Іх мы не возьмем, — упарта паўтарыў Эрпід.

— Стойце! Стойце! — кінуўся Ваня напярэймы машыне з будаю — ледзь не пад колы.

Прарэзліва завішчалі тармазы. Адчыніліся дзверцы кабіны, на падножцы паўстаў шафёр — дзядзька ў гадах.

— Ты што — здурэў? Жыць надакучыла? — затрос ён з-за кабіны кулаком.

— Дзядзечка, міленькі! Нам вельмі ў Менск трэба! Тэрмінова! Вы ж у Менск ці не?

— У Менск, у Менск... — усё яшчэ злосна прабурчаў шафёр. — А ў турму праз цябе не хачу садзіцца. Сыдзі з дарогі!

Ваня не сыходзіў. У вачах у яго заблішчалі слёзы.

— Дзядзечка...

— Ну куды я цябе дзену? Поўны кузаў скрынак з яблыкамі... Дый матор нешта барахліць, можа зусім машына стаць, — стаяў на сваім шафёр.

— Трэцяя свечка не дае іскраў, — нечакана сказаў Эрпід.

Шафёр паціху, з нейкім шыпеннем свіснуў.

— Гэта ён... Гэта яно... Ну, каробка гэта твая, гаворыць?! І нешта кумекае ў рабоце рухавіка?!

— Калі сказаў, значыць, кумекае. Ён у электрычнасці разбіраецца. Электронны робат.

— У сталіцу чаго? На выстаўку?

— На выстаўку. — Ваня і гэтаму шафёру не расказаў усяго пра Эрпіда.

— Дзядзька Мікалай, у вас там знойдзецца месца для аднаго... для дваіх? — закрычаў шафёр. — А то ў мяне тут сумкі.

— Мо як знойдзем, — адгукнуўся нехта з буды глухім голасам.

— Прымай тады гасцей! — Шафёр адчапіў і адкінуў задні борт. Прыгнуўся, падхапіў Эрпіда, махнуў у кузаў. Быццам не сто кіло ён важыў, а ўсяго дзесяць. Пачакаў, пакуль Ваня забярэцца сам, падняў і замацаваў борт.

Ваня нясмела разглядаў таго, хто валодаў такім глухім голасам. Дзядзька стары, мо скора семдзесят, твар худы, маршчыністы.

— Міця, а што там з маторам? — пагукаў шафёру дзядзька Мікалай.

— Ды нічога асаблівага. Памяняю свечку, і паедзем, — адказаў быццам здалёк шафёр і нечым бразнуў бляшаным, мо капотам машыны.

## 9

— Ну, чаго стаіш? Давай, гэта самае... — дзядзька Мікалай устаў, угнуўшыся, паразводзіў рукамі. — Размяшчайцеся, гэта самае...

Скрынкі ў кузаве стаялі шчыльна, некалькімі радамі. Толькі каля самага задняга борта было месцейка

як тром сесці.

— Яго трэба спачатку, баюся, каб не растрэсла за дарогу, — сказаў Ваня.

— А мы яму саломкі больш наскубем... Во та-ак... У цеснаце, ды не ў крыўдзе — уга! — лагодна гаварыў дзядзька Мікалай. — Куляй яго сюды!

— Дзякуй, я пастаю, — раптам сказаў Эрпід ветліва.

Дзядзька стаў на калені перад Эрпідам, абмацаў Эрпіда зверху да нізу і раптам адною рукою кульнуў Эрпіда, а другою — Ваню.

— Вось так вось... — пасміхнуўся ён. — За пастой грошы плацяць.

Ваню дзядзька пачаў падабацца.

— У вас у целе я бачу кавалкі металу, — сказаў Эрпід. — Нашто ён вам? Гэта запчасткі? Ва ўсіх, каго я здымаў, такога не было.

— Гэта самае... машына твая — рэнтген? Тут амаль прыцемак, а ён нават наскрозь бачыць... Гэта цяпер такія рэнтгены выпускаюць, што гаварыць умеюць? Ай-яй-яй, во тэхніка да чаго дайшла! — Дзядзька Мікалай паварочаўся, зручней усаджваючыся паміж Эрпідам і Ванем.

— Ён яшчэ і не такое ўмее. Ён адтуль... — паказаў Ваня ўгору. Гаварыць яму ад стомы і ляноты не хацелася, ён раптам адчуў сябе ў машыне ўтульна, як у пасцелі.

— А-а, спускаемы апарат, касманаўты нашы спусцілі. Дык ты яго знайшоў і ў Менск вязеш? — пацікавіўся дзядзька.

— Ага.

— От свет настаў. Гэта ж каб даўней хто сказаў, што я дажыву да такога, засмяяў бы.

— Адзін кавалак металу не выклікае ў вас запаленчага працэсу, — бубнеў сваё Эрпід. — Вакол двух другіх гэты працэс ёсць. Электрычныя палі моцна зменены.

— Ай-ей, чыстую праўду гаворыць твой апарат. Не сядзіцца на месцы двум асколкам. Як разгуляюцца часам, аж зубамі скрыгічу... Казаў хірургу — мо выразаць, каб не заміналі, не шкодзілі? Не, кажа, важных органаў яны не кранаюць, не будзем паласаваць. А яму што, хірургу? Хіба мае асколкі яму баляць? Дый малады ён, пасляваенны... Ох-ха... — Дзядзька памацаў сябе за бок, завёў руку і за спіну. — А дождж, гэта самае... мудрэй за бюро прагнозаў прадказваюць. І сёння к вечару збярэцца дождж.

— Адкуль узяўся метал у вашым целе? — спытаў Эрпід.

— Адчапіся ад чалавека! Хочаш здымаць — здымай паціху і маўчы, — умяшаўся Ваня. — Я ж табе гаварыў, што вайна тут была. І дзед мой ваяваў, партызаніў, ты і яго хацеў запісаць. Эканом энергію.

— Не, чаму. Хай слухае, калі ахвоту мае... Ехаць яшчэ больш за гадзіну.

— Іван Аляксеевіч Гардзей, ты паспі, калі табе нецікава. А мая справа збіраць інфармацыю — хоць ад дзеда, хоць не ад дзеда, — Эрпід пачаў паказваць свой нораў.

Пад роўны гул машыны дзядзька Мікалай расказваў, як ваяваў, дзе і колькі разоў быў паранены, колькі баявых таварышаў загінула, пакуль прагналі гітлераўцаў і прыйшла Перамога.

— Дваццаць мільёнаў нашых людзей загінула! — дабавіў Ваня. — Алег Максімавіч гаварыў: нібы дзве даваенныя Беларусі вынішчылі да апошняга чалавека. А параненых дзесяткі мільёнаў было.

— Не разумею, нашто людзям вайна, — сказаў Эрпід. — Хіба няма больш чаго рабіць? Нядобрая планета Зямля.

— Як гэта нядобрая? Добрая! А магла, вядома, яшчэ лепшай быць... — сказаў дзядзька Мікалай. — Па нас, то хай бы вечна вайны не было. Але ж капіталісты гэтыя, імперыялісты з фашыстамі лезуць. Не церпіцца ім, не сядзіцца спакойна, ваяваць хочацца ім. Столькі зброі ўсякай, бомбаў зноў нарыхтавалі... Лектар прыязджаў, гаварыў, што на кожнага чалавека на Зямлі нарыхтавана па тры тоны толу. Гэта калі ўсе выбуховыя рэчывы на тол перавесці... А чалавека каб знішчыць, гэтак мала трэба!

— Нядобрая планета Зямля... — мармытаў сваё Эрпід. — Трывогі людскія не толькі з арбіты ўлоўліваюцца — нават з далёкага космасу. Радыёхвалі думак, трывожныя імпульсы ляцяць і ляцяць... Калі ўсё тут знішчыцца, то і для нас гэтая планета будзе страчана.

— Эрпід, памаўчы. Ты лішне разгаварыўся, — папярэдзіў Ваня.

Эрпід нібы паслухаўся, змоўк. У паўзмроку засвяціліся на яго твары лямпачкі.

— Ты чаго? У цябе сеанс сувязі? — папытаў Ваня.

Эрпід не адказаў, пакуль не патухлі лямпачкі.

— Яны мяне выклікалі. Палаялі, што ўмешваюся ў зямное жыццё. Не на тое трачу энергію. Размагніцілі трыццаць два блокі памяці.

— Дык яны цябе няспынна кантралююць? — здзівіўся Ваня.

— Так. Адзін канал сувязі ўвесь час падключаны.

— Дык што ж там у вас за камандзіры, калі загадваюць гэта не заўважаць, на тое заплюшчыць вочы,

слухаць на паўвуха і трымаць язык за зубамі? Хіба ж так вывучыш людзей і Зямлю? — не вытрываў Ваня.

— Ёсць незразумелыя выразы, але пытаць не буду, — сказаў Эрпід. — Ты спі, Ваня, спі.

Ваня прылёг, падклаўшы пад вуха руку.

— Дык ён, гэта самае... і праўда не нашым касманаўтам служыць? — урэшце здагадаўся дзядзька Мікалай.

— Не, ён з другой планеты. Там зялёнчыкі жывуць... І ў іх два сонцы... І яны харчуюцца сонцам... — Ваня гаварыў усё больш невыразна, з цяжкасцю адольваючы дрымоту.

— Тэмпература, мабыць... Беднае хлапчаня, загаворвацца стаў.

Дзядзька памацаў Ванеў лоб, потым зняў з сябе цупкі, нібы каляны, плашч і прыкрыў хлопчыка па самую шыю.

— Я не захварэў... — млява пасупраціўляўся Ваня.

— Ты ляжы, ляжы. Паспі, табе палягчэе. Я скажу, калі Менск, — лагодна гаварыў дзядзька Мікалай.

— Мама... Тата... — прамармытаў яшчэ Ваня і... заснуў.

Ён не чуў ужо, як гаварыў Эрпід:

— Іван Аляксеевіч Гардзей... Я чую твае думкі. Не бойся... Твае бацькі не будуць турбавацца, перажываць, дзе ты падзеўся. Яны нават не заўважаць, колькі мінула часу. Спі!

Але раптам Ваня прыйшоў да памяці і зусім выразна сказаў:

— Ты толькі асцярожна са сваімі фокусамі... — і заснуў канчаткова.

Дзядзька Мікалай паціху, як над калыскай, заспяваў:

У чыстым полі, полі пад ракітаю,
Дзе клубіцца па начах тума-а-ан...

**10**

У Ваневай маці, Ганны Макараўны, была блакітная мара: хоць раз пабачыць за сталом усю сваю сям'ю. Бо што гэта за сям'я, калі яна ніколі не можа сабрацца разам? Ва ўсіх свае справы-турботы, свая бегатня... І от каб сабраліся ўсе за сталом, і каб яна была свабодная ў гэты дзень, і быў бы ў яе толькі адзін клопат — накарміць удосталь усіх блінцамі. І ўсе б елі не похапкам, не давячыся, а спаважна, смакуючы — хто з маслам, хто са здорам, хто з мачаннем, хто са смятанаю, хто з малаком, хто з варэннем... І яна таксама снедала б разам з усімі і бачыла б, як і старэйшым, і дзецям смачна, як усе задаволены, як дзякуюць ёй...

І сёння, бегучы з фермы, з ранішняй дойкі кароў (ферма амаль на роўнай адлегласці паміж Клінцамі і Бярозаўкаю), Ганна Макараўна песціла сваю мару. Хоць ведала, што такога не можа быць, нікога ж дома няма, хіба што адзін Ваня. Нават дзед і той не ўседзеў сёння дома, нічога не памог па гаспадарцы — памчаў у лес. Знойдзе ці не таго грыба, а от дзень змарнуе. Стары, што малы. Значыць, ёй давядзецца сёння яшчэ ўходжвацца па гаспадарцы, гатаваць абед. І добра было б выкапаць на прысядзібным участку хоць сотку бульбы. Людзі ўжо канчаюць выбіраць на агародах, а Гардзеям усё няма калі.

Пакарміла свіней і курэй, памыла посуд, папрыбірала ў хаце, паставіла ў печ варыць абед. На газавай пліце горш — не адысціся, стой ды стой крукам.

Выскачыла з рыдлёўкаю ў агарод. Капала і капала, выварочвала карчы, але бульбу не збірала, чакала, каб падсохла. І дарэмна не збірала, бо Галабродзькаў певень ужо цікаваў з-за плота, чакаў свайго часу. І толькі пайшла яна з агарода, той адразу пераляцеў цераз плот. «Ко-ко-ко!» — паклікаў за сабою галодную плойму курэй, каб праз колькі хвілін пакінуць ад бульбы адны чарапкі.

А Ганна Макараўна забыла пра ўсё. Бег часу спыніўся для яе. Ёй раптам здалося, што яшчэ ранняя раніца, прытым свята, усе адсыпаюцца. А яна парупілася, устала, каб падрыхтаваць усім сюрпрыз, напячы блінцоў. Ды столькі, каб усе наеліся дасхочу і яшчэ засталося.

Узяла самую большую, літраў на дзесяць, каструлю, усыпала мукі, солі, цукру, шухнула збан кіслага малака, убіла яйкі, старанна ўсё размяшала, дабавіла соды і зноў памяшала.

Пякла на дзвюх скавародах, на пліце. Не пякла — свяшчэннадзейнічала. Сэрца яе раставала ад замілавання, шыпенне цеста на патэльнях гучала для яе як самая пекная музыка.

Усё вышэй расла гара блінцоў, блізка было дно ў каструлі. І раптам каля варот раўнула машына, загукалі галасы даярак:

— Ганна, о Ганна! Гардзейчыха!

— Дзе ты запрапала? Чакалі, чакалі, мусілі заязджаць.

— На абедзенную дойку познімся!

Ганна Макараўна адчыніла акно, закрычала на іх шэптам, замахала:

— Цішэй, сарокі! — і выбегла на двор, да вулічных варот. — Вы куды ў такую рань? Мае яшчэ спяць, ніхто не снедаў.

— Якая рань?! Якое спяць?!

— Ой, жанчынкі, яна не ў сваім розуме!

— Паўдня ўжо! Сонца вунь дзе, бачыш?

— Залазь хутчэй у кузаў! Мы тваё вядро захапілі! — зноў закрычалі жанчыны.

— Адчапіцеся вы! Блінцы вунь гараць! — адмахнулася ад іх, як ад пустога месца, Ганна Макараўна і паспяшалася да пліты.

Жанчын нібы які паралюш хапіў. Трохі пасядзелі ашаломленыя, а шафёр не вытрымаў такога зацішша, пасігналіў: «Пі-і-іп!» Тады даяркі пачалі порстка злазіць з машыны. Перагаворваліся, божкалі, бедавалі:

— Ой, што ж гэта робіцца на свеце?!

— Жанчынкі, чулі? Іхняга ж Лёню і настаўніка Алега Максімавіча «хуткая» павезла ў бальніцу! Таксама нешта з галовамі не ў парадку.

— А Ганна, відаць, нічагусенькі пра Лёню не ведае!

— Пошасць нейкая ўбілася! Эпідэмія!

— Ага! І да Ганны дабралася!

Даяркі ўваліліся ў кухню. Ганна Макараўна завіхалася каля пліты — разрумянілася, пахарашэла.

— Ой, хіба ты на роту салдат пячэш? — задзівіліся даяркі. — Мо сто штук ужо!

— Ціха, я зараз пабуджу сваіх салдат! Мае такія едуны, што і ўчатырох справяцца. — Ганна Макараўна пацерла аб фартух рукі, падышла да дзвярэй у пакой. Прачыніла, асцярожна прасунула галаву: — Агу-у! Мужчынкі, уставайце. Авохці, дзе ж яны... От жулікі, пахаваліся ў спальню... — Перайшла пакой, адчыніла дзверы спальні. І нікога там не знайшла. — А-а, на двор павылазілі праз акно. Паджартаваць хочуць... Але яны зараз з'явяцца. Зараз! — На яе твары блукала такая ўсмешка, нібы Ганна Макараўна з хвіліны на хвіліну чакала ад іх якога розыгрышу.

— Ганна, ты супакойся... Бачыш жа, даўно нікога няма!

— Ты не хвалюйся, Ганначка! Ты прыляж, адпачні!

— Ага! А мы тваю групу падоім! Возьмем па дзве-тры каровы кожная — і падоім.

Хто з жанчын адступаў задам да дзвярэй, спалохана намацваючы нагамі парог. Хто спрабаваў забраць з рук гаспадыні лыжку і каструлю, бо Ганна Макараўна зноў узяласяналіваць блінцы, выскрэбваючы апошнія кроплі цеста.

— Я зараз дапяку ды каструлю памыю... І трэба яшчэ сала насмажыць... Мой Аляксей вельмі ж любіць, каб на скаварадзе было туку поўна, а ў ім лыжачка смятаны. А мо больш накалаціць блінцоў, мо мала будзе гэтых?

— Аляксей твой даўно ў полі ўжо, арэ!

— Якое ма-ала?! І тыя падубянеюць, пакуль прыйдзе хто есці!

— Жанчынкі! Разбірайце блінцы! Не дамо дабру прапасці! Ганна, паедзем з намі, мо дзе сустрэнем тваіх Гардзееў, то на хаду пакормім!

Адабралі ўсё-такі каструлю і лыжку, выключылі пліту. Сілком павялі Ганну Макараўну з сабою. А вось пабудзе на свежым паветры, праясніцца ў галаве.

Пасадзілі Ганну Макараўну ў кабіну, уціснулася і яшчэ адна даярка — пільнаваць, каб не выскачыла Гардзейчыха на хаду.

## 11

Тая дарога, што ішла ад гравійкі па ўзлеску ў Партызанскі лес, мела працяг і па левы бок гравійкі. Калі ехаць улева, трапіш на ферму, а калі яшчэ далей — будзе поле і луг. Па гэтай дарозе і трэба было ехаць да кароў, але шафёр не звярнуў з гравійкі, ляцеў проста ў Бярозаўку. Мо хацеў барзджэй дабрацца да тэлефона, каб пазваніць пра новае здарэнне.

Ад дарогі, што вяла на ферму, і амаль да хат Бярозаўкі араў іржышча на зябліва трактар «Беларусь». Каля самых агародаў ён заварочваў, заходзіў з паднятымі плугамі на другі бок загона, апускаў плугі і рухаўся ў зваротным напрамку. Але на гэты раз...

— Ой, куды ж ён?! — войкнула тая даярка, што загарадзіла сабою выхад для Ганны Макараўны. — Здурнеў, ці што?

Трактар каля агародаў не падняў плугоў, не павярнуў, а пашыбаваў проста на чыесьці буракі. Раўнуў, буксануў трохі, калі плугі ўеліся ў цвердзь загуменнай дарогі, потым нібы ахнуў з палёгкаю,

перабраўшыся цераз яе, і пагнаў чорную палосу па бураках, па бульбе, па моркве. Што там ні расло, усё пераварочвалася, заворвалася.

Шафёр ад такой неспадзяванкі ціскануў на тормаз. Даярак у кузаве кінула да кабіны, паклала. А Ганна Макараўна і даярка-спадарожніца ледзь не высадзілі галовамі пярэднюю шыбу.

— Гэта ж Аляксей Гардзеевіч тут арэ! Што з ім здарылася? — і шафёр зноў газануў на ўсю моц. — У хату ўрэжацца ці ў дрэва...

Заскочыўшы ў Бярозаўку, машына крута звярнула ўлева, паляцела напярэймы трактару. Вішчалі ў кузаве даяркі, хапаючыся за барты. Зусім блізка была ўжо кантора калгаса, калі машына моцна віскнула тармазамі, а даяркі ледзь не пападалі на кабіну.

— Вунь ён! — Адчыніў шафёр дзверцы, паказаў на чыйсьці агарод. У тры скачкі ён даляцеў да плота, перамахнуў цераз яго, пабег насустрач трактару.

— І шафёр глузды згубіў! Яшчэ пад трактар трапіць... — Даярка, што пільнавала Ганну Макараўну, кідала быстрыя позіркі то на яе, то ўслед шафёру. Нічога, мабыць, Ганна Макараўна не цяміла, што наўкол робіцца. На твары яе блукала добрая ўсмешка.

На шчасце, трактару не трапілася па дарозе ні будыніна, ні тоўстае дрэва. А прышчэпы ён клаў, трушчыў, як салому, заворваў.

— Стой! Стой, кажу! — замахаў шафёр трактарысту. І адскочыў з дарогі, бо трактар не спыніўся.

Хруснуў плот, лёг пад колы. Трактар выперся на вуліцу, вывалак за сабою плугамі добры кавалак плота і заглух.

Шафёр падскочыў да кабіны трактара, ірвануў дзверцы...

Узлёгшы грудзямі на баранку руля, сядзеў Аляксей Гардзеевіч і... соладка пахропваў.

— Жывы?! — Сыпаліся з кузава машыны даяркі, беглі да трактара. — Глядзі, мо п'яны?

— Не, проста заснуў. Эй, уставай, прыехалі! — затузаў яго за плячо шафёр.

Учапіліся ў Гардзея і даяркі, памаглі шафёру выцягнуць яго з кабіны. Грузнага Аляксея Гардзеевіча паклалі пад ліпу на траву. І гэтак яму стала, мабыць, добранька, што ён нават вольна раскінуў рукі, заснуў яшчэ мацней.

З бліжэйшых хат і з канторы павыходзілі людзі, абкружылі трактарыста і Ганну Макараўну, якая прысела каля мужа, гладзіла яго па валасах.

— Шкоды колькі нарабіў! А хто ж мне пакрые ўсе страты?! — крычала цётка Магда, школьная прыбіральшчыца. Гэта яе агарод пераараў трактар.

— Аплацім, аплацім вашу шкоду... — сказаў старшыня калгаса Трафім Іванавіч.

— Званіце ў «хуткую дапамогу»! Хіба не бачыце — уся сям'я заражаная! — крычалі даяркі.

— Гэта іх муха цэцэ ўкусіла! Я чула ў школе, у Афрыцы ёсць такая муха... Укусіць, і чалавек засынае! — гаварыла цётка Магда.

— Не выдумвайце, цётка! Беларусь жа не Афрыка! — пярэчылі ёй.

— Разыходзьцеся, жанкі! Тут вам не базар! Каровы нядоеныя, а вы ля-ля разводзіце! Рэжым парушыцца! — гаварыў Трафім Іванавіч, але яго, здаецца, ніхто не слухаў.

— Калі ўся сям'я ненармальная, значыць, эпідэмія! Дакторка з горада так гаварыла! — выкрыквала цётка Магда.

— Алег жа Максімавіч не з іх сям'і!

— Людзі, а хто ведае, дзе Двайны Гардзей? І як Ваня?

— Няма іх у Клінцах! Мы ж адтуль ехалі! — сказала адна з даярак.

— А мо яны ўсе грыбамі атруціліся? Я раз была нейкіх воўчых з'ела, дык што п'яная была! — даводзіла сваё цётка Магда.

— Ад грыбоў такога не бывае!

— Праўда, ад грыбоў не можа быць! — згадзілася цётка Магда. — Лёня Гардзей ссівеў у класе за некалькі хвілін! І як пачаў гаварыць па-ўсякаму, як пачаў! Збегліся настаўнікі, а ніхто зразумець не можа! А Алег Максімавіч плача, як дзіця. «Цётачка, міленькая, — на мяне кажа, — даруйце мне за ўсё!»

— Машыны ў вуліцу завярнулі... Адна, дзве... Тры «хуткія дапамогі»! І міліцэйская машына! — закрычалі з натоўпу.

— А хто іх паспеў выклікаць?

— Ой, людцы, разыходзьцеся!

«Хуткія дапамогі» пасталі паўколам, ахапіўшы натоўп. Міліцэйская праскочыла крыху далей, спынілася каля ганка праўлення калгаса. Заляскалі дзверцы... На вуліцы пасвятлела ад людзей у белых халатах.

— Дзе старшыня калгаса? — спытала самая тоўстая цётка ў белым халаце, адзетым не так, як трэба: кішэнькі былі на спіне.

— Тутачкі, тутачкі!

— Пад ліпаю хворыя! З галавою ў іх не ў парадку!

— Я старшыня! — падышоў Трафім Іванавіч да тоўстае цёткі. — А вы загадчык санэпідстанцыі? Вельмі прыемна... — падаў цётцы руку.

Тым часам Аляксея Гардзеевіча (ён так і не прачнуўся) панеслі ў машыну. Ганна Макараўна пайшла за ім сама. Яна нічога не разумела, што робіцца, шчаслівa ўсміхалася.

Загадчыца санэпідстанцыі загаварыла загадным тонам:

— Таварыш старшыня! Нам трэба памяшканні для ізалятараў. Усіх гэтых людзей, што былі ў кантакце з хворымі, трэба ізаляваць. Далей... Па радыё трэба аб'явіць пра каранцін. Ніхто з Бярозаўкі нікуды не павінен выходзіць, гэтаксама і з Клінцоў. Будуць на ўсіх дарогах і выхадах пасты, парушальнікаў аштрафуем — і ў ізалятар. Далей... Загадайце бульдазерысту, каб на выхадах з вёсак выграб неглыбокія ямы, а шафёры падвезлі пілавіння. Будзем рабіць каранцінныя падушкі...

— А як жа работа? — спрабаваў пярэчыць Трафім Іванавіч. — У нас жа некаторыя жывуць у Клінцах, а на работу ходзяць сюды.

— Ніякага хаджэння, ніякага кантакту! Абыходзіцца мясцовымі сіламі... Далей... Дзе ў вас жыве Магдалена Пятроўна Сівіцкая? Ізаляваць у першую чаргу!

— Тутачкі была... Цётка Магда, дзе вы? — пачалі азірацца даяркі. — А вунь яна, пабегла ў свой двор!

— Ізаляваць! — выставіла, як пісталет, палец у бок цёткі Магды загадчыца санэпідстанцыі.

Выконваць загад кінуліся два санітары. Але цётка Магда паспела заскочыць у сенцы і шоргнуць засаўкаю.

— Зараз жа адчыніце! Чуеце? — застукаў адзін у дзверы хаты, а другі адразу пачаў вымаць раму акна, каб залезці.

— Калаву-у-ур! Грабю-юць! — даносіўся глухі крык прыбіральшчыцы.

— Далей... — чаканіла строгая загадчыца санэпідстанцыі. — Хто на працягу ўчарашняга і сённяшняга дня куды паехаў у камандзіроўку — скласці спісы. Трэба даваць тэлеграмы ў тыя гарады, каб санэпідстанцыі іх выявілі, ізалявалі. Далей... Школа на некалькі дзён закрываецца... Далей... Нам трэба праважатыя, мы павінны зрабіць дэзінфекцыю ў хаце Гардзееў і ў кватэры Алега Максімавіча. Далей...

— А як жа даяркі? Во яны... Некаторыя з Клінцоў... Сабраліся ехаць у поле даіць кароў, — даводзіў сваё старшыня.

— Ніякіх выездаў! Яны мелі кантакт з Гардзеямі! Ізаляваць! Звaніце ў Клінцы брыгадзіру, няхай арганізоўвае новых людзей замест даярак. А з Бярозаўкі нікому нікуды і кроку! Далей...

Многа ўсякіх «далей» было ў загадчыцы санэпідстанцыі. Потым пачалі гаварыць са старшынёй работнікі міліцыі.

Санітары прывялі пад рукі цётку Магду. Яна, і праўда, гаварыла як хворая:

— А курачкі мае нядоеныя... А цялятка маё някормленае... А парасяткі мае на седалах сядзяць нявыпушчаныя! — галасіла яна. — А чаго ж я прыперлася дадому, хай бы я ў якое балота схавалася!

Цётку Магду пасадзілі ў «хуткую дапамогу», а ўсіх, хто быў у натоўпе, павялі ў клуб — у ізалятар.

Праз некаторы час вярнуўся шафёр, што вазіў моркву ў райцэнтр. І не пыталі ў яго, сам расказаў пра дзіва, якое бачыў на дарозе: пра жалезнага робата-чалавечка, што можа гаварыць, і пра хлопчыка Ваню па прозвішчу Гардзей. Галасаваў ён, хацеў ехаць у Менск. І, мабыць, удалося падсесці, паехаць, бо калі вяртаўся назад, без морквы, на дарозе не было ні Вані, ні таго робата-рагатуна.

Павялі і шафёра ў клуб, у ізалятар. Бо дзіўна было чуць ад яго пра нейкіх робатаў-рагатуноў, і дзе? На нейкай глухой дарозе-гравійцы...

А ў Менск да работнікаў санэпідстанцыі і ў міліцыю паляцелі тэлеграмы з апісаннямі прыкмет Вані Гардзея: «Знайсці! Затрымаць! Ізаляваць!»

## 12

Ваня прачнуўся ад хрыплага смеху і шэлесту газеты. А мо і не гэта разбудзіла, а тое, што машына стаяла — не пакалыхвала, не падтрэсвала, не гула. Праўда, гуду і шораху шын было яшчэ многа, толькі больш глухога: мабыць, міма праляталі іншыя машыны.

— Што гэта вы робіце? — падзівіўся Ваня.

Дзядзька Мікалай стаяў на каленях перад Эрпідам і трымаў перад ім газету.

— Перавярніце, з таго боку таксама ёсць літары, — гаварыў Эрпід.

Дзядзька Мікалай павярнуў газету другім бокам.

— Яшчэ павярніце, — запатрабаваў Эрпід праз секунду.

— Дык я ж сярэдзіну паказваў ужо, разгортваў, — сказаў дзядзька і толькі цяпер адказаў на Ванева пытанне: — Ну і ну... Гэты твой робат нават чытаць не ўмее!
— Умею, — з нейкай упартасцю сказаў Эрпід.
— Ну але, цяпер ужо ўмееш, а спачатку — ні ў зуб нагою!
— Інфармацыю не зразумеў... Каму біць нагою ў зубы? Навошта? І за што біць?
Дзядзька Мікалай разгублена закрахтаў, і Ваня паспяшаў на выручку:
— Дзядзька хацеў сказаць, што ты ў літарах ні бум-бум не цяміў.
— Бум-бум... Інфармацыю не зразумеў. Здаецца, у мове аднаго афрыканскага племя ёсць слова бум-бум.
— Ды хопіць табе! Будзеш усё знаць да канца, састарышся, як аўца, — Ваня пачаў злавацца. Гэты Эрпід каго хочаш можа вывесці з цярпення.
— Аўца... Авечка... Хатняя жывёліна... — мармытаў тым часам Эрпід. — Вы авечкам расказваеце ўсё да канца? А чаму мне не хочаце?
— О, Божа... Памаўчы, дай дзядзьку сказаць. А табе я ўсё потым растлумачу. Я табе ўсе кніжкі перад носам перагартаю, што мы ў школе праходзім. І Лёневы пакажу... За адзін дзень васьмігодку скончыш.
— Ага, — пачаў гаварыць дзядзька. — Не ўмеў чытаць, дык я паказаў яму ўсе літары, знакі. Адразу ўсё схапіў і пачаў чытаць цэлымі старонкамі — разгарні ды павярні просіць.
— Эрпід, ты запісаў усю нашу газету? — Ваня нават крыху спалохаўся. Ну і дзядзька Мікалай, што ён нарабіў? У газетах жа і крытыка ўсякая бывае, і пра недахопы пішуць. А во ў гэтай, на чацвёртай старонцы, фельетон пра нейкіх махляроў і хапуг, прайдзісветаў. Нашто, каб на чужой планеце ведалі, якія гадкія бываюць людзі?
— Каб людзі такія здольныя былі — ого! — круціў у захапленні галавою дзядзька Мікалай.
— Эрпід, я табе задаваў пытанне. Чаго ты маўчыш? — напомніў Ваня.
— Супастаўляю факты, рабіў вывады. Я ведаю ўжо, што вы не любіце вайны, не хочаце, каб зноў была вайна. А на трэцяй старонцы газеты ў трох месцах пішацца пра вайну, пра забітых, пра палонных, пра разбітую і захопленую тэхніку.
Дзядзька Мікалай апярэдзіў Ваню:
— Э, браток, дык войны ж усякія бываюць: справядлівыя і несправядлівыя, захопніцкія і вызваленчыя... Калі народ якое краіны вызваляецца ад прыгнёту, ад захопнікаў, дык хіба скажаш — не ваюйце, цярпіце? Правільна робяць, што ваююць! А ты, гэта самае, зусім у палітграмаце не разбіраешся! Запісацца табе трэба ў наш калгасны палітгурток.
«Добра, што Эрпіды да нас спусціліся, у нашу краіну. А што было б, каб за акіян трапілі, у рукі імперыялістаў?» — падумаў Ваня.
Эрпід пачуў яго думкі.
— Эрпід-тры трапіў не за акіян, а ў акіян. Ён плавае пад вадою, вывучае, што робіцца ў акіяне, хто там жыве.
— Значыць, і трэці Эрпід ёсць? А ты ж спачатку не гаварыў пра трэцяга! Гавары цяпер, колькі ўсіх запусцілі! — трохі раззлаваўся Ваня.
— Трох. Усяго трох.
Каля задняга борта з'явіўся шафёр дзядзька Міця, злёгку пастукаў рукою, нібы хацеў далікатна пабудзіць пасажыраў.
— Та-ак, я ўжо два свае заданні выканаў і ў аптэку заскочыў. А табе, хлопча, дзе выходзіць? Дзе ваша выстаўка тэхнікі? У Доме піянераў?
— Ён скажа, — кіўнуў Ваня на Эрпіда. — Куды далей рухацца?
— Пытанне зразумеў. Курс — норд, норд-ост. Да аб'екта чатыры кіламетры шэсцьсот дзевяноста адзін метр... Не, ужо дзевяноста два... Дзевяноста тры... Эрпід-два рухаецца ад нас!
— Ост — гэта ўсход, ці што? — пачухаў бараду шафёр. — А мо вы тут ужо самі як даберацеся? Тут жа многа ўсякага транспарту ходзіць.
— А вы па вуліцах едзьце, толькі каб напрамак быў амаль што ўсходні. Туды недзе, пад Партызанскі праспект, — сказаў Ваня.
— Карацей, так: мы едзем на калгасны рынак трактарнага завода. Гэта амаль на ўсход... Задавальняе вас?
— Ага! Газуйце!
— Ну, тут вельмі не нагазуеш, гэта не за горадам. — Шафёр пайшоў садзіцца ў кабіну.
— Аналіз паветра паказвае: рэзка ўзрасла колькасць шкодных для людзей газаў, зменшылася колькасць кіслароду. Нашто ты яму сказаў, каб газаваў, яшчэ больш рабіў шкодных газаў? — папытаў Эрпід.

— Пра авечку прымаўку не забыў? — замест адказу папытаў Ваня.
— Не забыў. Але я не авечка. Мне трэба ўсё ведаць. А нашто дзядзька Мікалай таксама газуе, пускае з рота і носа шкодны дым? Нашто ўдыхае шкодныя газы ў лёгкія?
Дзядзька Мікалай, які ўсю дарогу стрымліваўся і толькі зараз закурыў, закашляўся ад Эрпідавых пытанняў. Потым паплявaў на цыгарэту і пстрыкнуў яе за борт.
— Шкодныя газы, праўду кажаш... Мне і ўрач уталкоўваў: «Кіньце шкодную прывычку! А то мы не вылечым ваш страўнік...» А яно, каб на яго ліха, не кідаецца. З вайны гэтая прывычка.
— Адзначаю: людзі многа робяць шкоднага для сябе і не могуць кіраваць самі сабою, — зазначыў Эрпід.
— Многія ўжо кінулі курыць, — сказаў Ваня. — Так што ты запішы: людзі ўвесь час разумнеюць, бяруць сябе ў рукі.
— Браць сябе ў рукі... За бакі, ці як? — мармытаў сам сабе Эрпід.
Але ніхто яму не растлумачыў.
Далейшая язда напаміналa дзіцячую гульню, калі трэба нешта схаванае знайсці і ўсе крычаць: «Халадна! Цёпла! Горача!» — у залежнасці ад таго, куды паварочвае шукальнік, набліжаецца да схованкі ці аддаляецца ад яе. Эрпід час ад часу прыгаворваў: «Курс машыны адхіляецца ад зададзенага ўправа... А цяпер улева... А чаго мы павярнулі амаль назад? Аб'ект ад нас зноў аддаляецца». Антэны Эрпіда злёгку паварушваліся, а мо правільней было сказаць так: Эрпід-адзін навёў іх проста на Эрпіда-два і ўвесь час так трымаў іх, а здавалася, паварочваў, калі паварочвалася машына. На твары Эрпіда гарэла толькі адна чырвоная лямпачка, і, як толькі машына адхілялася ад курса, яна трывожна мігала. «Да аб'екта засталося дзвесце трыццаць метраў... Дзвесце шэсцьдзесят... Мы аддаляемся...»
— Ой, нам лепш тут сысці! — закрычаў Ваня.
Дзядзька Мікалай пагукаў шафёру, але той не пачуў, і тады ён пачаў браць са скрынкі яблыкі і шпурляць уперад, паміж радамі. І хоць не ў кабіну яны грукалі, шафёр пачуў. Машына падвярнула да тратуара і затармазіла.
— Вунь той парк маладзенькі, дзе звярынец стаіць! Я пазнаў! — закрычаў Ваня, звесіўшыся цераз задні борт. — І звярынец тут, яшчэ не паехаў!
Да борта падышоў дзядзька Міця, адшчапіў, адкінуў уніз.
— Эй, паўзун! Каці сюды! — пазваў шафёр Эрпіда, каб зняць.
Дзядзька Мікалай памог Эрпіду выблытацца з саломы.
— Бліжэй, бліжэй. Вось так... — прыгаворваў шафёр. — Оп-па! — Падхапіў Эрпіда на рукі, вынес на тратуар.
Ваня хацеў ужо скочыць дадолу, але дзядзька Мікалай спыніў яго за плячо.
— Стой, стой! Шапку давай... Яблык, во, набяры... Схрумстаеце, як знойдзеце. — Ён гаварыў так, быццам хрумстаць гэтыя яблыкі будзе і Эрпід.
— Дзякуй! Дзякуй вам за ўсё! — расчулена паўтараў Ваня.
— Няма за што, — усміхнуўся дзядзька Мікалай. — Бывай! А як ты назад будзеш дабірацца? Сёння ці калі?
— Не ведаю яшчэ! — адказаў Ваня, скокнуўшы на зямлю.
Машына зрушыла з месца.
— Калі захочаш!.. Падыходзь гадзіны праз чатыры на калгасны рынак!.. К шаснаццаці! Можам і назад прыхапіць! — даляцела здалёк.
— Дзякуй! — Ваня памахаў свабоднаю рукою. Ён яшчэ глядзеў услед машыне, калі пачуў каля ног слабае павіскванне. Зірнуў уніз. — Жучок, ты-ы?! А які ж ты мокры і брудны! Ты ўсю дарогу бег за намі?! — Ваня ніяк не мог паверыць сваім вачам. — І пад машыны не трапіў?!
Жучок хацеў лізнуць працягнутую руку, але сілы не хапіла. Ён дыхаў са стогнам, целяпаўся доўгі ружовы язык. Сабака ўлёгся каля Ваневых ног, выцягнуў усе чатыры лапы, нібы збіраўся паміраць.
— Эрпід, гэта ўсё твае фокусы! Ты зрабіў так, каб я зусім забыў пра сабаку!
Эрпід адказаў, але не тое:
— Да аб'екта трыста трыццаць тры метры... Аб'ект рухаецца... Не разумею, калі ён увесь час рухаецца, то чаму не можа выйсці на сувязь з караблём ці са мною?

## 13

Ваня перакладваў яблыкі з шапкі ў запазуху, надзеў шапку, заціснуў пад рукою Жучка.
— Пайшлі, чаго стаіш? Святлафора не бачыў? Нам зялёны, можам пераходзіць вуліцу.
— Святлафор мяне не цікавіць — прымітыўнае прыстасаванне, — зазначыў Эрпід.

Ваня працягнуў да яго свабодную руку — падтрымаць, каб Эрпід не кульнуўся з бардзюра. Але серабрысты неяк схіліўся да праезджай часткі, адпрастаў ад боку адну нагу, другую, працягнуў іх да асфальту, як спрабуюць, ці цёплая вада, і абапёрся на ногі, як на падпоркі, паволі з'ехаў. А цераз вуліцу паехаў хутка, нават Ваню выперадзіў.

— Пераходзіць вуліцу трэба спакойна і толькі ў тых месцах, дзе намалявана «зебра», — дагнаў яго Ваня.

— Ні зебры, ні якое іншае жывёлы не бачу. А-а-а, гэта там яна намалявана? — павярнуўся Эрпід у бок звярынца. — А як жа цераз яе пераходзіць?

— Там звярынец, а навокал яго шчыты з малюнкамі звяроў: зебра, мядзведзь, леў, пантэра, малпы вісяць уніз галавою, хвастамі зачапіліся... Заходзіць нам туды няма калі, — сказаў Ваня.

Іх ужо акружыў натоўп дзяцей і дарослых. У многіх на тварах свяціліся добрыя ўсмешкі: людзі пачалі сачыць за Эрпідам і Ванем, калі яны яшчэ пераходзілі вуліцу.

— Ты сам яго зрабіў? Здо-о-орава... — Дзеці абмацвалі Эрпіда, пагладжвалі, і здавалася, што яму прыемна, што ён жмурыцца, як кот. — Чуеш, а чаму ў яго не такія колы, як у лунахода?

— Гэта робат? А чаму ў яго такія кепскія ногі?

— А нашто яму ногі!

— Гэта робат, — адказаў Ваня. — Ён не прызначаўся для бездарожжа, у яго іншыя задачы і функцыі, — перайшоў Ваня на навуковы стыль. «Хай думаюць, што гэта я зрабіў яго...» Дастаў з запазухі яблык, кусануў так, што наўкол паляцелі пырскі.

— Іван Аляксеевіч, я хачу яшчэ запісаць тыя намаляваныя карціны. Новая інфармацыя... — Гэтых слоў Эрпіда было дастаткова, каб зноў пачулася: «У-ух ты-ы!!!» — «Дык ён і гаворыць?!» — «А што ён яшчэ ўмее?» — «Лепш у звярынец завядзі яго, хай жывых звяроў паглядзіць!» — Звярынец нам па курсе, — сказаў далей Эрпід. — Калі Эрпід-два дасюль нічога не перадаў пра раслінны і жывёльны свет, я павінен яго замяніць хоць часткова.

— Іван Аляксеевіч, — з пашанаю звярнуўся да Вані хударлявы хлапчук з рабацінкамі на носе, — як ты назваў свайго робата? Ці доўга ты яго рабіў?

— Зваць Эрпід. Электронны робат-паліглот ізаляванага дзеяння. Рабіў доўга, можна сказаць, усё свядомае жыццё.

«А сам адзін ці з гуртком?» — «А з якое ты школы? Яна з тэхнічным ухілам?» — «А Эрпід у шашкі, шахматы гуляе?» — пасыпалася з усіх бакоў.

— Давай сюды, — скіраваў Ваня Эрпіда на дарожку, што вяла проста да звярынца. — Ён можа такое, што вам нават і не снілася. Дарогу, дарогу яму!

Не ўлічыў Ваня, едучы ў горад, што тут такая процьма народу. «Як ад іх адкруціцца? Яны ж і кроку не дадуць ступіць!» — пакутліва думаў ён.

— Эрпід, ты іх усіх прасвяціў, запісаў? — Ваня думаў, што такім пытаннем трохі адпужае цікаўных. Але дзіва што!

Ледзь паспеў Эрпід пацвердзіць, што запісаў, як усчалася гамана: «Усіх-усіх запісаў?! А як запісаў, як прасвечваў? Гэтак, як рэнтген?» — «Калі рэнтгенаўскімі прамянямі, дык гэта ж шкодна!» — «І куды глядзяць настаўнікі?» — «Сынок, адыдзі ад гэтага жалезнага пудзіла, бо захварэеш!» — «Дачушка, ты ж у звярынец хацела, а гэта ўжо прыліпла, цацку знайшла?»

Калі дзеці ўбачылі, што на твары Эрпіда заміргалі лямпачкі, зноў сыпанулі пытаннямі: «Дзе ты браў дэталі для робата?» — «А я змагу такі зрабіць?» — «Ён на батарэйках ці можа падзараджацца токам, як акумулятар у аўтамабілі?» — «А чаго ён заміргаў, мо яму кепска стала?» — «У яго ўсярэдзіне магнітафон ці як ён гаворыць?»

Выручыў Эрпід:

— Будзеце знаць усё да канца, састарыцеся, як аўца.

Дружны выбух смеху, захопленыя выгукі: «Ну і шпарыць! Ну і чорт лазаты!» — «А ён гумарыст! Ваня, а ён у цябе з гумарам!» — «Як жывы!»

Ваня пашукаў у правых кішэнях, потым перакінуў Жучка пад другую руку, праверыў левыя кішэні ў штанах і пінжачку — нідзе ніводнай манеты!

— Эрпід, звярынец мы не можам агледзець: у кішэнях вецер свішча.

Эрпід патушыў лямпачкі.

— Інфармацыю не зразумеў. Вецер не можа ў кішэнях свістаць. А мо ты хочаш сказаць, што падраныя кішэні?

Дзеці зноў зарагаталі. Яны ўжо любілі Эрпіда і гатовы былі рагатаць нават з выстаўленага мезенца.

— Я хачу сказаць, што няма ні капейкі грошай, не зможам купіць уваходны білет, — растлумачыў Ваня.

— Мы дамо! Мы назбіраем! — загарэўся хлапчук з рабацiністым носам, палез у кішэню. — Во, пятак магу даць. Хто больш? — Ён склаў далоні каробачкай і затрос у іх манету.

У рукі яму са звонам пасыпаліся медзякі.

— Іван Аляксеевіч, я хачу сфатаграфаваць грошы. Я не разумею іх прызначэння, — сказаў Эрпід. — У нас грошай няма.

— Ты... як цябе зваць? Паднясі яму манеты да акуляра, хай пераздыме, — папрасіў Ваня.

— Грыша я, Грыша! — сказаў рабаціністы. — А пра што ён гаворыць? Дзе гэта ў іх няма грошай?

І не толькі рабы Грыша зацікавіўся словамі Эрпіда. Каб папярэдзіць новыя пытанні, Ваня паспяшаўся сказаць:

— Вы не вельмі звяртайце ўвагі на яго словы. У яго рэле перагарэла і адключаны трыццаць два блокі памяці, от і загаворваецца часам... Яму ўсё здаецца, што ён з другое планеты да нас прыляцеў... Кгы-км... — Ваню было ніякавата ад такое хлусні, і ён нахіліўся да самага твару Эрпіда. — А ты не звяртай увагі на мае словы. А то можа стацца, што з гэтага падарожжа не вернешся, — прашаптаў яму.

— Інфармацыю зразумеў, — кінуў Эрпід.

Рабаціністы Грыша быў пракідны, баявіты. Ён і ў касу палез без чаргі, і каля цёткі, што правярала білеты, падняў шурум-бурум:

— Таварыш кантралёр! Прашу арганізаваць праход! Прашу наладзіць парадак! На тэрыторыю звярынца праедзе Піпетка — Піянерская перасоўная тэлевізійная камера. Будзем здымаць кінажурнал.

— Ой, а я ж прычоску сёння не... Я ж не хадзіла ў цырульню! — перапалохалася кантралёрка.

— Таварыш кантралёр! Вы ж не дзікі звер, вас Піпетка толькі краёчкам аб'ектыва захопіць, — важна сказаў Грыша. — Дый без цырульні вы як артыстка кіно выглядаеце!

Цётка хутчэй шмарганула з боку на жывот сваю сумачку, дастала патрэбныя прычындалы і, углядаючыся ў люстэрачка, пачала падмалёўваць губы і бровы, даставаць з-пад шапачкі чубок валасоў на лоб.

— Калі ласка! Праходзьце, праязджайце! Здымайце кіно! — Яна адступіла з праходу ўбок, абедзвюма рукамі запрашаючы Эрпіда, і нават схілілася ў паклоне.

Эрпід важна, без паспеху праехаў цераз вузкі ўваход. За ім прайшоў Ваня, потым яшчэ некалькі хлапчукоў. Грыша стаяў ззаду і прыгаворваў:

— Прапускайце, прапускайце смялей! Гэта асістэнты... Гэй вы, рыхтуйце месца для здымкаў! А на некаторых ёсць білеты! — Трос ён дзвюма сіненькімі паперкамі, хоць хлапчукоў прайшло чалавек дзесяць.

— Калі ласка! — не пераставала запрашаць кантралёрка. — Здымайце кіно... Шкада, што Мішкі няма... Ён цыркач у нас, калісь у цырку выступаў ды састарэў, нам перадалі... Ага... Дык ён і танцаваў у клетцы, і цераз галаву куляўся, і лапу працягваў, каб цукерку далі... Шкада, уцёк сёння ноччу. Мы ўжо ўсю міліцыю на ногі паднялі. Прыязджалі з сабакам сляды нюхаць... Мядзведзь-то і свойскі, абучаны, але ж звер і ёсць звер. А звер на волі — гэта не жартачкі. — І раптам спахапілася: — А гэтыя — таксама асістэнты? Не?! Вашы білецікі папрашу! Бач ты, падшыванцы...

Выключныя арганізатарскія здольнасці былі ў Грышы. Ваня толькі падыходзіў памалу за Эрпідам ды пасміхаўся, пагладжваў Жучка, каб супакоіць: сабака нюхам чуў звяроў і нервова павіскваў, вырываўся.

— Дарогу, таварышы! Дарогу! — мітусіўся Грыша. — І клетак не засланяйце, дайце Піпетцы добры агляд!

Эрпід спыніўся быў каля першай клеткі, але тут жа старанна выгаварыў:

— Ракурс не той... Нізка... Звера па прозвішчу пантэра я кепска бачу.

— Нізка?! — усклікнуў Грыша. — Гэта мы мігам... штосьці прыдумаем. Хлопцы, я пазаўчора тут недзе насілкі бачыў... Расшукаць!

Некалькі яго сяброў кінуліся ў розныя бакі вялікага пляца-чатырохкутніка, абстаўленага вагончыкамі-клеткамі. Заглядвалі ў кожны куток, у кожную шчыліну, пад кожны вагончык. Урэшце прагучаў радасны крык: «Ё-ё-ёсць!»

Знайшлі насілкі каля клеткі з надпісам: «Мішка-артыст». Насілкамі, мабыць, не так даўно карысталіся службоўцы, прыбіраючы ў мядзведзя, бо хлапчукі пачалі рваць траву, адціраць ёю дашчаны памост насілак.

Жучок усё рваўся з рук, і Ваня сказаў:

— Пачакайце! Дайце сабаку добра панюхаць, — і паднёс яго да насілак. — След! Нюхаць!.. Мішку-мядзведзя нюхаць! — І Жучок нюхаў, нервова тузаючыся з рук, дыбячы на загрыўку шэрсць.

— Піпетка, ал-ле — оп! — скамандаваў Грыша Эрпіду, нібы якому мопсу ў цырку.

Ваня не бачыў, як Эрпід уз'язджаў на насілкі, яго з Жучком адціснулі ўбок. Пачуў толькі Эрпідаву рэпліку:

— Я — Эрпід, Электронны робат-паліглот ізаляванага дзеяння. Я не магу быць піпеткай.

— Ты не крыўдуй, лады? — чуўся голас Грышы. — У нас ва ўсіх мянушкі ёсць. Я — Рабы, Андрэй — Не дурэй, Сёмка — Цікі-Так, Жэнька — Чмых... І ніхто не крыўдуе! Весялей з мянушкамі!

Ваня ўбачыў, як чацвёра самых здаровых хлапчукоў падняліі насілкі на ўзровень сваіх плячэй і завохкалі ад цяжару. Насілкі схіснуліся, Эрпід зыбнуўся і ледзь не скуліўся пад ногі. Насілкі зноў апусцілі на дол.

— Па двое бярыцеся за кожную ручку! — распарадзіўся Рабы, але сам не ўзяўся і на гэты раз.

Насілкі паднялі ўжо не ўчатырох, а ўвасьмёх, прыладкавалі ручкі на плечы і гэтак панеслі ўздоўж рада клетак, спыняючыся каля кожнай. І каля кожнай клеткі Эрпід ветліва гаварыў: «Дзякуй шчыра... Валачыце, калі ласка, далей». І гэтая ветлівасць жалезнага чалавечка пацяшала ўсю світу: «Вой, паце-ха!» Дзеці ажно падскоквалі ад захаплення, а хто-ніхто і ў ладкі пляскаў: «Ай ды Піпетка-Эрпідзёнак!» Нібы Эрпід дзякаваў асабіста кожнаму з іх і нібы гэта ім купілі такую незвычайную цацку.

Абышлі насільшчыкі ўсе чатыры бакі звярынца, вярнуліся зноў да выхаду. Патрымалі трошкі насілкі так, каб Эрпід сфатаграфаваў цётку-кантралёрку. Невядома, ці здымаў яе Эрпід, але кантралёрка цвіла, як вясёлка ў небе, і рабіла добры-добры і ветлівы твар. Пяць хлапчукоў прашмыгнулі ў гэты час паўз яе на тэрыторыю звярынца.

Урэшце насілкі з Эрпідам асцярожна апусцілі на зямлю.

Ваня прабраўся да Эрпіда:

— Ты не забыў пра аб'ект нумар два?

— Не забыў. Курс — норд-вест... Аб'ект памалу рухаецца. Зусім памалу і ў наш бок. Аб'ект падае аварыйныя сігналы.

— Тады — уперад! — скамандаваў Ваня.

— Да пабачэння! — раскланялася цётка-кантралёрка. — Прыходзьце яшчэ, будзем вам заўсёды рады. А ў якім кінатэатры будуць ваш журнал паказваць?

— Ва ўсіх! — адказаў за Ваню Грыша Рабы.

За Эрпідам і Ванем вываліў са звярынца натоўп дзяцей.

— Хлопчыкі, а вы ж куды? Зараз звяроў будуць карміць, гэта ж так цікава! — У голасе цёткі была не-звычайная дабрыня. — Ах, вы не асістэнты? Тады назад не пушчу! — Уголасе яе адразу зазвінеў метал.

— Дзякуй за дапамогу, — пацiснуў Ваня руку Грышу. — І ўсім дзякуй! Да пабачэння! За намі не ідзіце, а то сарвяце важнае заданне навуковага цэнтра.

— Я хачу з табою сябраваць, чуеш? Дзе ты жывеш? Дай свой адрас! — крыкнуў услед Грыша.

— Калі ласка: вобласць сталічная, Менская, вёска Клінцы, Івану Гардзею. Пішы!

— Дык ты не мінчанін?! — зрабіўся кіслы твар у Грышы.

І чаго было гэтак моршчыцца? Быццам геніяльныя вынаходнікі Эрпідаў могуць жыць толькі ў сталіцах!

## 14

Праўду казаў дзядзька Мікалай, што будзе дождж. Напрарочылі яго асколкі: вунь ужо і сонца схава-лася, а край неба пачарнеў і разбух ад цяжкай вялізнай хмары. І на добрае, то трэба было б шукаць які прытулак, каб была страха над галавою. А Эрпід-адзін каціўся па дарожцы міма стадыёна проста да кола агляду, што ўзвышалася над краем лесапарку і ўсё яшчэ паволі кружылася. Жучок добра адпачыў у Вані на руках і цяпер смела гойсаў то ўправа, то ўлева ад дарожкі, рабіў уперадзе паўкруг і азіраўся, нібы чакаў ад Вані якога загаду. Сабака часта прынюхваўся да зямлі, задзіраў морду ўгору, лавіў носам вецер.

А з парку ўжо спяшаліся людзі — мамы і бабулі вялі малых, а зусім маладыя мамы калілі перад сабою рознакаляровыя каляскі — многа калясак траплялася. Эрпід не спыняўся каля іх, толькі паварочваў тулава так, каб акуляр хоць на імгненне глянуў на іх, і каціў далей. Ваня ішоў ззаду і толькі грaзіў пальцам хлапчукам, калі тыя растапырвалі рукі, заступалі дарогу Эрпіду, нібы хацелі пераняць аблудную авечку. І дзеці неахвотна адступалі ўбок, уздыхалі: гэткая незвычайная цацка, а пагуляць не даюць. Адзін раздураны малы ажно нагамі затупаў, хацеў на зямлю сесці, патрабуючы сабе Эрпіда. Але каля яго спыніўся Жучок і сказаў: «Р-р-р!» Малы адразу акругліў вочы ад крыку: «Ма-а-ма!!!»

— Гэта чорт ведае што! — залямантавала яго мама. — Параспускалі сабак без намордніkaў! Мілі-і-іцыя-я!

— Вы лепш свайго капрызу глядзіце, то і міліцыя не спатрэбіцца, — адрэзаў Ваня.

Жучок узрадаваўся, што яго апраўдалі, пабег трушком перад Эрпідам, задзёршы хвост на спіну.

— Света, глядзі! Яшчэ адзін едзе, серабрысты! А ў Танькі жоўты... І ледзь поўзае на руках і нагах! — Гэта спыніліся, праводзячы паглядамі Эрпіда і Ваню, дзве дзяўчынкі ў чырвоных гальштуках. —

Пабеглі ёй скажам! — сыпала адна, як гарохам.
— Ёй і таго хапае, — адказала другая, больш разважлівая. — І з тым не ведае, што рабіць. Лепш дадому пабеглі, а то дождж скора лупцане!
— Пачакайце! — гукнуў ім Ваня. — Дзе вы бачылі яшчэ аднаго такога? Мы згубілі яго, шукаем.
— Там! Там! — Замахала першая дзяўчынка, паказваючы на дарожку, што адыходзіла ўправа.
Яе, мабыць, пачуў і Эрпід-адзін, бо звярнуў туды сам.
Зусім блізка злева праглядвалася вуліца з трамвайнай лініяй. Унізе за дрэвамі мільгалі жоўта-вішнёвыя трамваі, чуваць быў грукат колаў і часам званкі. Там паволі рухалася і жоўта-сіняя міліцэйская машына з рупарам і крычала ўрасцяжку тоўстым голасам:
— Мінчане і госці сталіцы! Будзьце асцярожныя і пільныя! Не пакідайце без нагляду дзяцей! А лепш за ўсё разыходзьцеся па дамах. Сёння ноччу са звярынца ўцёк мядзведзь. Магчыма, што ён хаваецца ў раёне лесапарку. Мішка лёгка ідзе на кантакт з людзьмі... Не паддавайцеся яго абаяльнасці! Звер можа быць вельмі небяспечным! Пры выяўленні мядзведзя адразу заяўляйце міліцыі або пошукавым групам таварыства паляўнічых і рыбаловаў. Паўтараю... Мінчане і госці сталіцы! Са звярынца ўцёк мядзведзь! Будзьце асцярожныя і пільныя! Не падыходзьце блізка да звера!
Дарэмна, ой дарэмна міліцыя такое аб'явіла! Шукала б паціху мядзведзя, каб і людзі не ведалі.
У парку паднялася паніка. Маладыя мамы ледзь каляскі не паперакульвалі, уцякаючы. А хто хапаў дзяцей пад пахі, бег, задыхаючыся, хто валачыў малых за ручаняты, і тыя ледзь па паветры не ляцелі, падкурчыўшы ногі.
Ваня, павярнуўшы на дарожку ўслед за Эрпідам, убачыў, што насустрач ім спалохана тупаціць, але больш на месцы, чым бяжыць, цыбатая дзяўчынка. У адной руцэ ў яе матляецца на доўгай почапцы сумачка, другою яна нервова патузвае за вяровачку. Гэтак бывае, калі вось такія нецярплівыя выводзяць на прагулку сабачку, а той кідаецца да кожнага дрэва ці кусціка, хоча яго абнюхаць. Але ж у яе на павадку быў не сабачка, а Эрпід! Той самы Эрпід-два! Акурат гэтакі, як і Эрпід-адзін, толькі жоўты... І не на гусеніцах ён каціў — правільна гаварылі дзяўчынкі, — няўклюдна поўз на ўсіх чатырох. Поўз на сваіх слабенькіх ручках і ножках і хістаўся, штосьці мармытаў ці стагнаў.
— Варвар! — пагрозліва рвануўся да яе Ваня. — Варварыха! — не мог падабраць ён больш зняважлівага слова.
Жучок падскочыў і з гырчаннем учапіўся ёй у сукенку, затузаў. Тр-р-р... Адарваў кавалак.
— Ой, адбарані! Ой, я маме скажу! — енчыла Танька.
— Хопіць, Жучок! — крыкнуў Ваня, і той неахвотна адбег убок, аблізнуўся.
— Ой, а што мне мама скажа! — завяла дзяўчынка новую песню. Яна спрабавала прыкласці на месца вырваны кавалачак і ўсё прыгладжвала яго далонню.
— Скажа, што дурніца! — Ваня сядзеў на кукішках каля жоўтага Эрпіда, разматваў з яго шыі вяровачку. А гэта было не так проста: вяровачка была моцная, ад скакалкі, і заехала ў шчыліну паміж галавою і тулавам, заклініла так, што бедны Эрпід-два не мог ні павярнуць галавы, ні пакруціць ёю. — Не цяміш нічога ў гэтай справе, дык і не лезь... Такую дарагую канструкцыю сапсавала! Чужую!
Давялося Ваню і кіпці ў ход пускаць, і зубы, і цуркі, а потым знайшоў нейкі кавалачак дроту і ўсё-такі дастаў з пазашчыліны ўсю растрэпаную вяроўку. Паставіў жоўтага на ногі, паляпаў па плячы: «Трымайся, брат!» — і адступіў убок, даючы месца Эрпіду-адзін. І вось Эрпіды ўжо стаяць тварам у твар, пераміргваюцца лямпачкамі і маўчаць. Мабыць, такім спосабам перагаворваюцца паміж сабою.
— А ты ідзі, мы цябе не трымаем, — сказаў Ваня дзяўчынцы. — Гэты робат наш, мы яго паўдня шукаем.
Але Танька і з месца не скранулася, толькі крыўдліва падціснула губы.
— Падумаеш, механік знайшоўся! Адкуль мне было ведаць, што гэта за цацка? Я выйшла на двор, а ён сядзіць на клумбе, гаўкае. Думала, які сабака кветкі ломіць, схапіла дубец... А потым гляджу — дзіва! Жалязяка з ручкамі і ножкамі... і брэша па-сабачы!
— Я тады з сабакам размаўляў, ён толькі што прабег... — раптам сказаў Эрпід-два.
— Ой?! — Танька не паверыла сваім вушам, нават аглянулася па баках: хто гэта гаворыць? — Ага-а... Дык я крычу: «Чый гэта? Чый гэта?» Ніхто не адказвае. Вось я і павяла яго...
— Павяла, павяла... Каб самую так вадзілі... Ён жа зусім не прыстасаваны хадзіць! Няхай бы ў бюро знаходак здала ці ў міліцыю... — сказаў Ваня і ляпнуў сабе па лбе: «Здурэў! Здала б, тады ўспамінай, як звалі». — Гэта з Акадэміі навук электронныя робаты. Іх выпусцілі на самастойную разведку... пад наглядам юных тэхнікаў... — Пастукаў Ваня сябе ў грудзі і закашляўся. Столькі даводзіцца хлусіць! Іншы раз на цэлы месяц гэтай хлусні хапіла б, а тут трэба выпаліць за некалькі гадзін. — Во гэты можа гаварыць на ўсіх мовах, а гэты... Усіх жывёл і звяроў разумее, нават пра што дрэвы гавораць.

— Выдумля-яй больш... — недаверліва працягнула дзяўчынка. — Мяне Таня зваць, а цябе?

— Ведаю. А мяне — Ваня... Эрпід-адзін, дакладвай, што ўдалося даведацца.

— У Эрпіда-два энергіі засталося крыху больш, чым на зваротную дарогу. Каб трохі, то і зусім перагарэў бы ад дарэмнага напружання. Та-ам ужо пра ўсё ведаюць, я далажыў, заданні яму амаль усе адмянілі.

Пакуль Эрпід-адзін гаварыў гэта, Таня часта-часта патузвала галавою, нібы зганяла з носа муху. А вочы ад здзіўлення расплюшчвала ўсё шырэй і шырэй. Тым часам і Эрпід-два выпусціў спадыспаду такія самыя гусеніцы, як і серабрысты, а ручкі і ножкі склаў і прытуліў да тулава. Загаварыў:

— Гэтае нізкае дрэва-куст з чырвонымі ягадамі стогне і задыхаецца. Яно не любіць вунь тое дрэва з шырокімі лістамі... — павярнуўся жоўты да ліпы.

— Воўчы бэз не любіць лі-іпы?! — Ваня быў вельмі ўражаны. — А па выгляду не пазнаеш, і ягад вунь колькі...

— Каб гэты бэз не быў атручаны ліпаю, то ягад меў бы ў пяць разоў больш, — сказаў Эрпід-два.

— Ліпе ж таксама бэз не падабаецца, а лісце вунь якое лапушыстае і зялёнае, хоць і восень, — сказаў Ваня.

— Не так. Пах бэзу ліпе падабаецца, яна ўсміхаецца ад прыемнасці, — сказаў жоўты.

— Любоў без узаемнасці, — падала голас Таня. — Такое бывае, — дадала яна аўтарытэтна.

— Я прааналізаваў ужо стан навакольных дрэў. Многія, асабліва тыя, што з іголкамі, трасуцца ў ліхаманцы, у іх павышаная тэмпература... Яны задыхаюцца, але не так з-за суседзяў, як з-за кепскага саставу паветра.

Што задыхаюцца, то мо і праўда: заводы кругом. Вунь у сасны ўжо тырчыць замест вяршка нейкая сухая рагулька. І вунь, і вунь... А вунь тая зусім ссохла, усе шыпулькі абсыпаліся... Ваня пераводзіў позірк з дрэва на дрэва і раптам улавіў на нос вялікую дажджавую кроплю.

— Палу-ундра! — закрычаў ён, як бывалы матрос. — Трэба хавацца, а то паржавееце!

— Мы не ржавеем, — у адзін голас сказалі Эрпіды. А серабрысты дабавіў: — Навальніца для нас карысная, мы ловім з паветра электрычнасць, падзараджаемся.

— А ты чаго тут кіснеш? Марш дадому! — Ваня зноў накрычаў на Таньку.

— Ванечка, можна я з вамі пабуду? — жаласліва папрасілася яна. — Тут так цікава, а дома пасадзяць гамы развучваць.

— Ы-ых... — уздыхнуў Ваня і махнуў рукою. Не любіў ён дзяўчынак, а тым больш такіх, што мучаць Эрпідаў. — А дзе ж мой Жучок? Хаця б не згубіўся... Фю, фю, фю-ю! — пасвістаў ён.

Здалёк, недзе з-за трамвайных ліній, даляцеў ледзь чутны голас Жучка. Яго брэх быў падобны на яхканне, але не такое, як гоніць зайца, а больш хрыплае — нібы ўскрыкі з перапуду.

— Сабака Жучок гаворыць, што напаў на след вялікага звера: «Ах, вялікі! Ах, вялікі!» Просіць, каб ішлі да яго на дапамогу, — сказаў Эрпід-два.

— Мядзведзь?! Мішка?! — у адзін голас усклікнулі Ваня і Таня.

— Сабака Жучок гаворыць: «Ах, вялікі! Пахне гэтаксама, як насілкі ў звярынцы», — дадаў Эрпід-два.

— Пабеглі! Хутчэй! — Ваня не ведаў, што зрабіць, каб Эрпіды рухаліся хутчэй.

— Што ты! Міліцыя сказала, каб да мядзведзя не падыходзілі! І я цябе не пушчу! — закрычала Танька голасам гаспадыні ў хаце.

— Мала кашы ела. Ды я цябе і не заву — бяжы барабаніць свае гамы!

— Інфармацыю не зразумеў, — сказаў Эрпід-адзін. — Таня галодная? — Ён журчаў навыперадкі з Эрпідам-два, следам за Ванем. А той бег наперадзе, выглядаючы, дзе знайсці лепшы спуск на вуліцу.

— Не пакідайце мяне адну, я баюся! — бегла і Таня.

— Сюды! — знайшоў Ваня заасфальтаваны спуск-дарожку і выставіў рукі, каб падтрымаць Эрпіда-адзін. А Эрпіда-два падстрахавала Таня.

А калі перабіраліся цераз рэйкі, дык Ваня нават трамваям сігналіў рукамі, каб прытармазілі, далі пераехаць Эрпідам.

Па другі бок вуліцы лес яшчэ больш быў падобны на сапраўдны. Добра чуваць было, як ляскалі па кляновым лісці абсадаў буйныя дажджавыя кроплі. Цёмныя яліны курыліся туманам.

— Бу-бу-бу-бу... Гах-дах-дух! — сварыўся гром, бегаючы над лесам. У гэтых раскатах голас сабакі зусім згубіўся. Уз'ехаўшы на дарожку па другі бок вуліцы, усе пасталі, прыслухоўваючыся. Ваня нават далоні прыстаўляў да вушэй — не памагала. Прапаў сабака...

— Дык на чым ты іграеш? — спытаў у Тані, але прыслухоўвацца да лясных галасоў не перастаў.

— Я на скрыпцы пачынала... Потым перавялася ў клас цымбал, — адказала яна.

— Ну і як... цымбаліш трохі? — Ваня не пераставаў круціць галавою.

— Тата кажа, што мне на ўдарніка... на ўдарніцу лепш вучыцца.
— На ўдарніка не вучацца. Гэтае званне прысвойваецца таму, хто добра працуе. Мой бацька, напрыклад, ударнік.
— Не-а, я не на такога... Таго, што ў аркестры барабаніць.
— Ха-ха-ха! — не вытрываў Ваня.
— Чаго ты рагочаш? — Таня ніколькі не пакрыўдзілася. — «У джазе адны дзяўчаты», кіно нават такое ёсць. Там на ўсіх музычных інструментах дзяўчаты іграюць, нават на барабанах.
— Ну, ну... Старайся... — падахвоціў Ваня, а ўсмешка так і не сыходзіла з яго твару.
— Я чую Жучка. Курс — норд-вест... — сказаў Эрпід-адзін.
— І я чую, — дабавіў жоўты. — Скардзіцца, чаму доўга не ідзём, і яму аднаму даводзіцца трымаць звера... пад дажджом.
— Дык жа ў той бок гушчар непралазны! І мне цяжка прабрацца, не толькі вам!
Аднекуль насоўваўся густы, нібы кружылі ў рэшаце гарох, шум.
— Ма-ама! — усклікнула Таня і першая сiганула пад густую яліну. А на Ваню і Эрпідаў абрушыўся навальны дождж.
— Сюды! Сюды! Ды хутчэй жа вы! — пакуль памог Ваня забрацца пад яліну Эрпідам, вымак да ніткі.
— Прастудзішся, дурненькі... — пашкадавала яго Таня. Ваню і гэта не спадабалася: «Ну чаго яна лезе? Што ёй да мяне?»
— Дык, значыць, табе барабаны купяць, як таму зайцу? — зноў пачаў насміхацца над дзяўчынкаю. — Чаму ты не можаш рашуча сказаць маме, што табе мядзведзь наступіў на вуха? Каб не мучылі...
— Ну што ты! У мяне вялікія музычныя здольнасці, мама кажа.
— Мама... А выкладчыца музыкі?
— А тая толькі ўздыхае ды нейкія таблеткі смокча. «Зрухі ёсць...» — кажа.
— Інфармацыю не зразумеў... — прамармытаў Эрпід-адзін. — Калі Тані мядзведзь наступіў на вуха? Як гэта здарылася — яна спала ў лесе? Мядзведзя таксама звалі Мішка?
— Эрпід, я табе потым усё растлумачу, — сказаў Ваня.
— Дарэмна траціцца час, тлумач зараз. Я запісаў ужо дождж, зрабіў аналіз вады і ступень электрызацыі паветра, дзесяць разоў запісаў Таню. Мне няма чаго рабіць.
— Скажу... У яе няма музычнага слыху. Ты толькі не крыўдуй, Таня, добра?
— Я гэта ўжо ведаю. Толькі мама не хоча ведаць, — уздыхнула дзяўчынка. — Ад гэтых гам мне хочацца ў цёмны лес, у тайгу ўцячы.
— Эрпід, лепш ты скажы, як гэта ў вас ловяць электрычнасць.
— У нас таксама электрычныя заводы ёсць. Яны ловяць з хмар электрычнасць, запасаюць на складах шаравыя маланкі. А потым размотваюць іх, як клубок нітак.
— Дык вам ні вугаль, ні нафта не трэба на паліва? І гідраэлектрастанцый няма?
— Няма.
— Здо-орава! Галавастыя вашы вучоныя.
— Шаравыя маланкі ўзрываюцца! Яны і чалавека могуць забіць, і разбурэнні ўсякія зрабіць, і падпаліць, — сказала Таня.
— Нашы вучоныя... — пачаў тлумачыць Эрпід і раптам змоўк, замiргалі чырвоная і зялёная лямпачкі.
— Што, сеанс сувязі? — папытаў Ваня. Але Эрпід-адзін яшчэ крыху памаўчаў, потым сказаў:
— Расказваць забаронена. Размагнічана яшчэ шаснаццаць блокаў памяці.
— Дык што ж гэта выходзіць!.. Вы ў нас запісваеце ўсё, што толькі захочацца, а нам нічога не расказваеце? Хочаце вакол пальца абвесці? Дык што ж гэта за дружба такая: мы табе ўсё, а ты нам кукіш? — абурыўся Ваня не на жарты. «Не, яны ўсё-такі шпіёны... Чэрці б іх пабралі...» — падумаў ён.
— Іван Аляксеевіч Гардзей... Чэрці нас не могуць пабраць. І мы не шпіёны, мы прыляцелі з візітам дружбы. Атрыманыя звесткі мы не скарыстаем на шкоду вам...
— Ты не дзівіся, гэта ён на мае думкі адказвае, — патлумачыў Тані хлопчык.
А Эрпід, скончыўшы апраўдвацца, папытаў:
— А як гэта — абвесці вакол пальца?
Давялося тлумачыць. А дождж усё ішоў...

## 15

Калі ў лесапарку ўрэшце пасвятлела, а потым нават і сонца выбліснула, усе ўздыхнулі з палёгкаю. Усюды яшчэ віселі велізарныя, з іскаркамі ўсярэдзіне кроплі, і вылазіць не хацелася — пад ялінаю было суха. Ваня ўсё-такі рашуча ўстаў, замахаў рукамі, як баксёр, падрындаваў на месцы, паляпаў сябе дало-

нямі па плячах. Зачапіў лапку, і з яе сыпанула жменя кропель — якраз Тані за каўнер. Тая ўскочыла і страсянула яшчэ большую галіну, каб трапіла і на Ваню. Але той паспеў адскочыць.

— Значыць, так... Часу ў нас засталося зусім мала. Усім да Жучка і мядзведзя ўсё-такі ісці не трэба, а то будзе многа марокі, — пачаў разважаць ён. — Эрпід-два, ты чуеш сабаку?

— Жучок пачынае плакаць. Ён разгубіўся, не ведае, што рабіць: бегчы шукаць вас ці вартаваць мядзведзя. Баіцца, што дождж змыў вашы сляды і цяжка будзе адшукаць Ваню. Пытае, чаму не цікавіцеся такім зверам, такою дзічынаю.

— А мядзведзь маўчыць? Церпіць каля сябе сабачае скуголенне і нічога не робіць?

— Ляжыць мядзведзь, стогне: «Ой, адстань ад мяне, назола! Ой, і без цябе моташна...» Ён узмоцнена выпраменьвае цяпло.

— У яго тэмпература? Захварэў, мабыць... Колькі да яго метраў?

Адказаў Эрпід-адзін:

— Сто шэсцьдзесят пяць.

— Таня, загадваю: застаўся з Эрпідам-адзін тут. А з жоўтым я пабягу туды.

— А-а, хітранькі... А як за гэты час мядзведзь кругом-кругом ды сюды прыбяжыць? Хто нас адбароніць ад яго?

Узбунтаваўся і серабрысты.

— Я змагу дадаткова набыць шмат інфармацыі. Эрпід-два ўсё не зможа зрабіць. Я еду з Ванем.

— Завялі валынку... Я цябе не прымушаў заставацца з намі, магла ісці барабаніць у свае барабаны. А то нешта многа ў цябе мух у носе, — Ваня знарок гаварыў толькі да Тані, Эрпіда не чапаў.

Эрпід-адзін:

— Інфармацыю не зразумеў. Можна папытаць у Тані? Чаму яна трымае мух у носе? Яны не замінаюць ёй, не казычуць?

Зарагаталі і Ваня, і Таня.

— Ну добра... Памагай Эрпідам, я ўперад пабягу разведаць дарогу. А ў шаснаццаць нам трэба быць на калгасным рынку!

Ці бачылі вы калі-небудзь, як ідзе парусная лодка супраць ветру? Амаль супраць ветру... Лодка ідзе то правым, то левым галсам, гэта значыць, то правей, то лявей таго напрамку, з якога дзьме вецер. Увесь фокус у тым, як паставіць ветразі!

Гэтак рухаліся і нашы спадарожнікі. Такіх сцежак, каб вялі якраз у напрамку да мядзведзя, не было. Былі такія, што вялі то правей, то лявей. Эрпід-адзін кожную хвіліну-другую дакладваў, куды яны адхіляюцца і колькі засталося да аб'екта. Таня ўжо засаплася, выбаўляючы то аднаго, то другога Эрпіда з травы і зелля, адхіляючы галіны, абводзячы робатаў вакол вялікіх лужын. А пазапырскваліся Эрпіды! Па самыя вушы-антэны...

— Да аб'екта дваццаць сем метраў... Дваццаць чатыры... — далажыў ззаду хрыпатым голасам Эрпід-адзін.

— Глядзіце, веласіпед «Арлёнак»! — усклікнуў у гэты час Ваня.

І праўда, упоперак сцежкі-дарожкі ляжаў бліскучы, увесь у кроплях дажджу веласіпед.

Пакуль усе сабраліся каля Вані, ён і веласіпед падняў і завернуты ўбок руль паставіў на месца. Паспрабаваў і скінуты ланцуг начапіць на зорачку-зубчатку, але толькі рукі перапэцкаў у мазут.

— Чаго ён тут ляжыць у дождж? Гэй, хто тут ёсць? — закруціўся Ваня на месцы. — Хто адцураўся веліка?

У адказ не хлапчукоўскі голас пачуўся, а радасны віск і брэх Жучка.

— Тут яны! Блізка! — зарадавалася Таня і хацела ўжо рынуцца ў мокрую чашчобу і буралом.

— Стой! Расхрабрылася вельмі! — спыніў яе Ваня.

Эрпід-два далажыў:

— Сабака скача з радасці. Пытаецца: «Стаяць тут ці выганяць звера на Ваню?»

— Скажы, каб стаяў на месцы, чакаў. І мядзведзю скажы, што мы з дабром да яго, хочам памагчы... Спытай, што баліць.

— Дзевяць метраў да аб'екта мядзведзь... Сем з паловай метраў да аб'екта сабака, — уклініўся са сваімі дадзенымі Эрпід-адзін.

Такога «канцэрта» Ваня і Таня яшчэ не чулі. Спачатку Эрпід-два забрахаў з падвывамі, потым пакруціў трохі галавою і зароў па-мядзведжы, перайшоў на мармытанне, крэкт, вуркатанне. Хацелася і смяяцца, слухаючы яго, а часам і мароз па скуры прабягаў. Ведалі, што гэта Эрпід-два так падрабляе галасы, і ўсё роўна не верылася. Ну й мастак, ну й спец!

— Можна падыходзіць, ён не будзе ўцякаць. І нападаць не будзе. У яго, мабыць, зломана задняя лапа:

ушчаміў, падаючы з веласіпеда, — перайшоў Эрпід-два на чалавечы голас.

— Як... з веласіпеда?! — усклікнулі Ваня і Таня. — Пры чым тут веласіпед?

— А так, з веласіпеда... Мармыча, просіць падысці, паглядзець.

— Ваня, не слухай яго! — перапужалася Таня. — Мядзведзь зусім мала мармыча, а жоўты гаворыць многа. Выдумляе абы-што, а ты верыш, лезеш яму ў лапы.

Эрпід-два не знайшоў, што сказаць. Мо пакрыўдзіўся? Сказаў серабрысты:

— Вы забываеце, што мы не толькі голас чуем, але і ўлоўліваем думкі, вобразы, што з'яўляюцца ў вашых мазгах. У звяроў асабліва, бо ў іх гукаў мовы мала, амаль усё трэба расшыфроўваць.

Ваня ўсё-такі памарудзіў лезці ў гушчар.

— Скажы Мішку, хай сам вылазіць сюды, хоць на трох лапах. Бо ты ж не можаш у гушчар залезці, а без цябе я не дамоўлюся з ім, — звярнуўся да жоўтага.

І Эрпід-два рыкнуў — гартанна, нібы алень выклікаў на паядынак другога. Штосьці падобнае Ваня чуў і бачыў па тэлевізары.

У чашчобе затрашчала ламачча, і адразу шалёна забрахаў Жучок. Сабака, мабыць, падумаў, што мядзведзь хоча даць дзёру.

— Жучок, ціха! Ідзі сюды! — прыкрыкнуў Ваня.

Сабака неахвотна адскочыў з дарогі мядзведзя, абурана падзяўкаў, віскнуў. А Мішка выкульгаў на сцежку — здаравенны, па самую шыю Ваню (Таня адразу адбеглася за Эрпідаў, ухапіла ў руку ламачыну). Галаву мядзведзь трымаў унурана, паглядваў на Ваню як бы спадылба. Вочы яго былі невялікія, круглыя і цёмныя, сумна-панурыя. Мішка не вельмі вымак, але там, дзе шэрсць намокла, цямнеліся плямы. Затое Жучок выбег, што з рэчкі выцягнуты. Поўсць папрыліпала, мордачка зрабілася маленькая, незнаёмая. Ён дробненька ўздрыгваў усім целам, павісквaў і чамусьці вінавата віляў хвастом.

Мядзведзь адразу лёг на жывот, галаву паклаў на пярэднія лапы, заплюскаў вочкамі, чакаючы. Жучок пасмялеў, забег за Ваню і так страпянуўся, што ў бакі веерам паляцелі пыркі. І адразу стаў больш калматы. Сеў на хвост і стомлена, на ўвесь рот пазяхнуў, аблізнуўшы сам сабе нос.

— Скажы мядзведзю, хай на бок ляжа, — сказаў Ваня, і Эрпід-два штосьці мрукнуў Мішку.

Той лёг на правы бок, хворая лапа апынулася зверху. Задняя левая...

Ваня прысеў на кукішкі, пачаў абмацваць так, як вучыў дзед Гардзей. Ух, і кіпцюры ж у мядзведзя! Чорныя, крывыя і мо па сантыметраў дзесяць... А спадыспаду лапа ў жоўтых мазалях-натопках, па абрысу ступак вельмі нагадвае чалавечы.

Мядзведзь стрымана выдыхаў паветра, стагнаў цярпліва. А Ваня нічога не вымацаў. Не было такіх пераломаў, каб ажно костка тырчала з-пад шкуры, выпіналася. Хутчэй за ўсё трэснула адна з касцей у ступаку. Баліць, вядома, вельмі баліць, але ж добра, што нічога з месца не зрушана і адкрытага пералому няма.

— Пры пераломах у лубкі бяруць тое месца ці ў гіпс. А дзе мы возьмем што? Каб хоць які кавалак дошкі знайсці... — раздумваў уголас Ваня. І, мабыць, жоўты ўсё гэта перамармытаў мядзведзю, бо Мішка гаротліва ўздыхнуў і штосьці мармытнуў-прастагнаў у адказ.

— Мішка гаруе, што так няўдала скончыліся яго ўцёкі на волю, — растлумачыў Эрпід-два. — Але, кажа, хоць на трох лапах буду кульгаць, а назад у клетку не вярнуся.

— Ну і дурны, скажы яму... Што ён цяпер знойдзе ў лесе, калі і ўдасца выбрацца за горад? — Ваня выцягнуў са штаноў папружку. — Таня, вунь сасна ўсохлая, кара плітамі паадвальвалася. Вазьмі два велікаватыя жалабкі, будзем увязваць лапу... Эрпід, а ты папытай у мядзведзя, дзе ён нарадзіўся — у лесе ці ў цырку. Калі ў цырку, то ён увогуле не прыстасаваны да жыцця на волі, у лесе.

— Ты скажы яму, што міліцыя і паляўнічыя яго шукаюць! — выкрыкнула Таня здалёк.

Эрпід-два папытаў, і Мішка ў адказ усхвалявана задыхаў, потым сеў на заднія лапы, а пярэднімі засукаў перад сабою, задраў морду ўгору і зароў: «Ой, о-оў, о-о-э-э!» Потым заціснуў лапамі вушы, пацёр вочы...

*Першы расказ мядзведзя, перакладзены на чалавечую мову Эрпідам-два*

— Усе крычаць: «Мішка, Мішка!» А мяне мама Мумрык звала. О, як даўно-о гэта было-о-о... Я ледзь памятаю той час. Але як сёння бачу: вылезлі мы першы раз з бярлогі, з-пад яліны-вываратня. Такая віднага кругом, такія пахі адусюль! Лісцікі маладзенькія, смачныя — лоп-лоп-лоп... Птушкі ў даганялкі гуляюць, шчабечуць... А мы ідзём з мамай на сонечную палянку, да бурлівай рэчкі. Ах, якое цёплае і ласкавае сонейка на нас свяціла, лашчыла сваімі праменямі! Не паспеў я падурэць з Шумрыкам... Гэтак браціка майго звалі... Не паспелі набегацца, як маці пазаганяла нас у халодную ваду. Мы пішчаць,

уцякаць, а яна схопіць зубамі за шкірку і — бабоўць з галавою! А тады другога — бабоўць! Потым мы бегалі мокрыя па паляне, асцепваліся, сушыліся, дужаліся, дурэлі... Шумрык мне вуха пракусіў, а я яму нос абадраў. Мама памірыла нас, дала аплявуху аднаму і другому. Не моцна, усяго да вечара звінела ў вушах. І сказала тады: «Фізкультурнічайце, гэта добра... Але не калечце адзін аднаго!»

Амаль кожны дзень мы прыходзілі на тую паляну... Жавалі лісцікі, карэньчыкі, высмоктвалі з травы смачныя ягады, успорвалі чмяліныя гнёзды, грэлі на сонцы жываты і спінкі... Мама часта пакідала нас там, а сама перабіралася на той бок рэчкі, ішла на вялікае паляванне. Бывала, што з гэтага палявання і мяса нам прыносіла... Мы добра навучыліся лазіць па дрэвах. Умудраліся нават на тоненькія забірацца і гушкацца. Раз гушкаліся — «Ух-ха-ха! Ох-хо-хо!», глянулі ўніз, а пад дрэвам нейкія звяры на дзвюх нагах стаяць, шкура на іх складкамі вісіць. Мы яшчэ не ведалі, што гэта былі людзі, але здагадаліся адразу: мама не раз гаварыла пра іх. І яшчэ: у тайзе трэба баяцца ўсіх, хто большы за цябе. Пакуль не вырасцем... А людзей трэба асцерагацца і тады, калі павырастаем вялікія. Гэтыя людзі адразу стрэслі Шумрыка, а мяне не стрэслі. Дасталі штосьці бліскучае і — гах! гах! — застукалі па дрэве. І я паляцеў разам з дрэвам на зямлю. Завязалі нам на шыі раменьчыкі і павялі. Я спачатку вырываўся, але раменьчык душыў шыю, ажно ў вачах бліскала, і я перастаў.

Нас засадзілі ў вялізную жалезную скрыню з галінамі-крыламі зверху. Потым штосьці зараўло, наша жалезная скрыня тузанулася і дробненька задрыжала. «Ляцім!» — сказаў хтосьці з людзей. Я тады не разумеў, што ляцець можна і гэтак, бо я раз ляцеў потырч з дрэва, дык гэта было зусім не тое, і было балюча. Тады мне мама яшчэ і па патыліцы лапаю трэснула: «Калі што робіш, то думай, чым скончыцца». І як дрэўца ссеклі, таксама ляцеў, толькі ніхто па патыліцы не біў.

Потым мы яшчэ і ў поездзе ехалі, і ў машыне. Столькі было незнаёмых нясмачных машынных пахаў — галава кружылася. А нас усё везлі...

Пасялілі нас у падвале цырка, у адной клетцы было нас пяцёра. Жэрці нам давалі ўсяго ўсякага, але самае смачнае, самыя ласункі толькі тады, калі мы рабілі штосьці так, як прымушалі нас людзі. Дрэсіраваў нас здаровы дзядзька Валянцін. За якое непаслушэнства ці правіннасць, бывала, возьме за шкірку адною рукою аднаго, другою другога і як страсяне! Нават мама не магла нас трэсці адразу дваіх...

Ах, якія мы былі тады дурныя! Каб зарабіць больш цукру ці цукерак, мы так стараліся, ледзь са шкуры не вылузваліся. Сонца мы даўно ўжо не бачылі, а толькі ўсякія агні, лямпачкі. Часам ледзь не задыхаліся ў сваім падвале: столькі было там розных пахаў. А пахі тайгі, матчын пах я толькі сніў.

Трох самых здольных малых, у тым ліку і мяне, пачалі выпускаць у ярка асветлены круг. Наўкол таго круга сядзелі ў прыцемку вялікія і малыя людзі — многа людзей! — яны пляскалі рука аб руку і крычалі «ха-ха-ха!», калі што-небудзь у нас асабліва добра выходзіла. На мяне начаплялі доўгую спадніцу, да вушэй прывязвалі бліскучыя кольцы, і я танцаваў пад музыку. Мяне абувалі ў кеды, надзявалі на мяне трусікі, і я падскокваў і рабіў сальта на батуце, потым куляўся на брусах і гушкаўся на кольцах. Кольцы з-пад лап стараліся разбегчыся, і мяне ледзь не раздзірала. І гэтак было па некалькі разоў на дзень — і на рэпетыцыях, і на выступленнях.

Колькі часу прайшло, не магу сказаць, зіма і лета мяняліся некалькі разоў... Я даўно стаў дарослым мядзведзем. Мяне вучылі рабіць усё новыя нумары: вывозіць на арэну ў вазку-калясцы малога поні. А той сядзеў на хвасце, як сабака, і махаў на мяне прывязанай да пярэдняй нагі пугаю. Вывозіў я і самога Валянціна. Раз'язджаў я на веласіпедзе, на матацыкле, нават ехаў раз па вуліцах горада, а мяне здымалі ў кіно...

А сны пра волю не пакідалі мяне. Яны сніліся ўсё часцей і часцей, воля здавалася мне мілей за ўсё. Я нудзіўся і задумваўся над сваім жыццём усё больш і больш. На арэне я капрызнічаў, перастаў рабіць тое, што ад мяне патрабавалі. Валянцін сілком засоўваў мне ў рот цукеркі, а я выплёўваў іх — балелі зубы. Я ляжаў і сумаваў цэлымі днямі. Да мяне прыводзілі і чалавека ў белым халаце, які нясмачна пахнуў лякарствамі. Гэта ён знайшоў у мяне зубную хваробу, і таму ўсе парашылі, што я капрызнічаю ад зубоў. А мне хацелася волі, волі! Мне лячылі зубы, давалі больш зеляніны, яблык, вітамінаў, па цэлай бутэлечцы смачнага рыбінага тлушчу. А я ўсё роўна бунтаваў, праўда, ціха, не гэтак, як мой сусед тыгр Бенгал. Той два разы нападаў на Валянціна, распаласаваў яму руку, не падпускаў да сябе блізка. Чалавек у белым халаце «ўсыпіў» тыгра. Я спачатку не зразумеў гэтага слова, толькі тады скеміў, як ад тыгра пайшоў пах мёртвага цела. Мы, мядзведзі, адразу ўлоўліваем гэты пах... Я не хацеў, каб і мяне «ўсыпілі», і зноў пачаў трохі што рабіць. Але не так ахвотна, з подбрыкам, як таго патрабаваў Валянцін.

Аднойчы ў маю клетку ў падвале зайшоў дрэсіроўшчык Валянцін і накінуў мне на шыю здаравенны аброжак, а на морду — спецыяльную аброць, каб не мог я і рота разявіць. Ён павёў мяне цёмнымі пераходамі і вывеў на двор цырка. Пакуль выбіраліся, я быў насцярожаны, гатовы ў любую хвіліну кінуцца на Валянціна ці каго другога, калі той захоча мяне «ўсыпіць». На двары стаяла ўжо машына з

вялізнаю клеткаю, былі прыстаўлены лескі. Мы зайшлі па іх з Валянцінам у клетку, ён разлыгаў мяне, паздымаў з мяне ўсякія рамяні. Другі чалавек, што падняўся па лесвіцы, адразу зачыніў і замкнуў клетку, як толькі Валянцін пакінуў мяне. Валянцін і той чалавек патрэслі адзін аднаго за лапы, і машына зараўла, мяне павезлі... А Шумрык так і застаўся ў тым цырку...

**16**

— Дык гэта цябе ў звярынец перасоўны аддалі! — здагадаўся Ваня. Ён якраз скончыў увязваць Мішкаву лапу, абклаўшы яе тоўстымі плахамі кары. Пагладзіў мядзведзя за цярплівасць.

Мядзведзь выставіў да Тані правую пярэднюю лапу, мармытнуў:

— Э-эйр-р... Оўр-р...

— Мядзведзь гаворыць, што з сумачкі чуецца пах смачных цукерак. І хоць ён зарокся есці салодкае, але калі цукеркі мяккія, а не тыя, што храбусцяць, то ён бы і не адмовіўся ад пачастунку, — пераклаў Эрпід-два.

— Бач ты яго, які далікатны ў манерах! — усміхнуўся Ваня.

— Ой, а я і забыла пра цукеркі, — спахапілася Таня. — «Мишка на Севере» ёсць. Але ж яны, мабыць, больш падыходзяць для белых мядзведзяў.

— Нічога, можа, і я не атручуся, — адразу пераклаў Мішкаў адказ Эрпід-два.

— Дык ты звер з гумарам! — з захапленнем усклікнуў Ваня. — Мумрык, а яблыкі будзеш есці? — палез ён у запазуху.

— Тое, што ты назваў мяне па-мамінаму, саладзей мне за ўсякую цукерку і за яблык. Але я не адмоўлюся і ад яблык, і ад хлеба.

— Няма хлеба. От бачыш, хлеба захацеў... А хто табе даў бы ў лесе хлеба, га? Мы маглі б збегаць у краму, купіць, але ж і грошай у нас няма, — Ваня на ўсякі выпадак падміргнуў Тані.

— Няма, няма, — зразумела яго намёк Таня.

— Манеты... — пачаў нешта гаварыць Эрпід-адзін, але Ваня перапыніў яго:

— А ты ўвогуле памаўчы. Твая справа — маўчаць і запісваць, калі табе цікава.

Жучок усеўся насупраць мядзведзя і глядзеў, аблізваючыся, як Мумрык-Мішка ўплятае за абедзве шчакі яблыкі і цукеркі, як абсмоктвае лапы ад смачнага соку. У Жучка таксама ныла і падціскала ў жываце (галодны быў, як сабака), гатовы быў есці ўсё, але толькі не яблык і цукерку. Зроду такога не еў. От каб дзеці збегалі па хлеб...

Пакуль мядзведзь сілкаваўся, Ваня і Таня, сышоўшыся, раіліся пошапкам, што рабіць далей. Урэшце Ваня аб'явіў:

— Мумрык, ты толькі не крыўдуй на нас... Пакуль не зажыве твая лапа, лепш пабыць табе ў звярынцы. Іначай загінеш, а нам будзе цябе вельмі шкада... Мы палюбілі Мумрыка і хочам, каб ты жыў яшчэ доўга-доўга на радасць усім дзецям. А зажыве лапа, тады можаш рабіць, што захочаш. Можаш, напрыклад, чакаць другога выпадку, каб уцячы... Але ж цябе і маці вучыла, і мы, людзі, вучым: спачатку добра падумай, перш чым што-небудзь рабіць. Мы ж другі раз не трапімся на тваёй дарозе. Невядома таксама, калі яшчэ прыляцяць да нас Эрпіды. А без іх ніхто цябе не зразумее, і ўсё можа скончыцца кепска. Ты ў цырку і ў звярынцы ні разу не клаўся ў спячку, нават не ведаеш, што гэта такое. А мядзведзі на волі гэта робяць, каб лягчэй перажыць халодную, доўгую галодную зіму. Перад спячкаю яны тлушч нагульваюць, запасаюць пад шкураю. А ты... — Ваня памацаў Мумрыка за хрыбет, за бок, пад жыватом, — а ты худы, як таракан, адны рэбры тырчаць. Проста дзіва, што гэтак добра кормяць у звярынцы, а ты высах на трэску.

Тут мядзведзь пачаў нешта мармытаць, але Ваня перабіў яго:

— Пачакай трошкі, я не ўсё яшчэ сказаў. Дык вось, на волі зімою ты спаць не будзеш, будзеш бадзяцца халодны і галодны, беспрытульны — логава ж у цябе таксама не падрыхтавана. А такіх мядзведзяў завуць шатунамі. Яны злыя, шкодныя. Людзі такіх мядзведзяў не любяць, робяць на іх аблавы. Цябе могуць проста застрэліць. А гэта больш балюча, чым «усыпіць».

Пачакаў, пакуль жоўты ператлумачыць усё мядзведзю і перакладзе яго адказ.

Эрпід-два сказаў:

— Мішка-Мумрык гаруе, што другога выпадку можа не быць.

— Можа і так стацца, — коратка развёў рукамі Ваня. — Але мы сходзім да дырэктара звярынца, раскажам пра тваё запаветнае жаданне. І папросім, каб цябе выпускалі летам, вясною і ўвосень на прагулкі ў лес.

— О, каб выпуска-алі!.. — Мішка ўздыхнуў на ўвесь лесапарк. — Нам жа так хочацца з'есці ў лесе што-небудзь такое, што трэба нам як паветра, як самае неабходнае лякарства. А людзі ж не ведаюць

нічога пра гэта, уяўлення нават не маюць.

— Дык от... Цябе будуць выпускаць, гэта можаш лічыць як свой водпуск, адпачынак. Але выпускаць будуць з адною ўмоваю: ты будзеш акуратна вяртацца назад. Людзі ж таксама працуюць, а потым едуць у адпачынак. Хто па лесе бадзяецца, хто едзе на мора ці на рэчку купацца... Ну, дык згода?

Доўга маўчаў мядзведзь, уздыхаў, потым штосьці мармытнуў. Жоўты тут жа растлумачыў яго адказ:

— Я згадзіўся б на гэта. Але дзе гарантыя, што дырэктар выканае сваё абяцанне? Вы паедзеце, і ён тут жа забудзецца пра свае абяцанкі!

— На жаль, такія людзі яшчэ водзяцца, але іх усё менш і менш — выміраюць, — сказаў Ваня. — Але мы яго папярэдзім, што будзем прыязджаць у звярынец, правяраць, з табою бачыцца. Дый яму проста сорамна будзе, калі звер, мядзведзь, будзе больш сумленны, чым ён. Ну, згода?

Але Эрпід-два пераклаў яшчэ адно сумненне Мумрыка:

— Дапусцім, я згаджуся з вамі... Але ж іншыя звяры будуць нада мною насміхацца, скаліць зубы. От, маўляў, храбрэц, уцёк, а потым сам вярнуўся. Палахліўцам будуць лічыць.

— Ты самы разумны мядзведзь, якога я калі-небудзь ведаў. — Ваня хваліў Мумрыка, нікольkі не крывячы душою. — І ты такімі дурнымі звярамі пагарджай, як пустым месцам. Самі яны палахліўцы... Куды, напрыклад, можа ўцячы пантэра? Нікуды, тут жа не цёплы край. Ёй каб і насцеж дзверы адчыніў, то сядзела б, падтуліўшы хвост. А зімою ёй клетку робяць са шкляною сцяною, з падагрэвам. Песта гэта, а не звер. Затое ты... Ты ж у нас самы вынослівы, самы дужы, самы мужны і адважны, самы сумленны і праўдзівы... Які яшчэ, Таня?

— Самы прыгожы і кемлівы, дасціпны і ласкавы, паслухмяны і рахманы, высакародны і адукаваны... — сыпанула Таня, хораша ўсміхаючыся. Яна ўжо нікольki не баялася Мішкі, падышла да яго блізенька і расчэсвала пальцамі бакенбарды, гладзіла па лбе, чухала за вухам, праціpала пад вочкамі.

І пакуль Эрпід-два мармытаў усё гэта мядзведзю, Мумрык падымаў галаву ўсё вышэй і ўвачавідкі весялеў.

— Ну добра, пайду назад, — урэшце згадзіўся ён. — Шкада толькі, што напужаў хлопчыка з веласіпедам...

— Мумрычак, а ты не расказаў нам, як табе жылося ў звярынцы, як удалося ўцячы, — сказала Таня.

Ішлі гуськом па дарожцы. Першы — Жучок, задзёршы хвост і пільна паглядваючы па баках, потым Таня вяла веласіпед, потым каціліся, як танкеткі, Эрпіды, кульгаў мядзведзь, задумліва крочыў Ваня. Эрпід-два мармытаў сам сабе:

— Расліны не радуюцца дажджу... У паветры зменшылася колькасць двухвокісу серы і сернага ангідрыду. Яны растварыліся ў вадзе, у дажджы. У зямлю прасочваюцца шкодныя кіслоты. Расліны курчацца і крычаць, нібы іх ашпарваюць кіпетнем.

Пачаў гаварыць Мумрык, але такое, што напалохаў усіх:

— Колькі каштуе мая шкура?

Ваня пацiснуў плячыма: «Не ведаю...»

— Чаму вы не ведаеце, колькі каштуе мядзведжая шкура? Мо вы проста хітруеце, заманьваеце мяне, каб потым прадаць на шкуру?

Ваня і Таня наперабой пачалі абурацца і лаяць мядзведзя.

— Калі нам не верыш — у Эрпіда папытаў бы, што ў нас у галаве робіцца. Ён жа нашы думкі чытае і бачыць!.. І твае таксама!

*Другі расказ мядзведзя*

— Дык вось — як жылося... І лепш, чым у цырку, і горш. Чаму лепш? Паветра свежага было хоць захлыніся, не тое што ў цёмным цыркавым падвале. Дыхай на ўсе грудзі, нюхай, што ляціць да цябе з поля, з лесу... Але і горш пагэтаму: так блізка была воля! Во — працягні лапы і... А паміж мною і воляю — жалезная рашотка. Яна не паддавалася ні зубам, ні кіпцюрам. Я стаяў ці сядзеў каля жалезных прантоў усю дарогу, пакуль пераязджалі з горада ў горад. Я трымаўся лапамі за гэтае халоднае жалеза, я тузаў яго, ламаў, гнуў, а яно не паддавалася маёй мядзведжай сіле. Слёзы ліліся ў мяне з вачэй, з-за іх я не бачыў свету. Я не вытрымліваў, роў, як дурны, а за мною пачыналі крычаць і галасіць, енчыць і стагнаць усе звяры — такі падымаўся пярэпалах...

Мне спрабавалі і сабаку падсаджваць у клетку, каб не так нудзіўся. Але дружбы ў нас не атрымлівалася, вельмі розныя мы былі — і па вазе, і па росту, і па гадах, і па характары. Я і чакаў кожнага новага пераезду, і пакутаваў, страшыўся яго.

У вашым горадзе мы даўно. Калі ехалі, цвілі яшчэ дрэвы. А цяпер дзеці мне кідаюць у клетку яблыкі

і грушы. І ніхто ні разочку не кінуў малін! За ўсё жыццё — ні разу! Я і ў дзяцінстве іх не паспеў пакаштаваць. Нас пабралі з паляны тады, калі маліны толькі пачыналі спець. А мама нам столькі расказвала пра іх! Так хваліла іх казачную смакату, лекавую сілу! Цукерак, праўда, сыпалася ў клетку больш, чым у цырку. Але хіба аднымі цукеркамі жывуць мядзведзі?! Ад іх толькі зубы баляць, псуецца страўнік... Ды хіба падсалодзіш імі душэўную горыч?

Яды ў звярынцы даюць нам удосталь. Толькі тут, у вашым горадзе, не разумею, што здарылася. А ўсё пасля таго, як з'явіўся новы даглядчык... Вечна ад яго пахла не так, як ад іншых людзей. Мабыць, яго ўвесь час мучыла смага, бо я часта бачыў, як ён хаваўся за мой вагончык-клетку, піў штосьці з бутэлькі, а ў канцы гаварыў: «Хух!» — і выціраў рукавом рот, моршчыўся. Ён мне так абрыд сваімі размовамі — здаецца, разарваў бы на кавалкі.

«Ну што, дармаедзіна? Усё топчашся, усё ходзіш? І хто цябе, такога бамбізу, выдумаў? — пачынаў ён, напіўшыся з бутэлькі. — Замест аднаго цябе можна трымаць дваццаць нутрыяў і пяць чарнабурак. Дык ад іх хоць карысць чалавеку. А ад цябе якая карысць? Як з паршывай авечкі, нават воўны не ўскубнеш... От колькі, скажы, каштуе твая шкура? Не ведаеш? І я не ведаю... А колькі шкуры з чарнабурак, норак, нутрый каштуюць — ведаю, магу далажыць... Але табе гэта да лямпачкі! Што, мо і табе даць смактануць? А трасцы не хочаш?»

І частаваў мяне не з бутэлькі, а... мятлою-дзеркачом у зубы, у морду, у вочы. Як прыбірае ў клетцы, ганяе мяне туды-сюды, не дае спакою. Тры разы я адбіраў у яго мятлу, трушчыў на дробныя кавалкі... А ён, спаткаўшы каля клеткі дырэктара, скардзіўся, што я агрэсіўны, што аднойчы зламлю рашотку і перадушу ўсіх людзей-гледачоў. І ўвогуле, што даўно пара мяне забіць.

Замест буханкі хлеба ён дае мне ўвечары толькі невялікі акраец. Мяса зусім не дае, забірае і гароднiну. Палавініць ён мяса і ў лісы, і ў пантэры, і ў тыгра, пакуе ўсё ў чорную сумку і хавае за дальнім колам майго вагончыка, каля самага шчыта абгародкі. Вечарам, калі нікога ўжо ў звярынцы не было, ён таксама ішоў. Але потым я чуў і бачыў, як адзін рог шчыта адхіляўся, адтуль прасоўвалася лапа з доўгімі пальцамі... Сумка, як жывая, паўзла за ёю і знікала.

А ўчора вечарам ён вельмі хістаўся, ад яго пахла той гадкаю вадою з бутэлькі. Я заўважыў, што ён не так, як заўсёды, зачыніў і замкнуў клетку. Ён нават не замкнуў, а проста начапіў замок, і ўсё. Я дачакаўся, калі знікла яго сумка з-пад вагончыка, калі ўсё сціхла ў звярынцы. І прасунуў лапы між халодных жалезін, зняў замок, адчыніў дзверцы. Я нікуды не ішоў, ніякага іншага выйсця не шукаў. Я адразу палез пад вагончык да таго шчыта. Прасунуў у шчыліну лапу, націснуў. Шчыт адхіліўся так, што я мог прасунуць і галаву. Агледзеўся...

Змяркалася ўжо, людзей амаль не было відаць. Непадалёку я ўбачыў гэты вось лес. З яго даляталі не такія пахі, як з сапраўднага лесу, але гэта ўсё-такі быў лес! Я кумільгом кінуўся туды, адкрытае месца стараўся перабегчы як мага хутчэй. Ніхто мяне і не думаў затрымліваць, калі бачыў, то стараўся ўцячы з дарогі. Я перабег малы лясок, перабег вуліцу з жалезнымі палосамі ў зямлі і прыпусціўся на ўвесь дух у гэты, большы лес. І тут з-за павароту вылецеў на мяне на веласіпедзе хлопчык. Ён паспеў крыху затармазіць, і ўдар аб мяне быў не вельмі моцны. Але і веласіпед упаў, і хлопчык упаў, абадраў лоб аб дрэва. Падхапіўся, пабег па кустах, як малады алень, крычаў: «А-а-а-а!» Я падняў веласіпед за ручкі, як мяне вучылі, паспрабаваў сесці на яго. І не мог, перашкаджала рама. У тых веласіпедах, на якіх я ездзіў у цырку, гэтай рамы не было. Тады я ўспомніў самы першы свой нумар. Я тады быў зусім малы і перадражніваў малога хлапчука, які хоча паехаць на вялікім веласіпедзе пад раму. І ўрэшце ехаў, і было многа «Ха-ха-ха!», і пляскалі рукамі. А цяпер было наадварот: я вялікі, а веласіпед не вельмі вялікі... І ўсё-такі я змог паехаць пад раму на веласіпедзе хлопчыка і ехаў не па шырокай дарозе, а па лясной сцежцы. Трохі доўга ехаў, нават зварочваў то туды, то сюды. Каб не так хутка цямнела, то і далёка ад'ехаў бы. Але... на штосьці наляцеў, спатыкнуўся... Веласіпед ірвануўся з-пад мяне. Падаючы, ушчаміў лапу... Грымнуўся добра і тут жа адчуў, як пекануў боль у лапу... З гарачкі я яшчэ прабег трохі, а потым забраўся ў гушчар. Трэба было адседзецца, абдумаць усё, што нарабілася. Астатняе вы ведаеце...

## 17

— А-а-а, дык вось чаму цябе не магла міліцыя з сабакам знайсці! — здагадаўся Ваня. — Ты сеў на веласіпед, і сабака згубіў твой след. Ніхто ж не мог і падумаць, што ты такі штукар.

Эрпід-два пераказаў гэта мядзведзю і адразу пераклаў тое, што сказаў Мішка ў адказ:

— Іду вось я, вяртаюся, а той даглядчык зноў будзе соўгаць мне дзеркачом у зубы, голадам марыць... Дык лепш загінуць галоднаму на волі, чым жыць з цукеркамі ў клетцы! І з бруднаю мятлою ў зубах!

— Мумрык! Перастань панікаваць і бедаваць! Мы адразу сходзім да дырэктара звярынца, усё раскажам. І таго п'янчугу і злодзея выведзем на чыстую ваду, выганяць яго к чорту!

— На чыстую ваду... Вывесці на чыстую ваду... Інфармацыю не зразумеў. Зразумеў, было такое, — мармытаў сам сабе Эрпід-адзін.

— Ціх-х-х! — падняла раптам трывожна руку Таня. Яна і Жучок былі ўжо на самым узлеску каля вуліцы з трамвайнымі лініямі. — Зноў міліцэйская машына ў рупар крычыць!

— Хай крычыць, яна нам ужо не страшная, — паспеў сказаць Ваня.

Але дарэмна ён так храбрыўся...

— Паважаныя мінчане! Госці сталіцы! Будзьце пільныя і асцярожныя! — ляцеў з вуліцы голас з металічным адценнем. — Не пакідайце дзяцей без нагляду! Са звярынца ўцёк мядзведзь. Усіх, хто ведае што-небудзь пра яго месцазнаходжанне, просім паведаміць у бліжэйшы аддзел міліцыі! Просьба...

Голас з рупара раптам абарваўся. Жоўта-сіняя машына, віскнуўшы тармазамі, заляцела на ўзбочыну, яе развярнула ўпоперак дарогі. Адразу адчыніліся ўсе дзверцы машыны, — нібы крылы ў жука, і выскачылі пяць міліцыянераў.

— Вось ён! — усклікнуў той, што быў у афіцэрскіх пагонах, і паказаў на Мішку. А той стаяў на задніх лапах ва ўвесь свой магутны рост і перабіраў перад сабою пярэднімі лапамі. Таня яму і да пояса не даставала. — Дзяўчынка! Не азірайся! Бягом ляці да нас! — спалохана крычаў афіцэр.

Таня на гэта абыякава махнула рукою, павярнулася крыху да мядзведзя, які ўжо апусціўся на тры лапы, і пакратала яго за пысу.

У афіцэра-міліцыянера адвісла сківіца. Але ён тут жа ўзяў сябе ў рукі.

— Заходзьце з бакоў! — закамандаваў ён. — Адрэзвайце мядзведзю шлях да адступлення! У выпадку чаго прымяняйце зброю! Два ўправа, два ўлева — рассыпайсь!

Міліцыянеры, на бягу расшпільваючы кабуры, коўзаючыся, пакарабкаліся на касагор.

— Стойце! — забег Ваня наперад мядзведзю і Тані, замахаў рукамі крыж-накрыж. — Стойце, а то наробіце непапраўнай бяды! — і на міг адвярнуўся да жоўтага: — Нічога гэтага Мішку не перакладай... — і зноў да міліцыянераў: — Мы самі ўгаварылі мядзведзя вярнуцца ў звярынец і вядзём яго! Ён вяртаецца добраахвотна, улічыце!

Міліцыянеры перасталі ўзбірацца на строму, наадварот, пазбягалі назад і пачалі асцярожна набліжацца да Ваневай групы з боку асфальту. Пісталеты ўсё-такі трымалі напагатове. Падышоў бліжэй да мядзведзя і афіцэр.

— А дзе гарантыя, што ён не нападзе на людзей, не параздзірае іх? — крыкнуў ён.

Ваня павярнуўся да Мішкі-Мумрыка, абняў яго за шыю, пагладзіў па галаве, пацалаваў у вільготны нос.

— Ну што, мала гэтага? Мы з ім знайшлі агульную мову з дапамогаю робатаў-перакладчыкаў. Лепш вы, таварыш капітан, — Ваня ўжо добра разгледзеў пагоны афіцэра, — загадайце міліцыянерам, каб яны не падпускалі да нас блізка людзей. І самі не вельмі набліжайцеся, а то мядзведзь чуе зброю і хвалюецца. І выклічце, калі ласка, у звярынец «хуткую ветэрынарную дапамогу». У мядзведзя трэшчына ў касці, патрэбна гіпсавая павязка.

— Матылік! Казадой! Чыхуноў! Шкаварада! — выкрыкваў афіцэр прозвішчы міліцыянераў. — Вядзіце ўсіх да звярынца! Але будзьце пільныя!

Капітан дастаў недзе з рукава паласаты жэзл і спыніў рух на вуліцы ў абодва бакі. У вокнах машын і трамваяў відаць былі выцягнутыя ад здзіўлення твары людзей. Хто пасміхаўся, хто ківаў галавою, хто паказваў пальцам на дзіўную працэсію, што пераходзіла вуліцу з рэйкамі. Калі Ваня мінаў капітана, маленькая рацыя, што вісела на баку афіцэра, ажыла:

— Усім патрулям! Усім пешым і механізаваным патрулям! Стала вядома, што ў Менск на спадарожнай машыне прыехаў хворы на невядомую заразную хваробу хлопчык. Паражоны мозг, сімптомы — трызненне наяву, яму здаецца, што на Зямлю спусціліся касмічныя прышэльцы... Звацць хлопчыка Гардзей Іван Аляксеевіч. Хлопчыку на выгляд гадоў дзесяць-адзінаццаць. Адзеты ў звычайны школьны касцюм. Хлопчык прывёз з сабою самаробнага электроннага робата і выдае яго за пасланца з касмічнага карабля. Просьба не марудзячы затрымаць і ізаляваць яго, не ўступаючы з ім у фізічны кантакт...

У грудзях у Вані быццам іней асеў ад хвалявання. Здавалася, што ён чуе, як упіваюцца ў патыліцу праніклівыя вочы капітана міліцыі. Яшчэ хвіліна, другая — і ўсё перакуліцца дагары, адбудзецца катастрофа. Міліцыя можа затрымаць яго, пабраць Эрпідаў. Пачнуць дапытваць Эрпідаў, могуць размагніціць усе іх запісы. А ім жа хутка ляцець назад, вяртацца на карабель... І невядома, як усё скончыцца з мядзведзем. У апошнюю хвіліну ён можа западозрыць няладнае, рынецца наўцёкі, і па ім могуць адкрыць агонь... А міліцыя ж страляе метка! А Таню могуць абвінаваціць, што ўкрала чужы веласіпед... А Жучок астанецца адзін у вялікім горадзе, будзе бадзяжнічаць, і яго могуць вылавіць, як сабаку-валацугу.

Цераз меншы лясок і міма кола агляду ўжо не ішлі. Капітан сказаў абысці іх справа, дзе рэдка раслі зусім маладзенькія дрэўцы і месца было вельмі падобна на пустку. За імі напрасткі павярнула і міліцэйская машына, лёгка адолеўшы высокі каменны бардзюр. Машына паволі рухалася на некаторай адлегласці ад працэсіі. Ваню і Тані даводзілася памагаць Эрпідам, тыя часта заблытваліся ў траве, загразалі ў раскіслай зямлі.

Калі былі ўжо непадалёку ад увахода ў звярынец, машына падсунулася амаль упрытык, трохі падпужаўшы мядзведзя. Звузілі свой круг і міліцыянеры. Апошнія метры Мішка чыкільгаў з цяжкасцю, аглядваўся, непакоіўся. Мабыць, навярэдзіў, хоць, здаецца, і ўвязалі добра, пашкоджаную лапу.

— Гэта зноў вы?! — пазнала Ваню кантралёрка каля ўваходу і трывожна зірнула на мядзведзя. — І... Мішка з вамі?! Ратуйцеся, людзі!.. — Яна ўраз апынулася па той бок дзверцаў, зашчапілася знутры, а верашчаць не пераставала. Дурніца, магла сапсаваць усё, мядзведзь пачаў ужо дрыжаць і азірацца. — А дзе... вашы... асістэнты?!

— Мы гэта, мы... Асістэнты пайшлі дадому. Мядзведзя не бойцеся, мы яго ўгаварылі вярнуцца. Не пускайце нікога на тэрыторыю звярынца, мы зробім там некалькі заключных здымкаў з Мішкам — і ўсё. Ён пойдзе ў клетку.

Кантралёрка асцярожна прачыніла дзверцы, а сама так і тулілася за імі. Першая прайшла Таня з веласіпедам, потым Эрпіды, потым праціснуўся мядзведзь. Ваня ўзяў на рукі сабаку, каб не згубіўся ў тлуме і не хваляваўся дарэмна, ступіў таксама туды.

— А вы стойце, малады чалавек! — паклаў яму руку на плячо капітан і тут жа адхапіў: успомніў, што па рацыі папярэджвалі не кранацца яго. — Ты Гардзей?

— Гардзей Іван Аляксеевіч. А што? — стараўся гаварыць спакойна, хоць усё ўнутры сцялося і напружылася.

— Разбяромся — што. Пройдзем са мною ў машыну!

— Пачакайце пяць хвілін! Мядзведзь змучаны, расхваляваны. Можа ўзбунтавацца без мяне! Бяды наробіць! Пасадзім яго ў клетку, і мы выйдзем да вас. А вы ніхто не заходзьце са зброяй! Ён вельмі не любіць паху зброі.

— Пачакаем, — спыніў капітан міліцыянераў, што хацелі ўжо праціскацца ў звярынец, і сам застаўся каля ўваходу.

Як толькі Ваня зайшоў, кантралёрка вышмыгнула з-за дзвярэй — і да міліцыі. Ваня пачуў яе гарачы шэпт:

— Мо на замок узяць дзверы? Каб нікуды не ўцяклі... Таварыш капітан, яны і першы раз заходзілі, нібыта кіно здымаць, дык у мяне падазрэнне было. А цяпер добра бачу: справа тут нячыстая! Дзе гэта хто чуў ці бачыў, каб мядзведзь дзяцей слухаўся, ішоў, як цяля? Або гэтыя піпеткі іхнія... Хіба яны падобны на перасоўныя кінакамеры? Яны раз-маў-ля-юць! І гэта... Адна была піпетка, светленькая такая. Адкуль другую ўзялі?

— Разбяромся, грамадзянка. Вам таксама трэба будзе праехаць у міліцыю, — сказаў капітан.

— Ой, а я за што? Я ж нічога такога... Вы іх глядзіце, каб не ўцяклі!

— Не бойцеся, у мяне і мыш не праскочыць.

Ваня пасміхнуўся і дагнаў сваіх.

— Эрпід-два, скажы мядзведзю і сабаку, каб сядзелі смірна, чакалі мяне. Я пайду да дырэктара.

Дырэкцыя звярынца займала асобны фургон, хатку на колах. Ваня падняўся па прыстаўных драўляных усходцах да дзвярэй, пастукаў і тут жа адчыніў, не чакаючы адказу. «Заходзьце!» — сказалі яму ледзь не ў твар, бо каля самых дзвярэй, загароджваючы Ваню дарогу, стаялі, зрыхтаваўшыся выходзіць, двое мужчын — адзін пажылы, паголены, а другі малады, але з вусікамі і бародкаю.

— Толькі спакойна... Я прывёў вашага мядзведзя, — сказаў Ваня.

Абодва мужчыны ахнулі. Пажылы кінуўся да акенца, а малады — да Вані, быццам хацеў яго змесці з твару зямлі.

— Спакойна, кажу! — перагарадзіў Ваня рукою выхад. — Хто з вас дырэктар? Вы? — паглядзеў ён на пажылога. — Мядзведзь паставіў такія ўмовы... — І ён хуценька пераказаў усё, што прасіў Мішка, асабліва пра даглядчыка. — Не пасміхайцеся, а верце мне. Дагаварыцца з мядзведзем памог электронны робат.

— Коля, гэты хлопец не хлусіць... — сказаў пажылы дрыжачым голасам. — Вунь Мішка, сядзіць пасярод двара... Казка, дый годзе! Чараўнік! Кіо!

— Ніякай казкі, усё чыстая праўда, — цвёрда сказаў Ваня. — Дык што будзе з тым даглядчыкам-абкрадчыкам?

— Таго п'янага абармота сёння ж нагі тут не будзе! — даў волю гневу дырэктар. — Знайшоў каго

абкрадваць! Безабаронных звяроў! Якія і паскардзіцца не могуць! Ай-яй-яй...

— Як бачыце, могуць часам і паскардзіцца і расказаць трохі чаго... Калі хочаце, каб у вас у звярынцы ўсё было добра, не парушайце мядзведзевых умоў. Перапрасіць яго зноў ніхто не зможа, апарата-перакладчыка ў вас не будзе... І лапу яму трэба ў гіпс хутчэй!

— Усё зробім! Усё выканаем! Ай-яй-яй... Табе, хлопчык, мы павінны выплаціць вялікую ўзнагароду. Пагуляй, хутка прыйдзе наш бухгалтар-касір... Гэта ж подзвіг! Сапраўдны подзвіг — з дзіцячымі рукамі на мядзведзя ісці! — дырэктар гаварыў і чамусьці паказваў свае рукі.

— Я не за грошы гэта рабіў... І дзеці яшчэ не такое могуць, дарэмна вы, дарослыя, нам не даверяеце.

— Як гэта без узнагароды?! Такога не можа быць! — дырэктар і галавою круціў, і пальцам ківаў у бакі.

— Вы памажыце нам з транспартам, падкіньце кіламетры два. От і ўся ўзнагарода будзе... Мы зараз даздымем свой фільм пра звярынец. Гэта будзе цікавы прыгодніцкі фільм... Камера пройдзе па тым самым шляху, якім уцякаў Мішка. А мы — за камерамі следам... Вы падганіце машыну з таго боку клеткі мядзведзя і там адразу нас пагрузіце.

— Коля, чуў? Для іх мы павінны разбіцца ў дошку. Падганяй бяжы машыну туды, куды ён сказаў, — з тылу.

— Будзе зроблена! — бліснуў барадаты Коля зубамі і выскачыў з фургона.

— Дай я табе хоць руку пацісну, мужны ты чалавек! — сказаў расчулена дырэктар.

Ванева далонька схавалася ў дырэктаравай, як птушынка ў гняздзе.

Выйшлі...

Мядзведзь і Жучок сядзелі на хвастах, прытуліўшыся бакамі адзін да аднаго, як неразлучныя сябры. Насупраць іх стаялі Эрпіды і Таня. Дзяўчынка штосьці горача гаварыла мядзведзю, а жоўты мармытаў, перакладаў. Зводдаль паўкругам выстраіліся наведвальнікі звярынца. На звяроў у клетках ніхто не глядзеў: тут, пасярод двара, было цікавей.

Дырэктар падысці не асмеліўся, абмінуў натоўп за спінамі і адразу адшчапіў, адчыніў Мішкаву клетку.

— Ну, давай развітвацца, Мумрык... З дырэктарам пра ўсё дамоўлена, ён даў чэснае слова. Эрпід, перакладай мядзведзю, супакойвай. Скажы, што мы не назаўсёды развітваемся. Будзем прыязджаць у госці да яго.

Ваня абдымаў Мішку, гладзіў, а гледачы ахкалі ад страху. Мядзведзь крахтаў і ўздыхаў, таптаўся на трох лапах.

— Мішка гаворыць... — пераклаў Эрпід-два, — вас многа, сяброў, а ў мяне нікога... Пакіньце мне хоць Жучка. З гэтым сябрам мне лягчэй будзе ў клетцы, — пасля гэтых слоў жоўты штосьці брахануў і сабаку.

Жучок ускочыў, як на спружынах, замахаў хвастом з усёй сілы, лізнуў мядзведзя ў нос, у куточак губ, радасна гаўкнуў:

— Жучок гаворыць: ты мой сябар навекі... Але першы мой сябар чалавек Ваня. Я не магу мяняць першага сябра ні на другога, ні на трэцяга, — пераклаў жоўты.

А дырэктар стаяў збоку, каля мядзведжай клеткі і ўсё хітаў галавою ад здзіўлення: няўжо такое можа быць на свеце? Няўжо яму ўсё гэта не сніцца? І хапаўся за левую грудзіну — пачало ні з таго ні з сяго балець сэрца.

Мядзведзь гаротна, з балючым надрывам раўнуў, як у трубу затрубіў, і павярнуў да клеткі. Дакульгаў да дзверцаў, учапіўся пярэднімі лапамі і зубамі за жалезныя пранты, неяк падкурчыўся, падагнуў правую заднюю лапу і ўчапіўся ёю за падлогу. Ускараскаўся няўклюдна — ці гэтак балела хворая лапа, ці яго пакінулі апошнія сілы. Жучок падскокваў каля дзверцаў, нібы перадумаў і хацеў трапіць да Мішкі ў клетку, павіскваў.

Дырэктар хацеў ужо паціху падабрацца і замкнуць клетку.

— Пачакайце! — падбег туды Ваня. — Папружку сваю забяру.

І забраўся ў клетку, развязаў мядзведзю лапу.

— Ну, бывай, Мумрык! Не памінай ліхам... Паляжы спакойна, пакуль прыйдзе ўрач, зробіць гіпсавую павязку. Эрпід-два, перакладзі яму! — Ваня выцер мядзведзю мокрае ад слёз вока і рэзка павярнуўся, саскочыў на дол. — Таварыш дырэктар! Апошняя просьба... Замяніце назву: не «Мішка-артыст», а проста «Мумрык». Гэта яго сапраўднае імя.

— Зробім, усё зробім, — дырэктар паспешліва зачыніў дзверцы, замкнуў іх.

— Эрпіды, сюды! — паказаў Ваня пад вагончык, і тыя паслухмяна пражурчалі гусеніцамі пад вагон-клетку. — А табе, Таня, дзякуй за дапамогу. І вось яшчэ што: знайдзі таго хлопчыка, вярні веласіпед!

Жучок, ка мне!

— Знайду! — выцірала і Таня вочы. — Я аб'явы развешу... Бывайце!

— Дай яшчэ вушка, па сакрэту нешта скажу, — Ваня, ледзь не кранаючы губамі Таніна вуха, прашаптаў ёй свой сакрэт. І адразу павярнуўся, нырнуў пад вагончык. Рашуча адхіліў шчыт — як мага шырэй. У дзірку-шчыліну першыя праехалі Эрпіды...

Няхай чытачы пакуль што не патрабуюць ад мяне, каб выдаў гэты сакрэт. Ён раскрыецца зусім хутка.

І пра Пецю Галабродзьку ўсё будзеце ведаць. Пакуль што ён, абліваючыся потам, выконвае заданне Эрпіда-адзін. І так заўзята, з такім натхненнем — ні ў казцы сказаць, ні пяром апісаць.

## 18

Ліловы «Масквіч»-фургончык, расплёскаўшы ў бакі лужыну, па-заліхвацку павярнуў у вароты рынку. Ваню, з Жучком на руках, прыціснула да дзверцаў машыны. Чуваць было, як у будзе машыны Эрпіды скрыгатнулі спінамі па акаванай цынкавай бляхаю падлозе. «Як ім там, бедным? Хоць бы не пакалечыліся, ім жа яшчэ трэба будзе падымацца на арбіту», — падумаў Ваня. Тады, як грузілі за звярынцам Эрпідаў у машыну, клалі ўпобачкі на падлогу, ён чуў з расчыненых задніх дзвярэй, што ў машыне не вельмі добра пахне. Відаць, шафёр-барадач толькі на выгляд такі культурны, а сам неахайны. І мяса, і іншыя харчы перавозіў для звяроў, а ні разу мо не мыў у фургоне. Набяруцца там Эрпіды ўсякіх мікробаў. Калі не зробяць ім дэзінфекцыі, то прывязуць на карабель «гасцей» з Зямлі.

— Вунь каля той машыны станьце... — паказаў Ваня на грузавік з будаю каля плота. Там дзядзька Мікалай разбіраў стол са скрынак, а шафёр з вагамі на руках ішоў адтуль да склада ці канторы. — Дзякуй вам вялікі!

Зноў заліхвацкі разварот, рэзкае тармажэнне. Зноў скрыгат і бразгат у кузаве.

Дзядзька Мікалай падышоў памагчы выгрузіць Эрпідаў і, як толькі ліловы «Масквіч» ад'ехаў, папытаў сцішаным голасам:

— Ну як, усё ў парадку? — дзядзька на штосьці намякаў.

— Усё... А што? — спытаў Ваня і пачаў чэрпаць з лужыны рукою ваду, абмываць гразь з Эрпідаў.

— Пыталіся тут пра цябе... і пра гэтага... — кіўнуў дзядзька на серабрыстага. — О-о, дык у цябе іх ужо два! — нібы толькі зараз дзядзька ўцяміў тое, што бачылі яго вочы.

— Два, два... Мы ж і прыязджалі спецыяльна шукаць другога, выручаць з бяды.

— Кгы-кхэ... І як яны, гэта самае, адшукалі нас? Проста дзіву даюся... Ніхто ж, здаецца, не бачыў, як мы падбіралі вас на дарозе.

— Савецкая міліцыя працуе добра! — усміхнуўся Ваня.

— А сабачка адкуль узяўся? Хочаш сабе дадому завезці?

— Ды гэта ж наш Жучок! Усю дарогу бег за вашым грузавіком.

— Дзіва ў рэшаце! Чаго толькі не бывае на свеце! Лезь у кузаў, буду падаваць скрынкі. А ты пакуй іх добра, каб менш месца займалі. Глядзі: вось такія цалкам заходзяць у вось такія. А ўсярэдзіну можна яшчэ адну тарцом паставіць, а чацвёртую надзець на яе, як шапку. Адразу колькі месца зэканоміцца.

Ваня ўлавіў і пусціў у кузаў Жучка, залез сам. Ладкаваў скрынкі і бачыў: Эрпід-два стаіць як нежывы, а серабрысты варушыць антэнамі. Хутка і лямпачкаю заміргаў — мабыць, выйшаў на чарговы сеанс сувязі з караблём.

— А я ўжо думаў, што ты не паспееш. Але добра, што дождж трохі затрымаў нас, — гаварыў дзядзька Мікалай. — Ага... Дык гэта самае... Пытаюцца тыя ў мяне, дзе высадзілі вас, куды вы накіраваліся. А я разгубіўся, не ведаю, што казаць... То добра, што Міця выручыў, шафёр. «Па Партызанскім праспекце, — кажа, — яны пайшлі. Дзеці за імі чарадою... Вы глядзіце, дзе куча дзяцей, там і шукайце». Дык яны і памчаліся па праспекце. Але мы не сказалі ім, што вы вернецеся сюды к шаснаццаці.

У гэты час да іх хуткім крокам падышоў і дзядзька Міця — без вагаў.

— Парадак у танкавых часцях... Засталося толькі паабедаць, і дадому. Ну, жалязякі, давайце на пагрузку!

Шафёр і дзядзька Мікалай удвух падхапілі Эрпіда-два, паставілі ў машыну. За ім — серабрыстага, хоць той яшчэ міргаў лямпачкаю. Толькі хацеў дзядзька Міця падымаць борт, як серабрысты загаварыў:

— Наш старт папярэдне назначаны на сёння на дваццаць гадзін нуль адна хвіліна чатырнаццаць і тры дзесятых секунды. Сустрэча з караблём мяркуецца на шэсцьдзесят сёмым яго вітку вакол Зямлі. Я далажыў, што нам трэба праехаць яшчэ кіламетраў пяцьдзесят, прыкладна на тое месца, дзе я прызямліўся. Яны сказалі, што пры любых абставінах наш старт не можа быць адкладзены. Нам загадалі зноў выйсці з імі на сувязь праз дзве гадзіны для ўдакладнення нашага месцазнаходжання і

разліку траекторыі збліжэння... Іван Аляксеевіч Гардзей, дакладваю... За шэсцьдзесят хвілін да старту мы адключаемся ад знешніх раздражняльнікаў. Энергія будзе ісці толькі на падрыхтоўку да палёту. Эрпід-два адключыўся ўжо цяпер. У яго засталося энергіі толькі на падрыхтоўку да палёту і пад'ём...

— Во чэша, як па пісаным... Не скажаш, што і машына: разумнік! — сказаў шафёр.

— Такі праўда... Нетутэйшыя яны... — прашаптаў разгублена дзядзька Мікалай. — Не дарэмна імі цікавілася міліцыя!

Ваня таксама затрывожыўся, але не таму, што іх недзе шукае міліцыя. Зараз ужо ідзе пятая гадзіна, а старт у дваццаць. Лічы, што нават у дзевятнаццаць, бо за гадзіну да старту яны адключаюцца. Застаюцца ўсяго нейкія тры гадзіны на ўсё — на абед, на дарогу і на Лёневы падручнікі... А так бы хацелася паказаць ім школу, і сваіх таварышаў, і тату з мамаю, і дзеда Гардзея. Дый саміх распытаць яшчэ трэба шмат пра што. Ну як паспець усё гэта зрабіць?

— А можна, каб не абедаць, а? Пацярпіце, а? — узмаліўся ён. — Дзядзечкі, міленькія, паедзем хутчэй!

— Ну але! Так можна і пахудзець! — Шафёр рашуча падняў і зашчапіў борт, пайшоў садзіцца за руль. Дзядзька Мікалай — за ім. І ледзь Ваня паспеў пакласці Эрпідаў на спіны, як машына тузанулася з месца.

Пакуль ехалі вуліцамі, дзядзька Мікалай, мабыць, угаварыў шафёра не хадзіць у сталовую. Але ўгаварыў толькі напалову, бо грузавік усё роўна спыніўся толькі каля гастранома. А неўзабаве абодва дзядзькі выйшлі з крамы з поўнымі рукамі ўсякіх пакункаў і бутэлькамі малака. Дзядзька Мікалай трохі пастаяў каля кабіны, нарэзаў шафёру хлеба, каўбасы і сыру, пакінуў бутэльку малака, і з астатнім пайшоў да задняга борта.

— Трымай! — паклікаў Ваню і перадаў яму прыпасы, залез сам. — Паганяй! — крыкнуў дзядзьку Міцю. Разаслаў газету, паразгортваў прадукты. — Ну, давай, браток... Ведаю, што таксама галодны.

Перш за ўсё Ваня вялікую скібку хлеба падаў Жучку. Заслужыў!

Ехалі. Елі. Размаўлялі.

— А я, гэта самае, думаў, што трохі круціш... Фокусы паказваеш з гэтымі Эрпідамі, — гаварыў дзядзька. — Ажно ўсё насур'ёз выйшла! Ты, вядома, смелы, не пабаяўся з імі справу мецць. Гэта добра... І ты добры па натуры — гэта яшчэ лепш. Шчыра выконваў усё, што ні патрабавалі яны. Але ж ты не падумаў, ці меў ты на гэта права. Хто ты такі? Хлапчук, школьнік, якіх мільёны... А хто табе дазволіў ад імя ўсіх людзей, усёй планеты, можна сказаць, уступіць з імі ў хаўрус, у сувязь? Хто выбіраў цябе для гэтага, хто прызначаў? Што, ты самы разумны, самы хітры, самы мудры? Ты — дзяржаўны дзеяч, прадстаўнік Арганізацыі Аб'яднаных Нацый? Не, ты, гэта самае, яшчэ ніхто... А ты не думаў, да чаго могуць прывесці вось такія панібрацкія сувязі... любога з нас!.. з іншапланецянамі?

Ваню было не ўседзець пад агнём гэтых пытанняў. Азірнуўся на Эрпіда-адзін... Чуе, усё запісвае, а здаецца, так мірна пакалыхваецца ў такт падтрэсванню машыны. Прасторна цяпер ехаць і мякка: дзядзька надаставаў са скрынак саломы.

— Ды не бойся ты яго і не саромейся... Падумаеш, цаца! Калі чуе, то хай усё закладвае ў свае жалезныя глузды. Ім усім будзе над чым т а м... — дзядзька падняў угору палец, — памазгаваць! Дык от — не так проста ўсё з гэтымі кантактамі... Мы ж нічога не ведаем пра іх сапраўдныя намеры! Не ведаем, да чаго прывядзе знаёмства з імі — да зла ці дабра, а мо ўвогуле да бяды і няшчасця. Яны ж хітраць, як я прызнаў... Хочуць, каб мы ім усе карты раскрылі, а яны нам ніводнай не паказваюць. Дык што гэта за гульня? Абжульванне, ашуканства!

— Дзядзька Мікалай! Гэта ж робаты, а не сапраўдныя іншапланецяне! Як наш луназод...

— Ого-го, не скажы!

— І чаму ўсе дарослыя такія недаверлівыя? Ніколі яшчэ да нас не прыляталі пасланцы з іншых планет, а мы іх у штыкі!

— Нам больш падабаюцца дзеці — малодшая частка чалавецтва, — нечакана прагаварыў Эрпід-адзін.

— Падабаюцца? Ну дык ляжы і маўчы! — нечакана зазлаваў на яго Ваня. — Не думай, што ўсе людзі — дзеці, а вы, зялёнчыкі, дарослыя і больш разумныя. Вы так мала пра нас даведаліся, можна сказаць, зусім нас не ведаеце! То як вы можаце меркаваць, якія мы?

— Во, вось так з ім! Зусім разумна ты ўжо гаворыш, — адобрыў дзядзька Мікалай. — Стражэй з імі, стражэй! Не лузацца перад імі са скуры, не рассыпацца драбней маку, не слацца лістам, не скакаць пад іх дудку. А то мы і так, і гэтак, а ў іх мо камень за пазухай... Паменш трэба развязваць языкі, пабольш вадзіць за нос, абводзіць вакол пальца, таўчы ваду ў ступе, мяшаць гарох з капустаю. Як дыпламаты на перагаворах робяць. А ён хай чухае патыліцу...

— Інфармацыю не зразумеў, — азваўся Эрпід-адзін. — Лузацца са скуры... Рассыпацца драбней

маку... Лістам слацца... Скакаць пад яго дудку... Развязваць языкі... Вадзіць за нос... Таўчы ваду ў ступе... Мяшаць гарох з капустаю... Чухаць патыліцу... Кожнае слова паасобку зразумелае, а сабраныя разам гавораць адно, а разумець трэба інакш. А як?

— Ты запісаў усё гэта? Запісаў, я цябе ведаю. Ну дык і прывязі сваім вучоным загадку, няхай расшыфроўваюць. А то табе ўсё разжуй і ў рот пакладзі. Хочаш мець яечка ды яшчэ аблупленае.

— Інфармацыю не зразумеў... — пачаў сваё Эрпід.

Але дзядзька Мікалай павёў гаворку далей, і серабрысты змоўк.

— От ты кажаш, гэта самае, што ўсе дарослыя недаверлівыя... Гэта ў цябе няправільная інфармацыя, як той Эрпід кажа. Проста мы асцярожлівыя... А што нас прымушае быць такімі? Жыццёвы вопыт, усё пераражытае, накопленая за мінулыя гады мудрасць. Было ўсяго нам на вяку — і па спіне, і па баку. Дык нашто ж нам зноў падстаўляць бакі?

Доўгая была размова. А за доўгімі размовамі дарога здаецца карацейшаю — старая ісціна.

**19**

Насупраць Клінцоў Ваня не злез. Захацеў праехаць да Бярозаўкі, прыйсці з Эрпідамі пад школу. Спадзяваўся, што там каго-небудзь застане з другой змены, хоць было і пазнавата. Цяпер ужо можна было і паказаць каму Эрпідаў.

Але планы яго парушыліся: машыну спынілі пры ўездзе ў вёску.

— А ў будзе ёсць хто-небудзь? — пачуўся строгі голас.

Жучок аглушальна забрахаў, кінуўся да задняга борта, стаў на яго лапамі. Дзядзька Мікалай, угнуўшыся, падыбаў зірнуць — што там такое? Ваня тым часам закідаў Эрпідаў саломаю і таксама высунуў галаву з буды. Убачыў міліцыянера і дружынніка з чырвонаю павязкаю на рукаве.

— А што такое? — спытаў дзядзька.

— Злезці ўсім, перайсці цераз каранцінную падушку! — загадаў міліцыянер.

А дружыннік, мабыць, быў сябрам шафёра, бо яны ўсміхнуліся адзін аднаму і нават рукі паціснулі. Але дружыннік усё роўна і яму паказаў патаптацца на злітай жоўтай вадкасцю тырсе.

Ваня злез і з цікавасцю прайшоўся па падушцы, нават Жучка некалькі разоў паставіў у тырсу ўсімі чатырма лапамі. А сам пасміхаўся: гэта ж трэба — камедыю нейкую дарослыя разыгрываюць!

— Дык што тут у вас нарабілася, пытаю? — звярнуўся дзядзька Міця да дружынніка.

І той расказаў — што. Усю сям'ю Гардзееў з Клінцоў ізалявалі, завезлі ў бальніцу. З Бярозаўкі — Алега Максімавіча, настаўніка. Але па ўсім відаць, што гэтым не абыдзецца. Эпідэмія — не жартачкі, а тым больш — паражэнне галаўнога мозга.

Ваня памкнуўся да дружынніка распытаць пра сваіх больш (гэта ж трэба — такога нарабілася тут!), як міліцыянер спытаў у Вані, быццам стрэліў:

— Прозвішча?

— Гардзе-ей... — працягнуў здзіўлена Ваня.

— Іван Аляксеевіч? — удакладніў міліцыянер.

— Ну-у.

— Не нукай, не запрог. Загадана цябе затрымаць... Таварыш старшы лейтэнант! — сказаў міліцыянер у каробачку-рацыю, паднёсшы яе да губ. — Уцякач сам з'явіўся, толькі што затрымаў яго перад уездам у вёску... Апошні з Гардзееў... Так... Так... Слухаю! Ёсць даставіць у кантору калгаса! — і міліцыянер замахаў рукамі: — Вы — пераганяйце машыну цераз падушку, вы — загружайцеся назад у кузаў, а вы — заставайцеся на пасту! — паказаў на месца, дзе павінен стаяць дружыннік. — Але вас таксама зменім, ізалюем — вы здароўкаліся за руку з шафёрам. А шафёр меў кантакт з Гардзеем...

Дзелавіты быў міліцыянер!

Чамусьці ўжо не садзіліся, а ўсе стаялі ў кузаве, трымаючыся за барты, дарослыя — крыху прыгнуўшыся.

— Ну, бачыш цяпер, чаго нарабілася? Праз цябе, праз тваіх любімых Эрпідаў, — прашаптаў з папрокам дзядзька Мікалай.

— Я ні ў чым не вінаваты! І гэта не хвароба, не эпідэмія! — загарачыўся Ваня. Не ведаў ён, з чаго пачаць, пра што самае важнае перш за ўсё расказаць. — Гэта ўсё Эрпід нарабіў, але ён нікога не заражаў эпідэміяй... Таварыш міліцыянер! — Ваня падаўся да яго, выставіўшы рукі. Але міліцыянер паспешліва адступіў бліжэй да кабіны.

— Толькі без рук! — выкрыкнуў ён палахліва. — Наогул супакойся, у нас добрыя ўрачы, яны і цябе вылечаць, і ўсю тваю сям'ю.

— Дык вы нічога не зразумелі! Я ўсё раскажу... Вінаваты касмічны робат, не ў свае справы

ўмешваўся... Ану, уставай, лежабока! — паскідаў з Эрпідаў салому. — Дзядзька Мікалай, памажыце падняць на ногі, на гусеніцы!
Дзядзька адцясніў Ваню ўбок, падняў серабрыстага сам.
— Эрпід, гавары, што ты натварыў?! І адрабляй адразу ўсё назад! — калыхнуў Ваня Эрпіда-адзін за плячук. — Пакуль не адробіш, на карабель я цябе не пушчу... Магу ўзяць малаток ці камень і струшчыць цябе на металалом!
— Іван Аляксеевіч Гардзей... Заданне ўведзена ў мяне недакладна. Што канкрэтна трэба адрабляць назад? Вельмі ж многа я чаго запісаў... — спакойны, раўнамерны голас серабрыстага злаваў Ваню. Кожная хвіліна дарагая, а ён разводзіць цырымоніі!
Міліцыянер прысеў на кукішкі перад Эрпідам і не зводзіў з яго здзіўленых вачэй.
— Што адрабляць? З Алегам Максімавічам што натварыў? А з татам, мамаю, Лёнем, з дзедам Гардзеем?!
— Гэта былі жартачкі... Так на вашай мове называецца?
— Добрыя жартачкі! — выгукнуў Ваня, хоць сам не вельмі ведаў, што тут адбылося.
— Добрыя жартачкі, — паўтарыў і міліцыянер. — Людзі павар'яцелі, а яму жартачкі!
— Яны не павар'яцелі, яны ўсе нармальныя, — сказаў серабрысты. — Я толькі трошкі паўплываў на іх. Вызваліў мозг ад грузу ўмоўнасцей, ад непрыемных клопатаў. Дазволіў людзям рабіць тое, што вельмі хочацца, выконваць свае запаветныя жаданні. Выявіць сваю сапраўдную натуру!
— Го, каб так было! — зазначыў міліцыянер. — Усялякія злачынцы і прахадзімцы распаясаліся б...
Дзядзька Мікалай неяк дзіўна ўсміхнуўся.
— Але і многа добрага было б... Людзі працавалі б толькі на любімай рабоце, з ахвотаю. Было б адразу відаць, хто на што здольны... Хто які талент мае... Гэта — з аднаго боку. А з другога? Што было б, каб людзі ведалі толькі слова «хачу» і не ведалі «трэба»? Калі трэба для ўсіх людзей, для краіны, то можна і забыць пра «хачу». Вось у чым уся штука!
— Ой, не гаварыце многа, а то час ідзе! — захваляваўся не на жарты Ваня. — Адрабляй хутчэй усё назад! — зноў патрос ён серабрыстага за плячо.
— Ужо, — коратка кінуў Эрпід.
— Што — ужо? — нерваваўся Ваня.
— Адрабіў. Нікога не трэба лячыць. Усе здаровыя, галовы не баляць, хваробы няма. Усе нармальныя ў вашым сэнсе, зямным. Адпраўляйце ўсіх дадому. Эпідэміі няма. На гэтыя жартачкі з карабля мне не давалі дазволу. Гэта я сам... І больш не буду... — здалося нават, што Эрпід шморгнуў носам, як вінаваты хлапчук.
Грузавік якраз спыніўся каля канторы калгаса. З буды відаць было, што каля ганка з аднаго боку стаіць міліцэйская машына з доўгаю антэнаю-штыром, а з другога — машына «хуткай дапамогі» амаль з такою ж антэнаю.
Здымалі Эрпідаў на зямлю, а ў серабрыстага ўжо мігалі лямпачкі, паварушваліся антэны. Выходзіў, мабыць, на сувязь з караблём.
З канторы павысыпаліся ўсе, хто там быў: паглядзець на Ваню, на робацікаў, паслухаць, як яны лапочуць па-нашаму.
— А ты заходзь у мой кабінет, — сказаў Ваню старшыня калгаса Трафім Іванавіч. — З табою хочуць пагаварыць... І вы заходзьце, — паказаў ён на дзядзьку Мікалая і дзядзьку Міцю.
— Зараз, адну хвілiначку! Эрпід павінен нешта сказаць, — папрасіўся Ваня.
Але Эрпід усё яшчэ міргаў і маўчаў, а потым і ў жоўтага была бліснула лямпачка. Тым часам натоўп на вуліцы рос і рос. Сыходзіліся дарослыя, забыўшы пра ўсе справы, збягаліся дзеці, чутка пра Эрпідаў разнеслася па Бярозаўцы з хуткасцю маланкі.
— Старт у дваццаць гадзін нуль адна хвіліна дзесяць секунд роўна, — сказаў урэшце серабрысты. — Да адключэння ад знешніх раздражняльнікаў засталося сорак хвілін і трыццаць секунд. З вашага дазволу, я запішу гэтых людзей.
Ваня хуценька зірнуў на старшыню, ці не будзе ён пярэчыць, і махнуў рукою: «Давай!»
Цёткі, што стаялі паўкругам вакол Эрпідаў, пачалі прыхарошвацца, папраўляць на галовах хусткі, а малым выціраць насы і падцягваць штонікі. Быццам гэта прыехаў фатограф з раённага камбіната бытавых паслуг рабіць здымкі.
У кабінеце старшыні каля акна сядзела загадчыца санэпідстанцыі, а за сталом — чарнявы, як цыган, старшы лейтэнант міліцыі з тэлефоннай трубкай у руках.
— Па парадку, коратка і галоўнае, астатняе потым, — сказаў ён Ваню.
— Ага, я коратка, — сказаў Ваня. — А то праз сорак хвілін Эрпіды адключаюцца...

Пачаў з метэарыта: як знайшоў у лесе дзіўны камень, як нейкая сіла цягнула да яго, вяла якраз у тым кірунку. Як той камень нечакана лопнуў і з палавінак шкарлупіны паўстаў Эрпід-адзін. Як паехалі шукаць Эрпіда-два, бо той не выходзіў на сувязь, і як сустрэлі Таньку з Эрпідам-два... Падумаць толькі: вадзіла яго, як сабачку, на павадку! Як потым адшукалі мядзведзя, угаварылі яго вярнуцца ў звярынец... Як сумелі ўцячы ад сталічнай міліцыі...

Старшы лейтэнант умеў рабіць некалькі спраў адразу. Ён і слухаў Ваню, увесь час падтакваў і ў той жа час набіраў нумары на тэлефоне і камусьці гаварыў: «Адбой... Адбой!» Нават з двара выклікаў міліцыянера з машыны і яму загадаў перадаць па рацыі, каму трэба: «Адбой!» Потым і ў бальніцу званіў, каб усіх так званых хворых з Бярозаўкі і Клінцоў выпісалі і, не марудзячы ні хвіліны, даставілі ў кантору калгаса. Праўда, загадчыца санэпідстанцыі спрабавала запярэчыць: «Яшчэ ж нічога дакладна невядома! Яшчэ ж не абследавалі іх, не ўзялі ўсе аналізы! А раптам хтосьці з іх сапраўды хворы?» На гэта таварыш старшы лейтэнант сказаў: «Правільна, сярод насельніцтва трэба праводзіць прафілактычную работу, усякае абследаванне. У звычайным парадку, а з сірэнамі не лётайце, не нервуйце людзей».

І быў яшчэ тэлефонны званок у кабінет старшыні — ці з райцэнтра, ці з самога Менска. Старшы лейтэнант спачатку слухаў моўчкі, а потым сёе-тое перапытваў і нават пачаў усміхацца:

— Ну-у?! Накіравала міліцыю зусім у іншы бок? Ну і Танька... Карацей, ну і ну... Ага, яны самі вярнуліся. Толькі што... Каля мяне ён, у кабінеце старшыні, — лейтэнант коратка зірнуў на Ваню, і яму давялося апусціць вочы. — Расказвае пра свае прыгоды... і пра гэтага, з неба што спусціўся. Два спусціліся, абодва тут! Нічога асаблівага яны не натварылі, трывогу біць не трэба... Нос абы-куды не совалі, не! Так што і ў вас аб'яўляйце адбой, таварыш маёр. Ага, разбяромся самі, не трэба ніякай камісіі ствараць. Эпідэмія? Няма ніякай эпідэміі, проста непаразуменне было... Акадэмія навук зацікавілася? Позна, праз паўгадзіны ў іх адлёт. Ага, і вам усяго добрага!

І паклаў трубку старшы лейтэнант, адкінуўся на спінку крэсла. Надзьмуў шчокі, як хлапчук, і шумна выдыхнуў паветра. Паклаў рукі на стол, пайграў пальцамі, як па клавішах піяніна. І ўсе ўлавілі, што ён выстуквае матыў: «Мы рождены, чтоб сказку сделать былью...» А вочы ў яго былі вясёлыя, твар свяціўся ад палёгкі.

— Вам смешачкі? — не ўтрывала, узнялася са свайго месца загадчыца санэпідстанцыі. — А я павінна ізаляваць гэтых вашых пудзілаў агародных! Трэба праверыць, мо яны даставілі на сабе якіх заразных мікробаў. У іх, скажам, тыя мікробы нічога шкоднага не робяць, а ў нас, у новых для іх умовах, пачнуць катастрафічна размнажацца. Выбух, успышка інфекцыі!

— А як цяпер адрозніш, іхнія гэта мікробы ці нашыя? На лбе ж у іх не напісана! Ха-ха... — на ўсякі выпадак рагатнуў старшыня калгаса.

— Мы разбяромся! — храбрылася цётка ў белым.

— А хіба вы не чыталі, паважаная таварышка, што ўсе нашы касмічныя апараты і вымпелы, якія закідваюцца на іншыя планеты, праходзяць усякую стэрылізацыю і дэзінфекцыю? Каб не занесці, значыць, нічога такога туды... — зусім сур'ёзна сказаў старшы лейтэнант. — То няўжо ж можна дапусціць, што іншапланецяне дурнейшыя за нас і не зрабілі таго ж самага? Калі змаглі прыляцець да нас з іншай планетнай сістэмы, не з Сонечнай, то такую дробязь, як стэрыльнасць, яны прадугледзелі.

Потым старшы лейтэнант задаў некалькі пытанняў дзядзьку Мікалаю і шафёру дзядзьку Міцю, якія дагэтуль моўчкі, з шапкамі ў руках, тапталіся каля дзвярэй. І дазволіў ім ісці.

— Усё, таварышы! Пойдзем да робатаў! — устаў ён з-за стала.

— Як усё?! — абурыўся Трафім Іванавіч. — Праз іх такая заварушка ў калгасе пачалася, а я павінен маўчаць? Ды я ім такое скажу, такое... — старшыня нават кулаком патрос.

— Во-во, трэба сказаць! І вы абавязкова скажыце! — згадзіўся старшы лейтэнант.

## 20

Вуліца сустрэла Ваню выбухам рогату. Эрпідаў не было відаць, вакол іх шчыльна стаяў натоўп. Але неяк людзі расступіліся, і з вышыні ганка Ваня заўважыў, што дзеці водзяць серабрыстага за ручкі, як малога хлапчука.

— Эрпід, скажы: Піліп да ліпы прыліп! — прарэзліва крычаў хлапчукоўскі голас, каб перамагчы смех і гаману. І стала ціха...

— Пілі б, далі б прыліп, — адказаў Эрпід-адзін і адразу пацікавіўся: — А што гэта за пітво «прыліп»?

Людзі так і пакаціліся ад смеху.

— Няхай скажа: ішоў кныр з кныранятамі! Пра кныра хай скажа! — падскоквала за спінамі дарослых цыбатая дзяўчынка, нечым падобная на Таню.

Але Эрпід маўчаў, бо на яго з усіх бакоў пасыпаліся іншыя просьбы і пытанні:
— Скажы на вашай мове што-небудзь!
— А ў вас таксама школы ёсць?
— У вашых людзей такія самыя органы, як у нас?
— Скажы, як вам наша Зямля спадабалася?
Ваня рашуча пралез у сярэдзіну натоўпу:
— Ціха, калі ласка! Усім — ціха-а!!! У Эрпідаў засталося зусім мала часу! Трафім Іванавіч хоча прамову сказаць ім на дарогу! Каб запісалі!
Людзі пачалі сцішвацца і расступацца, утварыўся праход да самага ганка. І ў цішыні пачуўся голас Эрпіда-адзін:
— Іван Аляксеевіч Гардзей! Да адключэння засталося восем хвілін сорак сем секунд... І я таксама хачу сказаць на развітанне пра мову. Ваша мова нам вельмі спадабалася... Я стаў намнога лепш гаварыць на вашай мове, хоць у мяне ў галаве няма ні шарыкаў, ні ролікаў, няма і клёпак... (па натоўпе пракаціўся лёгкі смех)... Ваша Зямля таксама нам спадабалася. Мы наматалі сабе на нос, зарубілі сябе па лбе і цяпер ужо добра ведаем: не трэба ў проса соваць нос, есці тры пуды бярозавай кашы, каб трымаць за пазухай не камень, а яечка ды яшчэ аблупленае (смех ужо прарываўся выбухамі, але ўсе цішылі адзін аднаго, заціскалі сабе раты, каб пачуць усё)... Трэба больш чухаць патыліцы і не вадзіць адзін аднаго за нос вакол пальца, таўчы ў ступе чыстую ваду, а не гарох з капустаю. Усе мухі ў носе трэба рассыпаць драбней маку... (выбух рогату)... Я ведаю, што вы народ вясёлы і часта крычыце «ха-ха-ха!», як казаў мой знаёмы мядзведзь Мішка... Можа, я чаго недачуў, не зразумеў на Зямлі, то выбачайце: мядзведзь па вушах пахадзіў. Я яшчэ не састарэў да канца, калі прышлюць зноў да вас, то буду ўсё знаць, як аўца... Да пабачэння! Я набраў у рот вады...
— Трафім Іванавіч! Ён скончыў, хутчэй гаварыце! — сказаў Ваня.
— Пяць хвілін і чатыры секунды засталося, — бясстрасна зазначыў серабрысты. — Сачыце за зялёнай лямпачкай. Патухне — я адключыўся. Адыходзьце ўсе на дзесяць метраў.
— Дык вось, таварышы, — пачаў урэшце Трафім Іванавіч. — І вы, каторых прыслалі да нас... Запісвайце, што буду казаць. Гэта добра, што нашу мову вывучаеце... Запомніце яшчэ дзве нашы народныя прымаўкі: як гукнеш, так і адгукнецца, і другую: не капай яму другому, бо сам у яе ўпадзеш... За тое, што вы тут нам нарабілі анархіі і на людзей пачалі ўздзейнічаць па-ўсякаму, мы маглі б вас затрымаць. Але ж вы робаты, вы нежывыя. Вы рабілі толькі тое, што ўклалі вам у электроніку тыя... — Трафім Іванавіч падняў указальны палец угору і шматзначна памаўчаў. — Але мы пускаем вас сёння свабодна: ляціце, далажыце сваім людзям, што і як тут робіцца, як сустрэлі вас. Трэба ж, каб нехта вашым такое сказаў... А па ўсім відаць, што вашы людзі галавастыя. Толькі хацелася б, каб мазгі ў іх былі не набакір. Яны даказалі, што могуць на адлегласці ўплываць на мазгі нашых людзей. Дык добра ж, калі ў добры бок, а калі ў кепскі? Можа, вам увогуле захочацца падпарадкаваць нас сабе і кіраваць намі, як рабамі? Дык от, я рашуча вам заяўляю... І кожны, хто тут стаіць, скажа вам тое ж самае: на такія кантакты з вамі мы не пойдзем. Не трэба нам такія кантакты! Тысячы гадоў жылі людзі без вас, і яшчэ пражывуць мільёны. Толькі не замінайце нам, не шкодзьце! Калі ж пріляціце да нас з такімі намерамі, то арбіта каляземная вас не ўратуе, мы знойдзем, чым вас адтуль спароць... У нас яшчэ і такую прымаўку гавораць, запішыце таксама: хто да нас прыйдзе з мячом, ад мяча і загіне... Перадайце сваім галавасцікам, што мы не хочам такіх канфліктаў... Па многіх...
— Трафім Іванавіч! Патухла зялёная лямпачка! Адключыўся! — пракрычаў Ваня.
— Хай тухне. А я ўсё роўна дакажу да канца. Дык от: па многіх пытаннях мы маглі б мець кантакт з іншапланецянамі. Толькі не па ваенных. Мы людзі мірныя і хочам жыць у міры з усімі. Так і скажыце там... Вось так... І на гэтым усё, можаце ляцець.
Старшыня калгаса цярнуў далонню па лбе і пачаў адступаць да ганка. І ўсе людзі пачалі расступацца ў бакі.
— Іван Аляксеевіч! — паважліва крыкнуў да Вані нейкі сухенькі дзядок. — Мо хопіць адступаць? Мо не зашкодзіць ужо?
— На дзесяць метраў, не менш! — пракрычаў Ваня ў адзін бок, у другі. Быццам сам штосьці ведаў пра гэта ці прысутнічаў калі пры старце Эрпідаў. — Дзядзька Мікалай і дзядзька Міця! Пастаўце, калі ласка, Эрпідаў якраз пасярод вуліцы.
Ваневы знаёмыя дзядзькі выйшлі з натоўпу і трошкі пераставілі Эрпідаў. І хуценька адхапілі рукі.
— Ого! А яны ўжо гарачыя!
— Таварышы! — крыкнуў старшы лейтэнант міліцыі. — Мы не ведаем, на чым працуюць яны, на якой энергіі. Мо атамная, і яны пускаюць шкоднае выпраменьванне! Просьба ўвогуле разысціся па

дамах!
Але мала хто зварухнуўся на такі страх, быццам раздумвалі.
Аддаў распараджэнне і Трафім Іванавіч:
— Усе, хто паблізу жыве! Падрыхтуйце вёдры з вадою, з пяском! Невядома, якая тут падымецца тэмпература, каб пажару не нарабілася... Шафёры! Адганіце машыны чым найдалей! А то могуць паўзрывацца бензабакі!
Гэта было больш зразумела. Адразу ўсчалася мітусня, пакуль людзі рабілі тое, што гаварылі старшыня і старшы лейтэнант. Адышлі ад Эрпідаў яшчэ далей, некаторыя прыхаваліся ад магчымага выпраменьвання. Але як? Смех проста: хто за вароты, хто за плот. І цікавалі адтуль, сачылі за Эрпідамі. А тыя стаялі пасярод вуліцы нязрушна, адлегласць паміж імі была не больш за паўтара метра. Ніхто не ведаў, як іх ставіць, пра гэта серабрысты нічога перад адключэннем не гаварыў.
Пэнк! — у Эрпіда-адзін адляцелі ў бакі ручкі і ножкі.
Пэнк! — пападалі ў пясок і пыл рукі і ногі другога Эрпіда.
— Ах! — спуджана ўскрыкнула нейкая цётка.
А другая залямантавала на ўсю вуліцу:
— Ба-абы-ы-ы! Каровы ідуць! Не пускайце сюды кароў, а то яшчэ ў малако прамяні тыя самыя ўскочаць! Або бабахне, на мэтлахі кароў паразрывае.
— Што рабіць, Іван Аляксеевіч? — закрычалі да Вані жанчыны, быццам ён быў тут галоўны кансультант па эрпідна-касмічных справах.
— Таварышы! Не трэба панікаваць! Пра атамную энергію мне Эрпід нічога не гаварыў. Я ўвесь час быў з ім і я сябе добра адчуваю! Каб было такое выпраменьванне, то ён бы не клікаў мяне да сябе! А каровы няхай ідуць... Глядзіце толькі, каб не перакулілі Эрпідаў! Да старту яшчэ шмат часу!
Сказаў «глядзіце», а сам першы кінуўся на абарону Эрпідаў. Стаў спінаю да іх, тварам да кароў, расставіў рукі ў бакі. А тыя падыходзілі і праходзілі міма спаважна, ім начхаць было на ўсе касмічныя справы. Яны былі каровы, ім трэба было несці людзям малако. Некаторыя з кароў запытальна рыкалі, не пазнаючы свайго двара: надта ж многа тоўпілася там людзей.
Калі каровы разбрыліся па дварах, Ваня аглянуўся на Эрпідаў — а антэн у іх ужо і няма! Толькі малюсенькія бугрынкі-мецінкі на галовах. Мо скінулі, як алені рогі скідваюць ці як самі толькі што паадкідвалі рукі і ногі? Не... Нічога падобнага на антэны не валялася. Уцягнулі іх унутр, няйначай.
«Ой, гараць, мабыць!» — «Не, гэта пара пайшла!» — «Глядзіце, чырванець пачалі!» — закрычалі адразу некалькі галасоў. Хто дасюль не схаваўся за вароты, то захацеў гэта зрабіць зараз. Адзін Ваня стаяў бліжэй за ўсіх да Эрпідаў, ён і сам не ведаў — чаму. Ці прыбавілася ў яго храбрасці (мо серабрысты напаследак гэтак уздзейнічаў на яго?), ці быў так упэўнены, што нічога страшнага з ім не здарыцца?
Чырванець пачалі Эрпіды адразу ў некалькіх месцах: там, дзе злучалася галава з тулавам, па лініі шыі, і ў розных месцах тулава і галавы — плямамі. Цэнтры чырвоных плям усё больш яснелі, ірдзелі, распаляліся, сталі зыркія, як іскры. І раптам з цэнтраў тых плям засвісталі, закучаравіліся струменьчыкі пары ці дыму. А ўслед пачалося і самае сапраўднае вывяржэнне, нібы адкрыліся невідочныя дасюль жаролы вулканчыкаў. Бурліва, з пенай-шумам, з бурбалкамі, пачало выплываць штосьці падобнае на лаву. Вогненна-вадкая, але і трохі вязкая маса распаўзалася падцёкамі па галовах, па тулавах. Падцёкі большалі, злучаліся, на месцах злучэнняў успучваліся рубцы-валікі, але потым згладжваліся, а бурбалкі лопаліся. Вогненныя панцыры Эрпідаў увачавідкі выроўніваліся, і ўжо не робаты стаялі пасярод вуліцы, а нейкія агніста-чырвоныя «агуркі».
І пакуль чырвань не блякла, вяршэчкі гэтых «агуркоў» выцягваліся, танчэлі, завастраліся, нібы нябачная рука ганчара надавала ім такую форму. І ўрэшце ўсе ўбачылі: не Эрпіды стаяць пасярод вуліцы, а самыя сапраўдныя ракеты, нават невялічкія закрылкі-стабілізатары ёсць. Зыркасць ракет пачала згасаць, яны зрабіліся густа-чырвоныя, потым вішнёвыя і цёмна-вішнёвыя. Урэшце зусім пацямнелі. Толькі сяды-тады па іх баках прабягалі іскры, успыхвалі зеленавата-фасфарычныя палоскі. Урэшце і яны патухлі.
І нейкае расчараванне-ўздых, нібы парыў ветру, прабегла па натоўпе. Чакалі, што дзівосы будуць працягвацца няспынна — і раптам звычайныя, толькі маленькага памеру ракеты. А хіба ж ракеты дзіва? Іх кожны бачыў або на парадзе, або ў тэлевізары, прытым — усякіх памераў.
Увага людзей рассейвалася, напружанне спадала. Сям-там напаўголаса пачаліся перагаворы...
І раптам гамана выбухнула з новаю сілаю. Убачылі, што з гравійкі-гасцінца звярнула ў вуліцу і прыпусцілася сюды, у бок канторы, машына-«рафік» — «хуткая дапамога». З брэхам ляцелі навыперадкі з машынаю два сабакі — Ванеў Жучок і яшчэ нейчы пярэсты.
Старшыня калгаса сышоў з ганка, ступіў насустрач і закруціў праваю рукою ў паветры так, нібы

паказваў шафёру, куды падруліць, і падняў урэшце руку — «Стоп!» Першымі пабеглі да машыны Ваня, Трафім Іванавіч, загадчыца санэпідстанцыі і старшы лейтэнант. З кабіны «рафіка» скокнула на дол жанчына ў такім жа белым халаце, як і загадчыца, «халаты» сышліся і пра штосьці хутка-хутка загаварылі, размахваючы рукамі. А з другіх дзверцаў скокнуў на дол Лёня не Лёня, а нейкі бледны юнак, палавіна чупрыны ў яго была зусім белая. Ваня ўсё-такі пазнаў яго і адразу павіс на шыі, задрыгаў падкурчанымі нагамі. А старшыня калгаса абдымаўся ўжо з Ваневым бацькам — Аляксеем Гардзеевічам. Трактарыста перадавалі з рук у рукі, ціскалі, штурхалі ў плечукі, ляпалі па спіне. Потым паволі з машыны вылезла мама, і Ваня адразу ўткнуўся ёй тварам у грудзі і заплакаў.

— Ціха, дурненькі, ціха! — супакойвала Ганна Макараўна. — Усё ж добра скончылася!

А Ваня і сам не ведаў, што з ім зрабілася: мабыць, нервы, якія былі ўвесь час напружаныя, не вытрывалі. Потым выйшаў Алег Максімавіч, але адразу павярнуўся тварам да дзверцаў, падаў некаму руку. Не некаму! Дзеду Гардзею падаў, Двайному Гардзею. І пасталі спінамі да машыны... Настаўнік усміхаўся стрымана, усім падаваў руку, хто падыходзіў, нават Ваню — як даросламу. І дзед Гардзей здароўкаўся з людзьмі і збянтэжана не то ўсміхаўся, не то плакаў — часта змахваў слёзы з вачэй. Ваня па чарзе абняў бацьку, абняў дзеда. А Жучок блытаўся пад нагамі і падскокваў, каб лізнуць сваіх у рукі.

— Ой, пачынаецца! — пачуўся чыйсьці спалоханы голас. І ўсе мігам зноў расступіліся, разбегліся, утвараючы шырачэзнае кола, адцягваючы з сабою і тых, хто прыехаў на «хуткай дапамозе».

— Лёня! Гэта яны вінаваты ва ўсім! Касмічныя робаты! Я раскажу, якія яны былі... Я такога табе раскажу! Во гэты, што бліжэй да нас, быў Эрпідам-адзін! Тата! Дзед! Мама! Яны адлятаюць ужо, і ўсё чыста адрабілі назад! — узбуджана шаптаў Ваня, патузваючы то бацьку, то маці, то дзеда за рукі.

А з-пад ракет ужо добра валілі газы і дым. Потым пад першаю заракатала-чмыхнула так, што спадыспаду веерам паляцелі агонь, пыл, дым, узвілося апалае лісце. Ж-ж-ж-жах!!! — узляцеў першы Эрпід. Ж-ж-ж-жах!!! — узляцеў другі.

Пакуль, адвярнуўшыся, праціралі вочы, Эрпіды былі ўжо высока — нібы хто ўздымаў на неба два вялізныя бенгальскія агні...

Дзеці кінуліся ў цэнтр круга, дзе стаялі Эрпіды. Кожны хацеў першы схапіць сувенір — руку ці нагу Эрпіда. Але ўбачылі там і нешта больш груваскае: дзве пары закураных, аплаўленых гусеніц, нібы дзве пары галошаў, забытых каля касмічнага парога.

— Ану, нічога не браць! Гэта ўсё ў школьны музей пойдзе! — закрычаў Ваня.

— Правільна! — падтрымаў яго Алег Максімавіч і пайшоў сам да «сувеніраў».

## 21

У Клінцы ўсіх Гардзееў і сабаку Жучка вёз на «газіку» сам старшыня калгаса. І ўсю дарогу толькі і размоў было, што пра Эрпідаў ды пра тое, чаго нарабілася праз іх. Дзед Гардзей сказаў, што знайшоў урэшце астанкі партызан, якіх наспех пахавалі ў час блакады. І Трафім Іванавіч паабяцаў: у самыя бліжэйшыя дні дасць людзей і транспарт, каб зрабіць перазахаванне партызан у брацкую магілу каля сельсавета. А да чарговай гадавіны Перамогі будзе ўстаноўлены на магіле новы, лепшы помнік.

Ваня сказаў і пра Эрпіда-тры, які дзесьці плавае ў акіяне, вывучае, што робіцца пад вадою. Пагадалі, ці выплыў ён і падняўся на карабель, як і Эрпіды першы і другі, ці ўсё яшчэ плавае. У Ваневай галаве круцілася: «Усё чыста адрабіў назад... Усё чыста адрабіў...» І бачыў ён, што не ўсё чыста адроблена: Лёня ж так і застаўся сівы, як дзед. Трафім Іванавіч нібы ўлавіў Ваневы думкі, бо спытаў у Лёні:

— Дык што, — кажуць, ты здорава шпрэхаў на ўсякіх замежных мовах? А як цяпер? А то казалі, што ніякай карысці для зямлян не меў іх візіт... Як будзе па-французску «Да пабачэння»?

— Арэвуар, — сказаў Лёня, пасміхнуўшыся адным бокам. А раней ён ніколі так не ўсміхаўся! — А яшчэ «мерсі» запомніў і «бонжур»... Тое, што і да Эрпідаў ведаў, і ні слова больш.

— Ха-ха... А па-кітайску ці па-японску што-небудзь можаш? — цікавіўся старшыня.

— Ні бум-бум.

— Вось табе і карысць ад іх візіту. Адна шкода... — уздыхнуў старшыня.

— Чаму? Я хоць выспаўся раз добра за ўсю вясну, лета і восень, — без усмешкі сказаў Аляксей Гардзеевіч.

— А я ўсіх даярак блінцамі накарміла, — усміхнулася Ганна Макараўна.

— Скажыце, а з вамі ў бальніцы не было Пеці Галабродзькі? — спытаў Ваня тое, што ўвесь час нeяк трывожыла яго.

— Не, не было, — адказала мама.

— Не было, — пацвердзіў тата.

— Мяне самага апошняга схапілі, завезлі. Аднаго, без Пеці, — сказаў дзед.

— І-і-і-іх... — спуджана працягнуў Ваня. — Трафім Іванавіч, хутчэй да Галабродзькаў газуйце! Мы як былі ў лесе з Эрпідам, дык ён намякнуў, што і Пецю галаву замарочыў, каб нам не перашкодзіў. То ці адрабіў хоць назад?

Праляцелі па вуліцы Клінцоў хутка, праскочылі міма хаты Гардзеяў і спыніліся каля двара Галабродзькаў. А ў іх і плот ад вуліцы, і вароты высокія і шчыльныя — нічога не ўбачыш, што на двары робіцца.

А калі адчынілі варотцы, то ўбачылі: па ўсім двары на мяшках, на посцілках, на дошках, на дровах, на лаўцы пад плотам, на перакуленым цэбры ляжаць запчасткі да легкавой машыны. А мо проста часткі? Бо ад іх «Масквіча» засталася толькі нейкая частка кузава, колы і тыя былі пад плотам.

Паміж раскладзенымі жалязякамі расхаджваў голы па пояс Галабродзька-старэйшы і ўспамінаў усіх чарцей. Сам ужо ўвесь у мазуце.

— Што гэта ты нараскладваў, як на прасушку ці на базары? Ха-ха... — пацікавіўся старшыня.

— Капітальны рамонт? — спытаў і Аляксей Гардзеевіч.

— Які рамонт?! Гэта ж мой абармот натварыў... Прыходжу з работы, а ён з ног валіцца ад стомы, хваліцца: «Татка, зірні, колькі я знайшоў запчастак!» Разумееш — знайшоў сякеру пад лаўкаю... Свайго «Масквіча»... Свайго! Спраўнага!.. Разабраў на запчасткі!

— Усё адзін зрабіў? — падзівіліся мама, тата і дзед.

— А дзе зараз Пеця? — спытаў Ваня.

— У хату занёс, паклаў. Спіць, як непрытомны, — адказаў Пецеў бацька. — І во, ад нейкага старога «ЗІЛа» рваную пакрышку прыкаціў. Мо падарваўся, дурань... Не ведаю, што і падумаць... І ў каго ён удаўся такі сквалыга? Вунь нейкія начовачкі з лесу прыцягнуў. Па выгляду нібы з расплаўленага каменю, а лёгкія. Думаю пад карыта парсюку прыстасаваць, не згніе ніколі. А от нашто пакрышка старая, хлам гэты?

— Няўжо сам разабраў? — паўтарыў тое, што цікавіла ўсіх, і старшыня калгаса. І ён, і дзед, і мама, і тата хадзілі паміж раскладзенымі дэталямі ды толькі плячыма паціскалі. Ліха ведае, колькі трэба прыкласці высілкаў, каб усё разабраць, расцягнуць, раскласці.

Жучок панюхаў кола каля плота і задраў на яго нагу.

— Не ведаю... Мо якая нячыстая сіла памагала, — разводзіў рукамі Галабродзька-старэйшы.

— Калі ніхто не памагаў, то падарваўся хлопец, няйнакш, — сказала Ганна Макараўна.

Аляксей Гардзеевіч рашуча скінуў пінжак, закасаў рукавы рубашкі.

— Давай памагу, бо зазімуеш... Лямпа ёсць вынасная? На ўсю ноч работы хопіць.

Маці паклікала Ваню, Лёню і дзеда з сабою і пайшла на вуліцу. Дома чакала свая недагледжаная гаспадарка.

Ваня з Жучком выходзіў апошні: варотцы за ім са скрыпам зачыніліся. І хіба мо пачуў гэты скрып Галабродзькавых певень, палічыў за кукарэканне якога маладога няўмекі. І закрычаў сам — прарэзліва і хрыпла, нібы перакрыўляў усіх пеўняў на свеце. Крычаў і нікога не баяўся: на сваім сметніку і ён быў гаспадар.

Ішоў Ваня і думаў: ці адрабіў тое, што натварыў з Пецем, Эрпід-адзін? Ці паспеў? Гадай цяпер, ці заўсёды Пеця быў урвіцелем, ці гэта робат зрабіў яго такім — заразіў нейкім хапужным вірусам?

Калі Эрпід-адзін наслаў на яго такую хваробу, то ці заразная яна? Ці пачне перакідвацца на іншых дзяцей і дарослых?

З такою хваробаю трэба змагацца. Але як?

Тут і канец прыйшоў нашай праўдзівай аповесці. Толькі хочацца сказаць яшчэ вось пра што. Калі і вы надумаеце заехаць у Бярозаўскую школу, пацікавіцеся іх незвычайным музеем, то не пытайце ў юных экскурсаводаў, дзе падзеліся яшчэ адна пара рук і ног робатаў і другая пара гусеніц. Многа бывае ў музеі наведвальнікаў, розных дэлегацый, нават з замежных краін. І язык ужо забалеў у тых юных экскурсаводаў тлумачыць кожнаму, дзе падзеліся тыя касмічныя дэталі.

Дык вось, я і паведамляю тут — усім! усім! Забралі тыя «запчасткі» Эрпідаў вучоныя са сталічнага навукова-даследчага інстытута. Нават Галабродзькаву палавінку панцыра выкупілі і забралі з сабою. Вучоныя і ёсць вучоныя, будуць даследаваць тыя касмічныя «дэталі» і чухаць патыліцы, разгадваць, з чаго зроблены, ці ёсць на Зямлі такія хімічныя элементы. А тая палавінка, што ляжыць у цэнтральнай вітрыне злева, без подпісу, — Ванева, Ваня Гардзей прынёс яе з лесу. І не захацеў, каб падпісвалі, чый гэта дарунак.